# Свечка на дажджы



Аляксандр Вашчанка

Аляксандр Вашчанка

# СВЕЧКА НА ДАЖДЖЫ

Кніга прозы

Мінск
2003

**Вашчанка А.**

Свечка на дажджы. Кніга прозы / А. Вашчанка. — 2002 . с 164.

Аўтар гэтай кнігі сцвярджае: усяму жывому на зямлі наканавна жыць разам, і калі гармонія гэтых адносін парушаецца, свечка жыцця пачынае трымцець і хістацца.

Толькі ў гармоніі з Прыродай, Богам і сваёй душой магчыма існаванне найвялікшага цуда сусвету — Чалавека.

© Вашчанка А.., 2003



*Запаліць свечку дабрыні й спагады ў людскіх сэрцах, наталіць іх смагу глытком гаючай роднай мовы, прыгадаць ім пяшчоту матулінай калыханкі й свіргат аканіц бацькоўскае хаты, быць творцам у любой справе – у гэтым бачу сэнс свайго існавання на шматпакутнай зямлі маёй Беларусі.*

*А. Вашчанка*



# МАРТЫН І ТЭРА

Па нейкіх няўлоўных прыкметах Мартын адчуў набліжэнне Радзімы. Ён быў буслом-трохгодкам і не ведаў высокага сэнсу гэтага слова. Для яго Радзімай было гняздо, у якім ён з'явіўся на Божы свет, пазнаў сваіх бацьку і маці.

Блакітнае, з хмурынкамі аблокаў неба — таксама Радзіма.

Паветра, якое даверліва падтрымала, калі ён, заплюшчыўшы вочы ад страху, расправіў крылы й зрабіў з буслянкі свой першы крок у бездань, а калі адкрыў іх і зразумеў, што ляціць, яго ахапіла такое невыказнае пачуццё шчасця, якога не забудзе і ў свой смяротны час — гэта зноў жа была Радзіма.

І невялічкая вёсачка на Віцебшчыне, куды кожную вясну цягнула яго незразумелая сіла — усё яна, яго Радзіма.

Мартын глянуў уніз: у вялікую раку, над якой клін ляцеў два апошнія дні, упадала маленькая рачулка, значыць хутка будзе канец доўгаму шляху. Ён упершыню ляцеў адзін — старыя бацька з маці засталіся на поўначы вялікага кантынента, заселенага

людзьмі з чорным колерам скуры. У бацькоў ужо не хапала сіл даляцець да Радзімы... І вось — клін рассыпаўся. Кожны спяшаўся заняць зручнае месца. На палях яшчэ ляжаў снег, і толькі першыя нясмелыя, зацягнутыя зіхатлівымі шкельцамі танюткага ільду праталіны, прадказвалі набліжэнне вясны. Бусліхі прылятуць пазней, а буслы, як сапраўдныя гаспадары, заўсёды прыбывалі першымі, каб падрыхтаваць жыллё для сваіх каханак. Часам буслы так спяшаліся, што прыляталі, калі ў сакавіку яшчэ трымалася сапраўдная зіма. Тады белыя птушкі сценямі блукалі па белым снезе, спадзеючыся знайсці хоць адну праталіну. Было, што і замярзалі...

Але сёлета яны прыляцелі ў самую пару. Мартын завярнуў да бацькоўскай буслянкі. Праўда, ён спазніўся: яго сустрэлі растапыраныя крылы й вострая дзюба Вар'ята — бусла на год старэйшага. Можна было б і пазмагацца, але Мартын не стаў увязвацца ў бойку. Давялося шукаць новае месца. Буслы любяць сяліцца на вяршалінах дрэў, каб зверху было відаць усё наваколле.

Мартын падумаў пра людзей. З бусліных паданняў ён ведаў, што людзі калісьці ўмелі лётаць і былі братамі буслоў. Але Бог за нейкую правіннасць адабраў у чалавека крылы. Людзі толькі зрэдку, у сне, маглі вярнуцца ў стыхію палёту. Раней яны

клапаціліся пра сваіх меншых братоў: замацоўвалі на вершалінах дрэў кола ці барану. А цяпер чалавек стаў абыякавы да ўсяго. Мо таму і перасталі буслы прыносіць дзетак, а без іх знікла і шчасце, бо для ўсяго жывога — шчасце ў дзецях...

Мартын пачаў рабіць гняздо на вадакачцы. Месца высокае, але вельмі цяжка замацаваць сучча на гладкай пакатай паверхні. Амаль два тыдні працаваў ён, не даючы спачыну крылам і дзюбе.

Тым часам прыляцелі бусліхі. Сярод іх была Тэра — яго аднагодка са смешным пёркам, якое віхурылася на галоўцы. Калі Мартын бачыў Тэру, яго сэрца захліствала нейкая цёплая хваля пяшчоты, а дзюба ад разгубленасці цямнела, нібы ў першагодка.

І вось — наступіў дзень, калі павінен быў вырашыцца лёс Мартына. У гэты дзень буслы-трохгодкі ў зробленых буслянках спяваюць Вялікую Песню Кахання (для чалавечых вушэй гэты іх спеў падобны на пошчак малога бубна), а бусліхі, лунаючы ў небе, выбіраюць сабе сябра на ўсё жыццё.

Снег ужо амаль сышоў. Пад ласкавым сонейкам коцікі на вербах зіхцелі жоўтымі ліхтарыкамі. Ручво каля вадакачкі ператварылася ў журлівую рачулку, па якой дзятва плавала на крыгах.

Мартын навёў парадак у буслянцы, нават прыгожую чырвоную стужку ўплёў у галінкі, закінуў доўгую шыю на спіну, накіраваў дзюбу ў бездань неба і заспяваў:

— Маё сэрца перапоўнена каханнем.
Я пабудаваў гэтае гняздо для цябе,
мая жаданая.
Мы будзем лунаць у небе крыло ў крыло,
будзем разам у горы й радасці.
Мы народзім нашых дзетак,
каб гэтая зямля стала яшчэ прыгажэйшай...
Прыляці да мяне, Тэра!

І яна прыляцела. Схіліла да яго сваю галоўку са смешным пёркам і прашаптала:

— Мартын, я — твая да канца дзён нашых!..

А потым быў іх месяц шчасця.

Месяц, калі яны разам луналі над садамі, што красавалі белым вясельным убраннем.

Месяц, калі вечарамі жабы на балоце аж заходзіліся ад млоснага крэкту, а Мартын з Тэрай стаялі ў буслянцы, схіліўшы галовы адзін да аднаго і слухалі суладнае біццё сваіх сэрцаў, якія ператварыліся ў адзіны метраном Кахання.

Месяц, калі яны па чарзе наседжвалі яйкі.

Месяц, у канцы якога ў гняздзе з'явіліся тры маленькія пушыстыя камячкі — іх дзеці.

Бяда здарылася ліпеньскім надвячоркам. Бусляняты махалі крыламі — надыходзіла пара вучыцца лятаць. Паволі хмара цёмна-шэрай фіранкай засланіла сонца. Лёгкі ветрык нейкі час паціху гойсаў у галінах

дрэў, потым набраў моц і пакаціў па дарозе клубы пылу. Дрэвы трывожна зарыпелі, зашасталі суччам. Мартын з жахам убачыў, як да вёскі набліжаўся чорна-фіялетавы віхор, які засмоктваў у сваю варонку ўсё, што было на ягоным шляху. Бусляняты схаваліся на дно гнязда, і Мартын з Тэрай захінулі іх сваімі крыламі. Страшэнны віхор набліжаўся. Вось ён дасягнуў калгаснай фермы — і шыферны дах, нібы вялізны паветраны змей, умомант узляцеў над поплавам...

Жорсткая няўмольная сіла раптам падхапіла бусланку і кінула ў паднябессе. Мартын раскрыў крылы — смерч круціў і шпурляў яго ў паветры аж пакуль не занёс на балота, дзе ўсё ж неяк удалося мякка прызямліцца. Буран панёсся далей.

Мартын не пацярпеў — крылы й ногі былі цэлыя. Ён узляцеў і пачаў шукаць Тэру і дзяцей. Клікаў іх. Неўзабаве знайшлася Тэра. Злы віхор занёс яе значна далей, ажно за балота. Тэра таксама не пацярпела. Яны пачалі шукаць дзяцей.

Ужо вечарэла, калі ў кустах за фермай пачулі поўны болю і адчаю такі родны голас. Мартын з Тэрай апусціліся. У тое, што ўбачылі, не хацелася верыць. Але гэта было страшэннай праўдай, ад якой сэрцы бацькоў праваліліся ў нейкую бездань: у разбураным гняздзе ляжала двое мёртвых бусляняткаў, а трэці, з паламаным крылом, сядзеў побач...

Боль і гора аднолькавыя для любой істоты. І пакуль чалавек гэтага не зразумее, ён не будзе жыць у поўнай гармоніі з прыродай.

Людзі пахавалі буслянят, а Мартын з Тэрай, забраўшы свайго сына, накіраваліся на балота. Зламанае крыло ў малога хутка зраслося, ды не зусім правільна: лятаць ён не мог. Для пералётнай птушкі такая доля — тое, што і смерць.

Наступіла восень. Буслы пакінулі свае гнёзды й збіраліся ў чароды, рыхтуючыся ў далёкі й нялёгкі шлях — у вырай. Мартын з Тэрай навучылі сына паляваць на жаб, вужоў ды іншую балотную жыўнасць. Аднойчы да іх прыляцеў важак кліна.

— Праз тыдзень мы адлятаем. Збірайцеся ў дарогу... Буслёнку свайму не дапаможаце. Ён усё роўна загіне. Такі суровы закон.

Важак пакінуў іх.

Бусляня не чула ягоных слоў. Яно з вялікім стараннем ганялася за жабай.

— Мартын, ляці з клінам. Пасля смерці дзетак маё сэрца скамянела. У ім няма месца радасці. Я застаюся.

— Тэра, любая, як ты магла падумаць, што я здольны на такую здраду? Я вас ніколі не пакіну. Мы застаемся...

Праз тыдзень адляцеў іх клін. Буслы зрабілі апошні развітальны круг над роднымі абшарамі.

Старыя птушкі, якія адчувалі, што больш ужо сюды не вернуцца, — апошні раз глядзелі на маленькую вёску, на свае родныя буслянкі, на рачулку, засцеленую кілімам халоднага восеньскага туману, на палі з павуціннем, на якім дыяментавымі каралямі зіхцелі кроплі марознай расы. Маладыя стараліся запомніць прыкметы свайго краю, куды мусяць вярнуцца наступнай вясной.

— Бывайце! Бывайце!.. — сумна крычалі буслы з паднябесся.

І людзі, пачуўшы іх покліч, прыпынялі працу, узіраліся ў неба, адшукваючы востры бусліны трохкутнік, памахаўшы якому на развітанне, шапталі:

— Бывайце...

Сэрца сцінала кожнаму, хто бачыў гэты клін. «Што яны панеслі з сабой, нашы гордыя птахі? Можа, лета, а можа, год жыцця?..» І чалавек, думаючы пра свой лёс і пра тое, колькі памылак і грахоў ён нарабіў у надзіва імклівым жыцці, станавіўся хоць на нейкі час крыху дабрэйшы, бо крык бусліны, прабіўшы абалонку зла і жорсткасці, ападаў на самае донца ягонай душы.

Зіма прыйшла рана. Мартын з Тэрай зразумелі, што гэта іх — апошнія дні. Яны захінулі свайго сына крыламі, схілілі галовы адно да аднаго.

— Спі, сынку, табе будзе цёпла і добра, — прашаптала маці.

І бусляня заснула, даверліва сунуўшы галаў пад цёплае матуліна крыло.

— Бывай, Мартын... Бывай, мой каханы! Я абяцала быць з табой да канца дзён сваіх — і сваё абяцанне выканала. Прабач, што гэтая апошняя хвіліна наступіла так рана.

— Тэра, мая любая!.. Ты падарыла мне лепшыя хвіліны жыцця. Я не змог абараніць цябе і нашых дзяцей, але мы назаўсёды застанемся разам.

І трое буслоў заснулі пад халоднымі мятлікамі падаючага снега, і праз колькі гадзін толькі гурба, падобная на сілуэт вялікай птушкі, нагадвала аб месцы, дзе яны знайшлі свой апошні прытулак.

# ЗВЫЧАЙНЫ ЗІМОВЫ ДЗЕНЬ

*Маці прысвячаю.*

Жанчына распальвала печ. Дровы аніяк не хацелі разгарацца, дым кідаўся ў хату, слязіў вочы, але яна падкінула з загнета смаляных трэсак, і полымя весела загуло.

— Ой, дачушка ж на вуліцы, пэўна, замерзла, — жанчына тут жа выхапілася з сенцаў.

Бялявая дзяўчынка нерухома стаяла каля гурбы снега.

— Мама, мне холадна, — ледзь прашаптала малая; ад холаду вусны яе былі сінія.

— Валечка, дачушка, хадзі да мяне!.. — ускрыкнула жанчына і... прачнулася.

Падушка намокла ад слёз. Старая з цяжкасцю ўстала з праціснутага ложка і басаног пашэрпала па халоднай падлозе ў кут, да бажніцы.

— Святы Божа! Прасвятая Багародзіца! Прыміце пад сваё крыло маю дачушку Валечку. Захініце яе душу ад цёмных сіл! Забярыце і мяне да яе, бо цяжка і самотна жыць мне на гэтым свеце... І яшчэ

малю: зберажыце майго адзінага сыночка, пашліце яму шчаслівы лёс!

Шчырыя словы малітвы й слёзы крыху супакоілі. Жанчына адчула: зусім умарозіла ногі. Яна выпіла колькі кропель карвалолу, каб супакоіць боль у сэрцы, якое трымцела, сціснутае нечыяй жорсткай далонню, і прылегла. Ад лекаў гэтая хіжая далонь пакрысе пачала адпускаць свае бязлітасныя пальцы, сэрца увайшло ў звыклы рытм. Стала лягчэй. Жанчына запаліла ліхтарык і глянула на гадзіннік. Пяць. Трэба падымацца. Яна ведала, што ўжо не засне. Які там сон у старога чалавека. Зімовая ноч, нібы чорная магіла, у якую кладзешся і не ведаеш, ці давядзецца прачнуцца раніцай. За вокнамі лютаўскі вецер гудзе ў правадах, гуляе суччамі на старой вярбе, свіргеча аканіцамі, лясным пугачом кугіча ў коміне. Раз-пораз бяроза голлем трэцца аб шыферны дах, быццам просіцца да хатняга цяпла. Толькі якое там цяпло? Хату яны з мужам купілі ў былога дырэктара школы, а зруб, як звычайна, ставілі вечна п'яныя калымшчыкі. І хоць будынак потым абшалявалі, цяпла ўсё роўна не было. З вечара выпаленая грубка яшчэ грэла, а да раніцы вецер праз нябачныя воку шчыліны выдзімаў усё цяпло. За шпалерамі шкрэбліся мышы, і праз дрымоту здавалася, што па сценах гуляюць нейкія таемныя пачвары. Кот Рыжык не любіў начаваць

у хаце, і з вечара прасіўся на вуліцу. Але гэты тыдзень стаялі моцныя маразы, і ён не выходзіў вонкі.

Сярод ночы жанчыну разбудзіў страшэнны піск і вурчанне. Па падлозе, налятаючы на мэблю, у смяротнай бойцы качаліся дзве раз'юшаныя істоты...

Калі шум заціх, старая запаліла святло і ўбачыла, што Рыжык трымае за глотку здаравеннага пацука з голым хвастом. Ад агіды жанчына аж здрыганулася.

Малайчына, Рыжык, не спужаўся — не кожны кот пойдзе на пацука. Суседка, вунь, расказвала, што два яе каты ядуць разам з пацукамі са свіных ночваў. Але ж моцна дасталася Рыжыку — тыдзень залізваў раны. Яна ўжо яго за такую храбрасць песціла як мае быць, падкладвала лепшыя кавалкі, паіла малачком. Задаволены кот цёрся аб ногі, мурлыкаў і горда, як пераможца, хадзіў па хаце...

Але ж трэба ўставаць. Апрануцца старому чалавеку складана — акурат як і малому. Толькі аднаму не хапае розуму, а другому — сілы. З паўгадзіны жанчына нацягвала на сябе цёплыя рэчы, абувала валёнкі. Затым выйшла ў трысцен. Там было яшчэ халадней, але яна рашыла, што ў печы не будзе паліць: марозу няма, трэба паберагчы дровы. Спаласнула твар ледзяной вадой і паставіла на пліту чайнік. Убачыўшы ў акне святло, на вуліцы закаўкаў кот. Яна выйшла ў калідор, адчыніла дзверы — упусціла Рыжыка. Той кінуўся да сваёй місачкі.

— Пачакай, бадзяга, — ласкава сказала гаспадыня.

Пакрышыла ў сподак чорнага хлеба і заліла малаком. Кот не мог дачакацца, калі паставяць ежу на падлогу, мяўкаў і торкаўся галавой пад рукі. Яна адштурхнула яго і паставіла сподак. Кот накінуўся на ежу, еў і здаволена мурлыкаў. Любіць ён малачко з хлебам, а мяса здабывае сам. Унук прывёз яму аднойчы са сталіцы «віскас». Рыжык доўга абнюхваў сухія карычневыя камячкі. Потым, праўда, пачаў есці. Гэты «віскас» так трашчаў на ягоных зубах, што, здавалася, тут жа зламаюцца. Але нічога, зубы ацалелі. Праўда, вады потым не мог адпіцца.

Рыжык паеў і пабраўся на печ грэцца. Тым часам зашумеў чайнік. Жанчына насыпала ў кубак чаю, заліла кіпетнем і накрыла сподачкам, каб лепш заварыўся. Сын прывёз добрага чаю, індыйскага. Раней імпартны чай, растваральную каву, печань траскі даставалі толькі па вялікім блаце. Цяпер усё гэта ёсць у любой вясковай краме, былі б грошы. Падумалася: «Тады гэтых далікатэсаў было не менш... І куды ж яны ўсе разыходзіліся?» Адказу на пытанне яна не знайшла і села піць чай. Паклала ў кубак лыжачку мёду, адрэзала акраец батона. Сын завёў пчолы, хоць спраў з імі стае, затое ёсць свой мядок. Толькі яна больш раздае яго за паслугі, чым ужывае.

Фершалка Марына прыходзіла рабіць уколы — адшкадавала ёй слоічак. Суседка дапамагае снег

пачысціць, іншы раз вады прынясе — таксама трэба даць. Без гэтага ж аніяк. Калі ты — да людзей з ласкай, дык і ад цябе не адвернуцца. У сенцы нехта пастукаў. Яна выйшла ў калідор, спытала:

— Хто?

— Я, Ніначка, адчыняй, — пачуўся голас сястры.

Зайшла, павіталася, паставіла на стол літровы слоік з малаком, з цяжкасцю села на канапу.

— Малачко вось табе прынесла, дый заадно праведаю... Як ты тут маешся?

— Ды, дзякуй Богу, нічога. Вось толькі сон бачыла... — І са слязьмі на вачах пачала пераказваць сон. На вачах у сястры таксама нагарнуліся слёзы.

Матчыны слёзы... Ліюцца яны з жаночых вачэй і ў вайну, і ў мірны час, ад гора і радасці, ад болю і шчасця. Кожную хвіліну прымае іх маці-зямля, ачышчае і гаючай крынічнай вадой аддае людзям.

— Трэба з'ездзіць у царкву памянуць дачушку, а то халодна ёй на тым свеце. Дый на могілкі хацелася б сходзіць, толькі ж завеяла ўсё, не дайду, — усхліпвала старая, дрыготка цепаючы плячыма.

— Пачакай, Ніначка, хай крыху пацяплее ды снег растане... Разам сходзім, — заспакоіла сястра.

Гледзячы на сваю, змораную цяжкай працай і хваробамі, малодшую сястру, жанчына прыгадала, як перад вайной памерла іх маці, і яна, пятнаццацігадо-

вая дзяўчына, студэнтка педвучылішча, засталася з пяцігадовай сястрычкай на руках. Бацька пайшоў у прымы да ўдавы-палячкі з семярыма дзецьмі. Старэйшы брат ажаніўся і, як толькі грымнула вайна, яго забралі ў войска. Малады лейтэнант-танкіст загінуў у першым баі, пакінуўшы сіротамі двух маленькіх сыноў. А яна стала партызанскай сувязной. Ад надзейнага чалавека даведалася, што фашысты павінны яе арыштаваць, і паслала маленькую сястрычку да бацькі, бо самой трэба было ісці ў партызаны. А той адправіў сваю дачушку назад: «Ідзі, Алечка, да сваёй сястрычкі, з ёй табе будзе лепей...» Яна пакінула малую на братавую, ноччу пайшла ў пушчу. Бацьку яна так і не змагла дараваць ганебнага ўчынку...

Сястра развіталася і пайшла дадому. Трэба брацца за хатнія справы. Сем гадоў назад давялося расстацца з кароўкай, з любай Красуняй. Якое малачко яна давала: смачнае, тлустае, з трохлітровіка атрымлівалася больш за паўлітра смятаны! Але даглядаць стала цяжка, асабліва пасля смерці мужа. За лета трэба вазоў восем сена назапасіць, разы са два адпасці радоўку, зімой кожны дзень прынесці трое судоў вады, злазіць на гарышча па сена, адкінуць гной, памяняць подсціл. Гэта гарадскія кабеты, якія ніколі не жылі ў вёсцы, кажуць: «Вам добра, у вас — свая кароўка!» А каб якая паспрабавала хаця б тыдзень па-

даглядаць жывёлу, у гнаі пакапацца, дык ніякага б малака не захацела. А для вясковай жанчыны кароўка — гэта больш, чым хатняя жывёла, гэта — адлюстраванне яе душы. Нездарма ж мужыкі абзываюць жанчын каровамі, ёсць тут доля праўды. Калі летам на пашы ўважліва прыгледзецца да жывёл — згадаеш, якая ў каго гаспадыня. Вунь павольна і важна ідзе, нетаропка скубе траву буйная рабая рагуля з абламаным левым рогам. Яе гаспадыня, Александрына, такая ж пышная і мажная. А вось — бурая худая жывёлінка так і наровіць баднуць каго-небудзь сваімі вострымі рагамі. Яе гаспадыня, Пятроўна, злосная на язык, можа аблаіць чалавека ні за што. А тая, вунь, чорная карова толькі й чакае моманту, каб даць дзёру ў кусты. Яе гаспадыня Лідка, як кажуць, слабая на передок, гуляе направа і налева, нікога не саромеючыся...

Затое Красуня была ласкавай і пяшчотнай. Як жа яна не хацела ісці з новымі гаспадарамі, паварочвала галаву да роднага двара, жаласна мыкала, як быццам пыталася: «Навошта вы мяне прадаяце? Што я дрэннага вам зрабіла?» Колькі слёз тады праліла жанчына, бо з кароўкай адышла нейкая часціна і яе душы... Але ж Красуня — такая разумніца! Вяртаючыся з пашы, яна кожны раз спынялася каля роднага двара і мыканнем клікала былую гаспадыню. Тая выносіла лусту хлеба з соллю, абшчэплівала

шыю Красуні й плакала, а кароўка шурпатым языком лізала яе далоні, як быццам супакойвала: «Нічога, усё будзе добра, я цябе ніколі не забуду». Цяпер у гаспадарцы засталіся адно куры. Зімой з іх карысці аніякай, не нясуцца. Вядома ж — хляўчук цёмны, халодны.

Старая апранулася і пайшла ў хлеў, адамкнула дзверы. Гадоў трыццаць таму, калі калгасы будавалі сваё жыллё, з гарадоў у вёскі панаехала рознага зброду. Сваёй гаспадаркі яны не трымалі, пілі гарэлку і кралі ўсё, што дрэнна ляжыць. Раней вяскоўцы ніколі не зачынялі хаты, а цяпер і замкі не дапамагаюць. Галоўнае, міліцыя і калгаснае кіраўніцтва добра ведаюць тых, хто крадзе, але чамусьці ніхто злодзеяў не чапае...

Жанчына зайшла ў хляўчук. Куры спалохана заквокалі, а певень Чарныш пранізліва закукарэкаў. Ён жа такі прыгажун, гэты Чарныш! Сын тры гады таму прывёз з Мінска пяць куранятак пароды «Род Айленд». Курачкі выраслі добрымі нясушкамі, яйкі неслі вялікія, карычневага колеру з жаўтком бліскучым, як сонейка. А ўжо на пеўня прыходзіла любавацца ўся вёска. Цёмна-чырвоныя пёркі пераліваліся перламутрам, зверху пышнага хваста расло некалькі пер'ін аксамітна-чорнага, з сапфіравым адлівам колеру, затым снежным выбухам ішло дзве пер'іны не горшых, чым у страўса; чырвонае золата сярэдзіны мякка пера-

ходзіла ў охру ніжніх пёрак. Карона налітага баявой крывёй грэбня, была незвычайна раздзелена на два рады й надавала пеўню велічны й грозны выгляд. Калі ён выходзіў на вуліцу і пераможна гарланіў: «Хто не згодны, што я галоўны?!.» — усе суседскія пеўні хаваліся па сваіх дварах, бо кожны з іх паспытаў ужо вострую дзюбу і моцныя шпоры Чарныша. Толькі ж і сваім курам даставалася: затоптваў іх яры певень — усё лета хадзілі яны з выскубанымі голымі спінамі. Курыца ж, вядома, птушка дурная, заўсёды падлезе пад кола машыны. А певень — не, ён разумнік. З людзей прызнае толькі сына. Можа, памятае, як той выратаваў маленькіх куранятак, якія трапілі пад нечаканы лівень. Квактухі ж не было, і пушыстыя жоўтыя кураняткі ўмомант ператварыліся ў мокрыя шэрыя камячкі, дрыжэлі ад холаду і ледзьве ціўкалі. Здавалася, не выжывуць. Але сын прынёс электракаларыфер, да якога, як да маленькага сонейка, пачалі хінуцца кураняткі й пакрысе абсыхаць. Потым сын паслаў у картонны карабок сухога моху, пасадзіў туды пісклят і паставіў на цёплую печ. Надзіва, усе выжылі. Калі прыязджае сын, Чарныш падбягае да яго, разграбае лапай зямлю і дзюбай паказвае на якое-небудзь зернятка: «Частуйся, гэта мой падарунак табе!» Сын, у сваю чаргу, дастае з кішэні жменю семак і прапануе Чарнышу. Той важна

падыходзіць, акуратна бярэ з далоні па адным семку, дазваляе сябе пагладзіць: «Досыць, раз пагладзіў — і хопіць, я ўжо не маленькі, не падрывай мой аўтарытэт!» Потым падзывае курэй і дзеліцца з імі пачастункам.

Але гэты раз Чарныш кукарэкае нечага трывожна-папераджальна. Так ён крычыць, калі на двор забяжыць чужы сабака. Значыць, нешта здарылася. Жанчына падлічыла курэй. Пяць, адной няма. На падлозе яна заўважыла белую курачку з ад'едзенай галавой. От, бяда! Шашок праклятый прыходзіў! І вось жа які тхор крыважэрны: курыцу не есць, толькі кроў выпівае. У суседзяў падавіў курэй, цяпер і сюды дабраўся. Трэба нешта рабіць, бо калі ўжо злодзей знайшоў дарогу, дык абавязкова вернецца. Прыйшлося лавіць курэй, саджаць у мех і пераносіць у невялікую лазню, што стаяла ў садзе. Сцежку занесла снегам, таму жанчына стамілася, пакуль зрабіла гэтую, як здаецца, нескладаную справу. Яна зайшла ў хату і прылегла на канапу, каб крыху аддыхацца. Але адлежвацца некалі: трэба ісці па ваду, калодзеж недалёка. Капаў яго пакойны муж з суседзямі. Муж... Сем гадоў, як яго не стала. Быў працавіты, руплівы гаспадар. Па-маладосці часценька прыкладваўся да чаркі. А вось на пачуцці ды ласкавыя словы быў скупы. Незадоўга да смерці прыслаў ёй з бальніцы

ліст, і пачынаўся ён словамі: «Ніна, дарагая...» І гэтае слова, дарагая, кранула яе да слёз. Людзі, людзі... Мы думаем, што будзем жыць вечна і ўсё паспеем зрабіць і сказаць. Саромеемся гаварыць пяшчотвыя словы, адкладваем на потым, а гэтага «потым» можа і не быць...

Вось і мужу да слова «дарагая» прыйшося прабівацца, як да струменя вады ў іх калодзежы. Мужчыны ўкапалі дванаццаць бетонных кольцаў, а вады ўсё не было. Потым муж сястры Аляксей ломам прабіў пласт цвёрдай, як крэмень, гліны. Лом праваліўся ў нейкую бездань, і знізу ўдарыў такі струмень крыштальнай вады, што ўмомант заліў Аляксея па самую шыю — ледзь паспелі выцягнуць яго на лейцах. Затое ўжо вада была на зайздрасць усяму наваколлю. У спёку ад яе сцюдзёнай з блакітным адлівам крынічнай вільгаці заходзіліся зубы й не хацелася адрывацца ад вядра, у якім купалася сонейка. Кожную раніцу перад выездам у поле каля студні спыняліся калгасныя механізатары й набіралі флягі, тэрмасы, бутэлькі гэтай чысцюткай вады...

Старая ўзяла вёдры, каромысел і пашыбавала да калодзежа. Яна паставіла вёдры на абледзянелую лаўку і пачала круціць ручку калаўрота. Важкае акаванае вядро плёхнулася на ваду і пайшло на дно, нацягнуўшы ланцуг. Уверх круціць цяжка, вядро

чапляецца за выступы кольцаў, расплёсквае ваду. Наверх выцягваецца толькі палова вядра. Калодзежы з асвяром былі больш зручнымі для старых людзей...

Жанчына наліла да паловы вядра, бо данесі поўныя ўжо не стае сілы. І куды яны падзяваліся, тыя сілы? Можа, засталіся ў партызанскіх зямлянках зімовага лесу? А можа, на тым слізкім бервяне праз Беразіну, па якім трэба было прабегчы, калі яны выходзілі з кальца блакады? Смерць была ў вадзе: хто зваліўся з мокрага бервяна, застаўся там назаўсёды. Смерць была ў паветры, адкуль «Юнкерсы» палівалі людзей смяротным дажджом. Жыццё было ў лесе, на тым беразе, і яна здолела перабегчы. Пэўна, сілы засталіся ў лепшых кавалках, якія яна аддавала дзецям. А колькі гэтых сіл рассыпана па вучнёўскіх сшытках, якія правярала пры цьмяным святле газавай лямпы. Тымі сшыткамі можна было заслаць усю плошчу роднага Чашніцкага раёна. А большасць сіл забралі з сабой у магілы муж і дачушка, якую нечая злая сіла скінула з даху дзевяціпавярховага дома. І хоць прайшло ўжо дзесяць гадоў, слёзы зноў падступілі да вачэй, бо гэтая рана ніколі не загоіцца.

Яна прынесла ваду і глянула на гадзіннік: ужо дзве гадзіны. Апетыту няма, але трэба нечага паесці. Паставіла на газ каструльку з вадой, пакрышыла туды пару бульбін, усыпала пакет «Ролтана» — і

неўзабаве суп быў гатовы. З пенсіі яна, як і ўсе вясковыя пенсіянеры, набірала гэтых канцэнтратаў і кубікаў «Галіны Бланкі». Хутка і танна, хоць і не вельмі карысна. Жанчына пасёрбала гарачага варыва. Хлеб яшчэ ёсць — буханкі ёй з катом хапае на тры дні. У краму можна не хадзіць. Дый не вельмі цягне туды. Калгаснікам плацяць грошы са спазненнем на тры месяцы, хаця — якія там грошы, назва адна. Без хатняй гаспадаркі пражыць немагчыма. А яна больш сарака гадоў адпрацавала ў школе, ветэран вайны, і атрымлівае нядрэнную пенсію. Гэта выклікае зайздрасць у людзей. Апошні раз адна кабета, з пітушчых, уголас заявіла ў краме: «Пенсіянерам вунь якія грошы плацяць! За што? Трэба іх раскулачыць!» Людзі, праўда, асадзілі яе, але ж крыўда засталася. Ачарсцьвеў чалавек за апошні час. Кінуўся зарабляць грошы, а пра душу забыў. Хапае, грабе пад сябе, адпіхвае слабых і нямоглых, а ўсё здаецца мала. Хочацца яшчэ і яшэ. А няхай бы задумаўся: што ж пасля сябе застанецца на гэтым свеце? Толькі памяць і твая вечная душа. А ёй, душы, грошы не патрэбныя. Каб чалавек больш аб гэтым думаў, менш бы злосці ды гора было б на гэтым свеце.

Аднак жа — трэба праведаць пчолак. Пяць, занесеных снегам вулляў, стаяць пад яблынямі ў глыбіні сада. Спяць зараз і руплівыя залатыя працаўніцы.

Вось пчолка, здаецца, звычайнае насякомае, як муха ці камар. Ды не... Ёсць у яе нейкі розум. Яна ведае свайго гаспадара і не кусае яго. А чужы толькі сунься — і не пашкадуе жыцця, каб абараніць свой вулей. Тры гады таму позняй восенню залезлі ў сад злодзеі, забралі рамкі з мёдам, нарыхтаваным пчоламі на зіму. Загінулі тады пчолы. Прыехала міліцыя, знайшлі нягоднікаў. І што ж вы думаеце? Аказаліся дзеці мясцовых настаўнікаў, з якімі яна разам працавала ў школе. На каленях прасілі, каб даравала. Вось цяпер і прыходзіцца абыходзіць пчэльнік, назіраць, каб не залезлі двуногія трутні. Зімой панадзіліся сініцы. Садзяцца на прылётную дошку і стукаюць дзюбай у вулей. Пчала-ахоўніца высунецца, каб праверыць, хто там, а сініца хапае яе і есці... Шмат ворагаў у бедных пчолак.

Жанчына прайшлася між рамовак, змяла снег з прылётных дошак. Чужых слядоў няма, усё добра. Ля апошняга вулея на калючым кусце барбарысу крывавымі гронкамі на белым снезе ірдзелі ягады. З абляпіхі птушкі склявалі ягады, а барбарыс не чапаюць, пэўна, занадта кіслы. Так і вісяць ягады аж да будучага ўраджаю.

Тым часам пачало змяркацца. Зімовы дзень згарае імкліва, як жыццё ў старасці. Жанчына прынесла дроў, распаліла грубку. Увечары патэлефанаваў сын.

— Мама, як ты там?.. Як здароўе?

— Нічога, сынок... Як ты маешся, як мой унучак?

— Усё добра, не хвалюйся.

— Сынок, памятай, я грошы на смерць прыпасла... У на́сыпцы ляжаць, не забудзься.

— Мама, не заводзь сумныя размовы!.. Я праз колькі дзён прыеду. Усё будзе добра.

Вось і скончыўся ён, звычайны зімовы дзень.

# КОРШАК

Шурык стаяў над абрывам. Унізе чорнымі маланкамі насіліся стрыжы. Яшчэ ніжэй, у зараслях вербалозу, бруілася рачулка. Хлопчык адштурхнуўся, раскінуў рукі — і паляцеў. Спачатку было страшна, але потым ён зразумеў, як лёгка кіраваць сваім целам...

Шурык лунаў над роднай вёскай і назіраў за ўсім, што адбывалася ўнізе. Вунь на спартыўнай пляцоўцы, абсаджанай бярозамі, ягоныя сябры гуляюць у футбол з хлопцамі суседняй вёскі. Варатар Лёха заўчасна выбег наперад, і мячык пакаціўся ў пустыя вароты. Шурык заклаў такі рэзкі віраж, што аж дух заняло, і выбіў мяч...

Але чароўны палёт быў тут жа перапынены голасам бабулі:

— Падымайся, ужо Іванка прыйшоў... Каб грыбоў набраць, трэба рана ўстаць!

Куды-куды, а на такую справу Шурыка не трэба ўгаворваць. Ён борздзенька ўскочыў з ложка, прывітаўся са стрыечным братам, апаласнуў твар халоднай вадою, апрануўся — гатовы!

— Вазьміце кошык ды збегайце пад яблыню, назбірайце спасавак, — загадала бабуля.

Хлопчыкі сабралі ў траве мокрых ад расы чырванабокіх яблыкаў, і разам з бабуляй накіраваліся праз луг да бліжэйшага асінніка.

Было яшчэ рана: неба на ўсходзе толькі пачало ружавець і размалёўвацца рознымі адценнямі чырвонага колеру. Вось паказаўся вогненны дыск сонца, абяцаючы пагодлівы дзень. Пасля ўчарашняга дажджу над балацінамі й нізкімі месцамі малочным покрывам слаўся туман. Ногі малых грыбнікоў халадзіла раса, але ім гэта не ў страх — бабуля з ранняй вясны прывучала хадзіць босымі. Сама ж яна ў свае восемдзесят нават па першым снезе бегае басанож і ніколі ад гэтага не хварэла.

Вось і асіннік.

— Бабуля, а чаму лісты на асіне заўсёды дрыжаць? — спытаў Іванка.

— Кажуць, унучак, што на гэтым дрэве павесіўся Юда, які за трыццаць срэбранікаў прадаў Хрыста. Але ж дрэва не вінаватае. Яно вельмі карыснае, бо толькі з яго драўніны робяць запалкі. Нездарма кажуць: «Асіна гарыць без керасіна». А якія грыбы пад гэтым дрэвам растуць, ведаеце?

— Падасінавікі! — дружна адказалі хлопчыкі.

— Малайцы! — пахваліла бабуля. — Адно не

забывайцеся кланяцца кожнаму дрэўцу, тады й грыбоў больш назбіраеце.

Шурык заўважыў ля асіны вялікі чырвоны грыб. Узрадаваны, кінуўся да яго, але гэта аказаўся мухамор: прыгожы франт у чырвоным, з белымі гарошынкамі, капелюшы. Лепш яго не чапаць. Ля наступнай асіны пашанцавала. Хлопчык натрапіў на цэлую сямейку падасінавікаў: тату з мамай і траіх дзетак. Ён вострым сцізорыкам акуратна зрэзаў грыбы, пацалаваў кожнага з іх у капялюшык і шапнуў ім:

— Дзякуй, што адкрыліся мне, чырвоненькія!

Каля бярозкі апароў два абабкі. Бачыў ён і сыраежкі, але не браў: на дне кошыка яны патруцца, а сустракаюцца і лепшыя грыбы.

— Іванка! Шурык! Ідзіце сюды! — паклікала бабуля.

Хлопчыкі падбеглі да яе.

— Нейкай тухляцінай тут пахне, — сказаў Іванка.

— Унюхаў! — засмяялася бабуля. — Вось паглядзіце, адкуль гэты пах.

Хлопчыкі нахіліліся і ўбачылі ў траве дзівосна незвычайнае яйка, пакрытае зеленаватай слізззю. Над ім роіліся мухі.

— Гэта таксама грыб, — запэўніла бабуля. — Называюць яго вясёлкай, бо над ім заўсёды весела гудуць мухі. Вельмі карысны грыб, дапамагае ад

многіх хвароб... Давайце пашукаем, можа, яшчэ знойдзем. — І папярэдзіла: — Бярыце маладыя, ад іх больш карысці.

І сапраўды, хлопчыкі знайшлі яшчэ тры вясёлкі. Бабуля абцёрла іх і загарнула ў чыстую анучку. Між тым — кошыкі напаўняліся.

— Што, унучакі, прытаміліся?.. Давайце крыху адпачнем, вады з крынічкі нап'емся. Яна тут побач.

Хлопчыкі ўслед за бабуляй спусціліся ў яр. Унізе з-пад берага струменіла крынічка. Пясчынкі на дне варушыліся і час ад часу падскоквалі ўверх, нібы жывыя. На альховым суку вісела конаўка.

— Паспытайце, унучакі, што за вада. Такой смачнай больш нідзе тут не знойдзеце!

Шурык зачарпнуў вады й прыпаў да конаўкі. Ад холаду спачатку заламіла зубы, потым, калі першая смага была натолена, ён адчуў водар траў і кветак, якімі была насычана жывая моц крыніцы. Пасля хлопчыкі яшчэ і твары памылі — тут жа адчулі сябе бадзёрамі, з'явіўся вясёлы настрой.

— Цяпер можна і папалуднаваць, — сказала бабуля. — Сядайце, перакусім... — Яна дастала хлеб, кавалачак сала, пер'е цыбулі й разлажыла гэту няхітрую ежу на разасланую хустку. Хлопчыкі дабавілі да стала яблыкі, з асалодай узяліся есці. — Во, апетыт нагулялі, — жартавала бабуля. — Дома

вас такім пачастункам не здзівіш, а тут — аж за вушмі трашчыць, так стараецеся... Ешце на здароў'е, мае даражэнькія!

Пасля адпачынку яшчэ раз прыпалі да крынічнай вады, і затым ужо рушылі далей. Пачынаўся Маяк. Так называлася самае высокае месца ва ўсёй акрузе. На вяршыні гэтага ўзвышша стаяў драўляны трынгуляцыйны знак.

Іванка па сходках залез на яго і агледзеўся. Цудоўная панарама адкрывалася адсюль! Вунь, бачны могілкі, за імі — родная вёска Дварэц, правей — вёска Бор... Палі, лугі, хмызнякі.

— Злазь, Іванка, — закамандавала бабуля. — Тут, бачу, сустракаюцца маслякі, а калі пашукаць, можна і на баравік патрапіць.

Ставала ў гэтай мясціне і соснаў, і дубоў, і бяроз. Пад маладымі хвойкамі хлопцы якраз і натрапілі на даволі ладную купку маслякоў — грыбы ў карычнева-слізкіх капелюшах. Адразу пацяжэлі кошыкі, а пальцы й далоні ў грыбнікоў сталі чорныя й ліпкія. Але гэта не бяда, былі б грыбы! У верасовай гусцежы Шурык убачыў каржакаватага велікана ў карычневым капелюшы.

— Ура! Баравік!

— Дзе?.. Пакажы! — падбег Іванка.

— Шукайце!.. Побач павінны быць ягоныя браты, — падказала бабуля.

Сапраўды, хлопчыкі тут жа знайшлі яшчэ чатыры баравікі, але троху меншыя за першы.

Нечакана пачуўся птушыны крык, што і блізка непадобны да галасоў знаёмых птушак.

— Хто гэта?!. — Іванка непаразуменна глядзеў на бабулю.

— Каршун... Недзе тут яго гняздоўе. Збегайце, паглядзіце. Ды на дрэва не лезце, а то вочы выдзеўбе.

Хлопчыкі пабеглі на крык птушкі. Перад велізарным дубам спыніліся. З яго кучмаста-густога макоўя даносіўся трывожлівы клёкат каршуна. Недзе там і гняздо гэтай птушкі. І якраз Іванка пад дрэвам убачыў птушаня, вялікае, але бадай яшчэ зусім голае — першы пух толькі прабіваўся праз ружовую скуру. Сапраўдны галапупак! Але ў яго быў драпежны нораў караля птушак.

Шурык паімкнуўся ўзяць малога коршака ў рукі, але той зашыпеў, расправіў голае крылле і моцна клюнуў хлопчыка ў руку.

— Які злосны — дзяўбецца! — ажно войкнуў Шурык.

— Напэўна, з гнязда выпаў... Неяк трэба яго назад пакласці, — заклапочана сказаў Іванка.

Якраз і бабуля падышла.

— Не, мае вы добрыя, яму тут мы нічым не дапаможам, — сказала яна. — Калі ў выпадку два

птушаняці, і не хапае ежы, больш моцны выпіхвае свайго слабейшага брата з гнязда.

— А што з гэтым будзе?.. — спытаў Іванка

— Загіне... Ноччу на яго ўзбрыдзе ліса ці яшчэ які драпежнік.

— Бабулечка, даражэнькая, а калі мы возьмем яго з сабою? — у вачах Іванкі гарэлі бліскаўкі.

— Мы яго карміць будзем, паіць, — Шурык хваляваўся не менш за Іванку. — Ён прывыкне да нас.

— Бярыце, але наўрад ці вы зможаце яго пракарміць, бо яму ж кожны дзень патрэбна свежае мяса.

— Нічога, што-небудзь прыдумаем, — зарадаваўся Іванка.

— Галадаць ён у нас не будзе... — Шурык зняў з сябе кашулю і акрыў птушаня, якое не пераставала злосна шыпець. Завязаўшы рукавы вузлом, падняў знайдзёнка і сказаў да Іванкі: — Спачатку няхай у мяне пажыве... А спажыву яму даставаць будзем разам.

— Я не пярэчу... Як мы яго назавем?

— Коршакам будзем зваць.

— Добра, — згадзіўся Іванка.

Дома Шурык развязаў кашулю, і Коршак, расправіўшы крылы, зацокаў па падлозе кіпцюрамі, неўзабаве забіўся пад стол і аціх. Валя, малодшая

сястрычка Шурыка, хацела пагладзіць Коршака, але ён і гэты раз злосна зашыпеў, і яна адскочыла ўбок.

— Не чапай... Коршак вельмі балюча дзяўбецца, — папярэдзіў брат.

Тым часам прыбег Іванка — прынёс кавалачак мяса. Парэзалі мяса на дробныя долькі й паклалі на спадак, які асцярожна падсунулі да птушаня. Коршак адно злосна шыпеў, ежы ўсё роўна як і не бычыў.

— Давайце схаваемся, — прапанаваў Шурык.

Яны выйшлі ў суседні пакой, дверы не да астатку зачынілі — пакінулі маленькую шчылінку для назірання.

Коршак, пасядзеўшы ў адзіноце, нахіліў галаву да сподка і разгледзеў ежу. Потым клюнуў, падняў дзюбу — і першы кавалак знік у роце.

— Малайчына, есць! — зарадаваўся Шурык, а з ім і ўсе астатнія.

— Бедненькі!.. Без таты, без мамы застаўся, — шкадавала Коршака Валя.

— Нічога!.. — Шурык быў надзіва ўпэўнены ў свах памкненнях. — Вырасце — будзем хадзіць з ім на паляванне.

Коршак тым часам апаражніў сподак, і дзеці падсунулі яму бляшанку з вадой, ён з задавальненнем папіў.

У хату зайшла гаспадыня, з7дзіўлена спытала:

— Што гэта за новы жыхар у нас з'явіўся?

— Мамачка, гэта птушанятка... Завуць яго Коршак. — Валя ласкава прытулілася да маці.

— Ого, ваша птушанятка — велічынёй з добрую курыцу... Але ж у хаце яму не месца — аднясіце ў пуню, там цёпла і суха.

Хлопчыкі так і зрабілі. З гэтага часу у іх прыбавілася клопату: трэба было здабываць ежу для Коршака. Яны прыносілі з балота жабянят, жукоў, чарвякоў, лавілі ў рацэ рыбу. Шурык нават аднойчы адабраў у кошкі толькі што злоўленую мыш і аддаў Коршаку, які з задавальненнем паласаваўся палёўкай. Зрэшты, на адсутнасць апетыту гадаванец не скардзіўся — каўтаў усё, што яму прыносілі. І ўжо не кляваўся — браў ежу проста з рук. Як толькі адчыняліся дзверы ў пуню, гартанным клёкатам вітаўся з зайшламі. У яго тым часам адрасло пер'е, і з ружовага галапупака ёнператварыўся ў прыгожую птушку. Суседскія дзеці збягаліся паглядзець на Коршака, але сваімі сябрамі ён лічыў адно Шурыка з Іванкам ды яшчэ Валю, астатніх да сябе блізка не падпускаў. Хлопчыкі прыдумалі такую гульню: да вяроўкі прывязвалі стары бот і цягалі па дарозе. Коршак, растапырыўшы крылы, ганяўся за ботам. Дзядзька Даніла, сусед, неяк сказаў:

— Навошта вам гэты каршун?.. Трэба яго забіць, бо вырасце — і стане курэй нішчыць.

Але дзеці не давалі ў крыўду свайго сябра. Аднойчы, праўда, ледзь было не спазніліся... Чырвона-чорны певень па мянушцы Чарныш — забіяка з забіяк. Яго баяліся не толькі суседскія пеўні, але нават сабакі й каты. Неяк старая з суседняй вёскі зайшла ў двор. Дык гэты певен-няўрымсак скокнуў ёй на плечы й пачаў дзяўбці ў галаву. Бедная жанчына з перапуду гупнула на калені, пачала хрысціцца. Шурыкаў бацька ўхапіў раз'юшанага Чарныша і аднёс у хлеў, зачыніў дзверы на засаўку. Певень спрабаваў біцца і з Шурыкам, пакуль той не адхвастаў яго венікам.

Настойлівы быў Коршак і мужны. Неяк хлопчыкі пачулі з вуліцы яго разгневаны клёкат і злосны крык пеўня. Яны ўзбеглі на падворак і сталі сведкамі жудаснай бойкі: певень падскокваў у паветра і сваімі шпорамі апантана біў Коршака. Той, распраставўшы крылы, адбіваўся. Яго дзюба і шыя былі ў крыві. Па двары ляцела пер'е. Гэта была бойка не на жыццё, а на смерць, бо ніхто з праціўнікаў адступаць не збіраўся.

Шурык кінуўся ў сенцы, схапіў вядро з вадой і абдаў пеўня, ды яшчэ даў яму добрага выспятка і выгнаў з двара. Коршаку дасталося, але ён не адступіў — мужна біўся з моцным ворагам. Жоўтыя вочы яго гарэлі нянавісцю. Шурык абняў свайго любімца — яму шкада было гэтай цудоўнай птушкі.

На шчасце, Коршак хутка ачуняў. Шурык вырашыў, што пара навучыць яго лётаць. Ён знайшоў скураную пальчатку, надзеў яе, пасадзіў на руку птушку і пайшоў на луг. Там разбегся і падкінуў Коршака ўверх. Той зрабіў колькі ўзмахаў крыламі й апусціўся долу. Хлопчык паўтарыў практыкаванне. Коршак праляцеў метраў з пяць. З той пары хлопчыкі кожны дзень вучылі яго лётаць. Іх вучань быў надзіва здольны — праз два тыдні ўжо мог падымацца ў неба самастойна: зробіць круг і ўпэўнена сядае на руку або плячо Шурыка ці Іванкі. За навуку Коршак хутка аддзячыў хлопчыкам.

Аднойчы ў цёплы сонечны дзень Шурык з Іванкам ляжалі на лузе і загаралі. Валя каля кустоў збірала кветкі. Раптам пачуўся трывожны клёкат Коршака, які сядзеў на бярозе. Яны азірнуліся: усё было спакойна. Але Коршак не супакойваўся. Ён сарваўся з дрэва і паляцеў да Валі. Там, злажыўшы крылы, упаў у траву і пачаў некага кляваць. Калі хлопчыкі падбеглі да Валі, то ўбачылі, што Коршак змагаецца з гадзюкай. Кіпцюры яго ўпіліся ў тулава змяі, а тая кідалася і спрабавала ўкусіць птушку за галаву. Але Коршак падстаўляў пад смяротныя ўкусы крылы, тоўстае пер'е якіх надзейна ахоўвала, а дзюбай працягваў наносіць трапныя ўдары. Гадзюка нарэшце прутка здрыганулася ў апошні раз і заціхла, але жаўтлявы кончык яе хваста

працягваў дробна віляць. Коршак радасным клёкатам адзначыў сваю перамогу і пачаў ласавацца сваёй небяспечнай здабычай.

Напалоханая Валя прыціснулася да брацiка.

— Не бойся, — супакоіў сястрычку Шурык. — Калі што — Коршак і ў наступны раз цябе абароніць!

Тым часам наступіла восень. Коршак ужо начаваў на яблыні. Ён сам навучыўся здабываць сабе ежу. Але аднойчы не прыляцеў на начлег. Хлопчыкі абышлі ўсё наваколле, клікалі птушку, толькі ж іх любімец не з'явіўся. Браты плакалі, а Валя ліла слёзы ў тры ручаі.

Прайшоў год. Шурык у канцы верасня збіраў грыбы. Забрыў на Маяк. Восень падарыла дрэвам прыгожую рознакаляровую вопратку. Адно магутны дуб, на якім калісьці было коршакава гняздо, стаяў у сваім ранейшым ярка-зялёным убранні. Хлопчык падняў галаву і крыкнуў:

— Коршак! Коршак!

Раптам пачуўся шум магутных крылаў, і Шурык убачыў, як вялізная шэрая птушка ляціць проста на яго. Ад страху ён аж вочы заплюшчыў, і тут яму на плячо якраз і сеў... Ну пэўна ж Коршак! Хлопчык павярнуў галаву — так, гэта быў ён, яго любімец. І ўжо не мінулагодны падлетак, а сапраўдная цар-птушка ў росквіце сіл.

— Коршак, ты не забыў мяне, — расчулена прашаптаў хлопчык і пагладзіў свайго сябра. — Малайчына!

Коршак адазваўся здаволеным клёкатам. Якія толькі ласкавыя словы не казаў яму Шурык, а Коршак, схіліўшы галаў набок, уважліва слухаў яго. Потым, узмахнуўшы крыламі, ён ўзляцеў — зрабіў круг у паветры, пранізліва крыкнуў на развітанне і паляцеў на балота. Хлопчык махаў яму рукой, пакуль той і не знік з вачэй.

Больш Шурык не бачыў Коршака. Адно часам у сне ён лётаў над роднымі мясцінамі побач з прыгожай вялікай птушкай — і быў самы шчаслівы ад усіх.

# ТЯСЯЧА ПЕРШЫ СПОСАБ ЛОЎЛІ ШЧУПАКОЎ

Ужо тыдзень, як пачаліся летнія канікулы, але з-за дажджу Іванка ніяк не мог здзейсніць доўгачаканую задумку — пайсці на рыбалку. Нядаўна бацькаў сябра расказаў, як з дапамогай звычайнага сіла ён насцёбаў паўмяшка шчупакоў. У хлопчыка аж вочы загарэліся ад захаплення. Трэба абавязкова паспрабаваць гэты спосаб!

І ён тут жа ўзяўся за справу. Зрэзаў гнуткае арэхавае вудзільна. Знайшоў кавалак меднага дроту, зрабіў з яго сіло і прывязаў да канца вудзільна. Снасць гатова! Засталося выпрабаваць яе ў дзеянні. Але тут, як на злосць, задажджыла. Кожны дзень, прачнуўшыся, хлопчык бег да акна і бачыў адно і тое ж: зацягнутае шэрымі хмарамі неба і бясконцы дождж.

Затое сёння раніцай, калі ён выбег на ганак, над гаем яскрава зіхацела сонейка. Ура! Узрадаваны, хлопчык хуценька папіў малака, схапіў лусту хлеба, свіснуў свайго сабаку Букета, ўзяў вудзільна з сілом

і пайшоў на рэчку. Сцяжынка віляла між кустоў вербалозу. Хлопчык выпадкова зачапіў галінку, і яму за каўнер пырскнулі халодныя кроплі ўчарашнягя дажджу. Б-р-р!.. Аж перасмыкнуў плячыма.

Птушкі наўкола весела спявалі, радуючыся сонечнаму ранку. Нават дзесьці яшчэ цехкаў салавей, забыўшыся, што ноч ужо прайшла. Іванка сёлета скончыў трэці клас, і яго цікавіла ўсё, што адбывалася наўкола. Вось шумна залопалі крыламі — узняліся ў паветра дзве вялікія птушкі. Іх падняў Букет. Цецеручны вывадак.

Недзе тут побач знаходзіцца запаветная паляна, якую хлопчыку паказаў бацька. Трэба глянуць на яе... Кусты раступіліся.

Іванка застыў, як зачараваны: сотні каштоўных камянёў зіхацелі на траве і кветках, пераліваючыся ўсімі колерамі вясёлкі. Як быццам ён трапіў у скарбніцу Алі-Бабы! Вось побач — гарыць рознакаляровымі іскрамі цудоўны дыямент. Хлопчык працягнуў да яго руку — і на далоні расплылася кропелька вады. Ды гэта ж звычайная раса! А ўсё роўна прыгожа.

Вось і яны, качанкі... Ужо расцвілі! Прыгожыя жоўтыя кветкі на высокіх сцяблінках усміхаліся хлопчыку. Не простыя кветкі, і сустракаліся яны толькі ў гэтым месцы. Калі Іванка аднойчы паказаў кветку настаўніцы, тая сказала, што гэта вельмі рэдкая расліна. Пярэсна еўрапейская. Яна занесена ў «Чыр-

вонную Кнігу», і яе трэба ахоўваць. З той пары хлопчык ніколі не ірваў гэтых кветак, якія бацька называў качанкамі (яны сапраўды нагадвалі невялікія жоўтыя качанчыкі), а толькі прыходзіў палюбавацца імі, і месца гэта нікому не паказваў.

Трэба спяшацца на рэчку. Іванка памахаў рукой дзівосным кветкам і пайшоў далей. Сцяжынка вывела яго на прырэчную лугавіну. Пад нагамі захлюпала вада. А вось і рэчка! Яна была невялікай, нават назвы сваёй не мела, але ж рыба ў ёй была. Берагі густа зараслі вербалозам і алешнікам, таму лавіць вудачкай тут не выпадала.

Іванка асцярожна, каб не трэснула аніводная галінка, падышоў да рэчкі й выглянуў з-за куста. Гэта была ягоная любімая мясціна. Тут заўсёды трапляліся шчупакі, якім, напэўна, падабалася грэцца ў вадзе пад сонечнымі промнямі. Ага! Адзін ёсць. Хлопчык заўважыў паміж водарасцямі прадаўгаватага рачнога драпежніка. Ён стаяў галавой супраць плыні, ледзь варушачы плаўнікамі. Рыбіна нагадвала ўзведзеную стралу, гатовую ў любы момант сарвацца з месца. Таму трэба было не марудзіць. Хлопчык асцярожна апусціў сіло ў ваду і пачаў падводзіць да хваста рыбіны. Але, як толькі сіло наблізілася, шчупак зрабіў няўлоўны рух і на месцы, дзе ён толькі што быў, засталося воблачка каламуці. Эх, не пашанцавала!

Потым Іванка заўважыў яшчэ аднаго шчупака. І зноў, як толькі сіло наблізілася да хваста рыбіны, яна імгненна знікла. Трэцяга шчупака спужаў Букет, калі з шумам і трэскам выскачыў з кустоў. Што за невязенне! Можа, бацькаў сябра пажартаваў?..

Неўзабаве хлопчык падышоў да мясціны, якая называлася «Крыніцай». Высокія алешыны стваралі над вадой сапраўдны шацёр, і ў гэты куток не даходзілі сонечныя промні. Вада тут была вельмі халодная, бо дзесьці на дне білі ключы. Звычайна Іванка лавіў у гэтай «лядоўні» ментузоў. Іх яшчэ называюць калекамі. Днём яны хаваліся пад карчамі. Лавіў простым і надзейным спосабам — рукамі.

Ён скінуў кашулю і залез у ваду. Ногі аж зайшліся ад холаду, а ўсё цела пакрылася «гусінай скурай». Хлопчык падышоў да першага карча, нахіліўся і запусціў руку па самае плячо пад бераг. Пуста. Падышоў да другога карча. Рука намацала ў вадзе слізкае і халоднае тулава. Хацелася выхапіць руку, але Іванка перасіліў сябе. Ягоныя сябрукі не адважваліся лавіць рыбу такім спосабам, бо, калі рука натыкалася ў вадзе на нешта жывое, яны лямантавалі: «Вужака!» — і з віскатам выскоквалі на бераг. Іванка быў не з баязлівых. І гэты раз ён ласкава пагладзіў рыбіну пальцамі, і ёй як быццам гэта спадабалася, бо спакойна стаяла на месцы. Рука хлопчыка паступова рухалася да галавы калекі. Трэба абавязкова знайсці жабры, інакш

вырвецца. Нарэшце Іванка ўхапіў калеку за жабры й выкінуў на бераг. Добрая рыбіна! Чорная, як галавешка. Хутка трапілася яшчэ адна. Пад наступным карчом рука хлопчыка намацавала нешта валасатае. Не паспеў ён зразумець, што гэта такое, як яму ў палец упіліся чыесці зубы. Іванка выхапіў руку з вады. На пальцы вісеў вадзяны пацук. Ён страсянуў яго і выскачыў на бераг. З пальца цякла кроў, было балюча і страшна. Хлопчык заплакаў. Верны Букет падбег да яго, зазірнуў у вочы, лёг побач і пачаў залізваць рану. Калі кроў перастала сачыцца, Іванка супакоіўся і падышоў да вады, каб сарваць гнуткую лазіну, на якую наніжа рыбу. Ён кінуў позірк на ваду і... застыў: побач з берагам каля карча стаяў шчупак. І не просты шчупак, а значна большы за тыя, што ён сёння бачыў. Іванка на дыбачках схадзіў па вудзільна. «Паспрабую завесці сіло з галавы», — вырашыў ён.

Рыбіна як быццам і не заўважала сіла, якое паступова ахоплівала яе галаву. Хлопчык умомант ірвануў вудзільна ўверх — і шчупак забіў хвастом у траве. Нарэшце! «Цяпер я ведаю ў чым сакрэт: трэба заводзіць сіло з галавы, а не з хваста. Зараз трымайцеся, шчупакі!» — радаваўся Іванка. Наперадзе ўсё лета, а сёння — трэба ісці дадому. Хлопчык нанізаў рыбу на лазіну і ўзважыў у руцэ. Добры ўлоў атрымаўся. Знатная сёння будзе вячэра! Задаволены, Іванка пабег дамоў.

# ГРЫШКА

Стаяў чэрвеньскі надвячорак. Мы з сябрамі гулялі ў футбол. З пашы вось-вось прыгоняць статак. Сонейка лашчыла нас апошнімі пяшчотнымі ды ўжо не спякотнымі промнямі. Раптам — адкуль яна і ўзялася? — насунулася шэра-свінцовая хмара. Падняўся вецер, трывожна зашапацелі вершаліны дрэваў. Па дарозе пагнала пыл, закручваючы яго віхрамі, падымаючы пад аблокі лісцё і салому. Пастухі хутка гналі статак, і каровы з трывожным мычэннем беглі да сваіх двароў. Мы з хлопцамі паўцякалі па дамах. Маланка раскраіла цёмны абшар неба надвое. Праз хвіліну ўдарыў такі пярун, што я аж прысеў ад нечаканасці. У хаце пагасла электрычнае святло, і толькі бліскавіцы маланак безупынна асвятлялі неба, на якім чароды хмараў вялі між сабой сапраўдную бойку. Па шыферу гулка забарабаніла.

— Град!.. — спалохана запрычытала бабуля. — Паб'е ўсе пасевы!

Сапраўды, буйныя, з вішню, градзіны залпам нябеснай карцечы ўдарылі па раслінах, ламаючы й калечачы іх...

І недзе гадзіны праз дзве стыхія супакоілася.

Раніцай свяціла сонейка, але людзі не радаваліся. Жанчыны плакалі, гледзячы на бульбоўнік, на пасечанае градам пер’е цыбулі, на ўплясканую ў гразь расаду памідораў і капусты. Стыхія парвала лінію электраперадач, знесла дах з калгаснай фермы, паламала дрэвы.

У суседняй вёсцы на старой бярозе было буслінае гняздо. Кожную вясну з выраю туды прылятала пара буслоў. Яны рамантавалі сваё жыллё і выводзілі птушанят. Вось і сёлета трое буслянят з раніцы да вечара клекаталі яшчэ чорнымі дзюбкамі, патрабуючы ежы. І бацькам прыходзілася насіць ім жаб, рыбу, мышэй і нават вужак.

А ў час учарашняй буры сук, на якім было гняздо, зламаўся. Старыя буслы паспелі ўзляцець, а птушаняты зваліліся. Адно бусляня адразу загінула, а двое павіслі на электрычных правадах. Яны так жаласна крычалі, што з суседніх дамоў прыбеглі людзі й знялі іх.

— Тата, давай з’ездзім паглядзець буслянят! — папрасіў бацьку.

Тата завёў свой старэнькі «Опель», і мы паехалі. І што ўбачылі? Бусляняты панура сядзелі пад хатай. У іх вочках чыталіся боль і бездапаможнасць. Тата схіліўся і асцярожна абмацаў птушанят.

— У аднаго зламана крыло, у другога — нага, — сказаў ён. — Патрэбна дапамога ветэрынара.

— Татачка!.. Іх трэба выратаваць! — узмаліўся я.

— Добра, не пакінем у бядзе, — запэўніў мяне бацька.

Мы заслалі багажнік машыны анучамі, паклалі буслянят і паехалі ў райцэнтр. Там заатэхнік з сівізной у валасах і добрымі вачыма налажыў птушанятам шыны на зламанае крыло і нагу.

— Бусляня са зламаным крылом ачуняе, а вось з другім — справа кепская. Акрамя зламанай нагі ён, напэўна, ад удара мае ўнутраныя пашкоджанні... Наўрад ці выжыве. Каб быў заапарк, то, можа, і знайшліся б патрэбныя спецыялісты, а мы лечым кароў ды свіней. Так што, выбачайце...

Мы вынеслі птушанят да машыны. Над дваром ветучастка з трывожным клёкатам кружыла пара буслоў.

— Цуд ды й годзе! — сказаў пажылы ветэрынар. — Калі тут тыя буслы лёталі. Напэўна, гэта іх бацькі. Але як жа яны іх знайшлі за пятнаццаць кіламетраў ад роднага гнязда?..

З той пары ў нас з сябрамі прыбавілася клопатаў. Трэба было здабываць ежу для птушанят. Раніцай на возеры мы лавілі карасёў і неслі буслянятам на сняданак. Але з рыбай шанцавала не заўсёды. Тады даводзілася лавіць жаб.

Праз тры дні адно з буслянят сканала... Пахавалі яго пад старой бярозай, дзе калісьці было яго

роднае гняздо. І зноў над гэтым месцам доўга кружыла пара буслоў...

Затое бусляня, якога мы назвалі Грышкам, хутка ачуняла і прывыкла да людзей. Як толькі Грышка бачыў чалавека, хутка падбягаў на цыбатых нагах, нешта рыпеў на сваёй мове і хапаў дзюбай за калашыны, патрабуючы ежы. Аднойчы хтосьці з дарослых кінуў яму мятровага вужа, і галодны Грышка паспрабаваў яго тут жа праглынуць, але вуж не ўмясціўся ў страўніку. Хвост тырчэў з дзюбы... Бусел, як мы падумалі, мог задыхнуцца. Я пабег прасіць тату, каб ратаваў бусла. Тата раскрыў небараку дзюбу і выцягнуў вужа. Але Грышка зноў спрабаваў схапіць сваю здабычу. Тады тата лапатай перасёк вужа на кавалкі, і бусел паласаваўся на славу.

Прыйшоў час, і мы знялі шыну з пашкоджанага крыла. Тата сказаў:

— Будзем вучыць Грышку лётаць!

Ён ўзяў бусляня і падкінуў уверх. Грышка зрабіў колькі ўзмахаў крыламі й мякка апусціўся тату на рукі. Заняткі працягваліся колькі дзён. Нарэшце тата вынес суровы прысуд:

— Лётаць Грышка не зможа, бо косці крыла зрасліся няправільна...

Я адвярнуўся, каб тата і сябры не бачылі маіх слёз. Як жа так? Птушка ж створана для палёту.

Чалавек зайздросціць птушкам больш, чым іншым істотам. Людзі могуць плаваць, амаль, як рыбы; поўзаць, амаль як вужы; лазіць па дрэвах не горш за малпаў, а вось лётаць не навучыліся. Самалёты, верталёты, нават дэльтапланы ў залік не ідуць. Лётаць, адчуваючы тварам напружаную прасціну паветра і разам з тым водар кветак. Лётаць, лёгкім напружаннем мускулаў мяняючы накірунак палёту. Лётаць, цалуючы аблокі, усміхаючыся сонейку. Толькі такое адчуванне можна назваць сапраўдным палётам. Тата казаў, што людзі калісьці ўмелі лётаць, і толькі зрэдку, у сне, мы можам адчуць гэтае шчасце. Бедны Грышка, паветра не яго стыхія! Я абняў Грышку, а ён нешта рыпеў мне на сваёй мове, нібы супакойваючы.

Лета заканчвалася. Бусляняты з іншых вывадкаў ужо ўпэўнена лёталі — рыхтаваліся да доўгай дарогі ў вырай. А што будзе з Грышкам? Нам жа хутка вяртацца ў Мінск. Тата часта вывозіў Грышку на балота, каб навучыць здабываць ежу. І гэты раз бусел спачатку прыглядзеўся, а потым тыцнуў дзюбай у ваду і выцягнуў невялікае жабянё. Мы з татам былі ў захапленні: як жа — першая самастойная здабыча! Але Грышка, вылавіўшы жаб вакол сябе, не стаў есці далей, а вылез на бераг.

— Дрэнныя з нас, сынок, настаўнікі, — сказаў тата. — Толькі бацькі могуць навучыць сваіх птушанят паляваць. Прыйдзецца нам забраць Грышку з сабой.

Мы падрыхтаваліся да доўгай дарогі. Назапасілі каля двух дзесяткаў жаб, зрабілі Грышку ў багажніку мяккае гняздо. Ён ужо прызвычаіўся там ездзіць: падгінаў свае цыбатыя ногі, садзіўся на іх і заціхаў. Раніцай мы паехалі. Некалькі разоў спыняліся, выводзілі Грышку пагуляць і кармілі яго. Прыехаўшы ў Мінск, адразу накіраваліся ў чыжоўскі заапарк. Там пагадзіліся забраць бусла. Мы занеслі птушку ў зараслі трыснёгу і выпусцілі.

— Гэта будзе ягоная тэрыторыя, — сказала нам загадчыца аддзела птушак. — Дарэчы, пасля той страшнай буры нам прынеслі чатырох буслоў з рознымі пашкоджаннямі. Ваш Грышка будзе пятым.

— Бывай, Грышка... Мы яшчэ да цябе прыедзем, — сказаў я, абдымаючы на развітанне свайго гадаванца.

Пачалася вучоба. Я не мог дачакацца канца тыдня, каб наведаць Грышку. Знайсці жаб у Мінску немагчыма. Тата купіў мяса, і ў нядзелю мы паехалі ў заапарк. Там каля возера хадзілі пяць буслоў. Для іншых людзей яны ўсе былі падобныя, але свайго любімца я адрозніў бы з тысячы іншых.

— Грышка! — паклікаў я і памахаў пакункам з мясам. Ён азірнуўся, радасна зарыпеў і кінуўся да нас з татам. Мы яго ўволю накармілі, пачаставалі й іншых буслоў. Грышка праводзіў нас да самай агароджы. Ён парываўся пайсці з намі...

Я тады не ведаў, што бачу яго ў апошні раз. Калі праз два тыдні мы зноў прыехалі наведаць Грышку, супрацоўнікі заапарку паведамілі нам, што кампанія падлеткаў забаўлялася тым, што кідала камяні ў птушак. Яны забілі чатырох буслоў. Сярод іх быў і Грышка...

## СМЕРЦЬ СЯСТРЫЧКІ

Іванка пайшоў на луг. Настаўніца загадала за лета намаляваць як мага больш матылёў, якія сустракаюцца ў нашай мясцовасці. А каб намаляваць, трэба іх добра разгледзець. Капусніцу, паўлінава вока і крапіўніка хлопчык ужо намаляваў — яны сустракаліся на кожным кроку. А сёння Іванка заўважыў вялікага і прыгожага матыля, якога ён раней ніколі не бачыў. Але, як толькі хлопчык набліжаўся, матыль пералятаў у другое месца. Вось ён сеў на рамонак. Хлопчык папоўз да кветкі, стрымліваючы дыханне. Толькі б не спужаць! Матыль спакойна сядзеў на кветцы, паводзячы сваімі вусікамі. Але крыллі яго былі закрытыя.

— Раскрый крыльцы, — прашаптаў Іванка.

І матылёк, нібы пачуўшы просьбу хлопчыка, паволі разгарнуў свае пялёсткі. Што за прыгажосць! Сярэдзіна крыльцаў была з чорнага аксаміту, затым ішла шырокая чырвоная стужка, белыя плямы й блакітнае абрамленне. А колеры такія яркія, што іх немагчыма перадаць аніводнымі фарбамі.

Іванка ўспомніў, што малюнак гэтага матыля ён бачыў у кнізе, якую ім паказвала настаўніца. З-за сваёй чырвонай стужкі ён завецца «адміралам», і вельмі рэдка сустракаецца ў нашай мясцовасці. «Адмірал», пакрасаваўшыся перад хлопчыкам, паляцеў далей. А вось гэтага матыля з чорнымі крыламі, абведзенымі белай паласой, Іванка не любіў, і нават палохаўся, хоць той і быў вельмі прыгожы. Называўся ён «жалобнік», і бабуля казала, што сустрэча з ім прадракае гора.

Раптам Іванка пачуў з боку дома дзічячы плач і лямант. Дома заставалася тры яго малодшыя сястрычкі. Першакласніца Вера наглядала за малодшымі Нінай і Аняй. Бацькі былі на рабоце. Відаць, нешта здарылася. Хлопчык паімчаўся дамоў. На двары ён убачыў, што малодшая чатырохгадовая Анечка ляжыць з заплюшчанымі вачыма і не дыхае. Вера наўзрыд плача, а пяцігадовая Ніна тузае Анечку за руку і кажа:

— Уставай!.. Уставай!

— Што здарылася? — дрыжачым голасам спытаўся Іванка.

— Мы гулялі ў хованкі, бегалі, — з плачам адказала Вера. — Аня зачапілася за корань дрэва і павалілася. У роце яна трымала морквіну і, напэўна, ёй падавілася.

Хлопчык раскрыў роцік Анечкі. Нічога не было бачна. Трэба дапамога! Недалёка жыў дзядзька

Пеця. Іванка пабег да яго. Сэрца выскоквала з грудзей — так хутка ён ніколі не бегаў. Толькі б дзядзка быў дома! Каля яго хаты стаяў запрэжаны конь. Дзядзька быў на двары.

— Ратуйце, дзядзя Пеця...Там Аня памірае!

Дзядзька не стаў доўга распытваць — скочыў на брычку, крыкнуў Іванку:

— Залазь хутчэй і трымайся! — узмахнуў пугай, і конь паімчаў спачатку рыссю, а потым шалёным галопам.

Людзі разбягаліся з дарогі, а конь, пакідаючы за сабой клубы пылу, ляцеў у суседнюю вёску. Каля фельдшарскага пункту дзядзька рэзка затармазіў, кінуў лейцы Іванку. Праз мінуту дзядзька выбег разам з жанчынай у белым халаце з медыцынскай сумкай. Яны ўскочылі на брычку і такім жа шалёным аллюрам паімчалі назад. Калі спыніліся ля Іванкавай хаты, конь задыхаўся, а з яго мокрых бакоў ападалі камякі белай пены.

Доктарка схілілася над Анечкай, паспрабавала рабіць штучнае дыханне, зазірнула ў рот, памацала пульс, потым устала і вымавіла кароткае і страшнае слова:

— Позна...

На наступны дзень былі хаўтуры. Ранак выдаўся сонечным, спявалі птушкі. На двары і ў хаце сабраліся

родныя, знаёмыя, суседзі. Прыйшлі ўсе Іванкавы сябры. Святар скончыў развітальную службу.

Анечка ляжала на куце ў новай прыгожай сукенцы, у яе ільняныя валасы былі ўплецены блакітныя банцікі. Шчочкі былі ружовыя, толькі губы пасінелі. Падышла пара развітання. Уся ў чорным, спустошаная страшэнным горам, з выплаканымі за ноч вачыма, да сваёй малодшай дачушкі падышла маці. Яна схілілася над Анечкай і нізкім грудным голасам, стрымліваючы рыданне, зацягнула:

— Мае дзеткі-галубочкі на лаўцы сядзяць,
на лаўцы сядзяць ды не хочуць спаць.
Толькі Анечка-дачушка на куце ляжыць,
на куце ляжыць ды салодка спіць.

Пачалі ўсхліпваць і сморкацца ў насоўкі кабеты, якія тоўпіліся наўкола. Да Іванкі яшчэ не даходзіла, што сястрычка памерла, але нейкі незразумелы холад сціснуў маленькае сэрца. А голас маці працягваў страшную апошнюю калыханку:

— Што ж не ўстанеш ты, мая кветачка?
Да цябе прыйшлі сябры-дзетачкі —
хочуць, каб пайшла з імі ты гуляць.
Уставай, Анечка, хопіць доўга спаць.

Іванка глянуў на бацьку. Ён аніколі яшчэ не бачыў, каб той плакаў. Але зараз па яго шчоках цяклі слёзы. Маці зацягнула больш высокім голасам, які ўжо не мог стрымаць рыданняў:

— Толькі зорачка мая не прачынаецца
і ўставаць яна не збіраецца,
бо сабралася дачушка ў дальнюю дарогу.
А гэтая дарога — да самога Бога.

Іванка зразумеў, што смерць — гэта назаўсёды, што ягоная сястрычка больш ніколі не абдыме яго сваімі маленькімі ручкамі ды не скажа, смешна картавячы:

— Блацік, пакалысы мяне!

Ёсць нейкая цёмная і жорсткая сіла, ад якой не могуць уратаваць нават дарослыя. Маці працягвала галасіць:

— Дык будзь жа ёй, святы Божанька, ды заместа таткі,
а Прасвятая Багародіца — ды заместа маткі,
бо грахоў жа яна яшчэ не нарабіла
і на свеце белым толькі чатыры гадочкі пражыла...

Хлопчык кінуўся да Анечкі, абняў яе і, калоцячыся ўсім целам, заліўся гаручымі слязьмі.

# ЛЕТНІ ДЗЕНЬ У КРАІНЕ ДЗЯЦІНСТВА

Сёння з раніцы было горача і душна. Над дарогай калыхаліся размытыя струмені нагрэтага паветра. Зямля на месцы высахлых лужын была парэпаная, нібы бабуліны далоні. Лістота задыхалася ад пылу. І хоць на небе не было аніводнага воблака, бабуля ўпэўнена сказала:

— Будзе дождж!.. А ён так патрэбны, бо на агародзе ўсё пасохла.

Сапраўды, пасля абеда падзьмуў лёгкі ветрык, сонца закрылі хмары, сярдзітым басам прабурчаў гром, бліснула маланка — і лінуў цёплы грыбны дождж. Іванка з сябрамі Шурыкам, Валодзем і Міколкам бегалі па лужынах і весела крычалі:

— Дождж, дождж, секані —
я паеду на кані!
Дождж, дождж, перастань —
я паеду на Растань!

Па целе і тварах хлопчыкаў цяклі струнькі вады, ногі былі па калена ў гразі, але вочы свяціліся ад

захаплення. Гэта ж такая асалода, лепей усялякага душа! Да таго ж, кажуць, што ад такога дажджу растуць не толькі грыбы, але і дзеці.

Хутка дождж скончыўся. Дрэвы красаваліся сваёй чысцінёй. Травінкі й кветкі, прыгнутыя да зямлі, горда распрамляліся. Як жа лёгка, на поўныя грудзі, дыхалася ў гэтыя хвіліны!

У небе над гаем з'явілася вясёлка. Можа, яе назвалі так таму, бо калі любуешся гэтым сямікаляровым цудам, на душы становіцца хораша і весела. Нездарма ж маці казала, што вясёлка — гэта мост паміж Богам і чалавекам. Вось бы прабегчыся па гэтым мосце і залезці на самае неба!

Хлопчыкі пашыбавалі да канавы. Вада на мелкаводдзі пасля дажджу была каламутная, але на большай глыбіні ўсё было добра бачна.

Звычайная канава, якая ўпадае ў сажалку, а колькі ў ёй цікавага! Міколка заўважыў нешта ў траве і закрычаў:

— Мальцы, сюды!

Яны падбеглі. Каля вады сядзела маленькае жабянё... з хвастом. Такога дзіва яны яшчэ не бачылі.

— Дык гэта ж наш апалонік вырас! — здагадаўся Шурык.

З самай вясны хлопчыкі назіралі, як з жабінай ікры вылупліваліся маленькія апалонічкі. Потым

яны пачалі падрастаць, некалькі дзён таму ў некаторых з'явіліся лапкі, а цяпер вось — новае пераўтварэнне...

Валодзя ўзяўся за хвосцік... Дзіва, хвосцік застаўся ў яго руцэ, а жабянё скокнула ў траву. Хлопцы засмяяліся. Цікава!

Шурык з Іванкам былі стрыечнымі братамі, бабуля ў іх была адна і любіла іх аднолькава моцна. Яны ўспомнілі, што яна заўтра збіраецца выпякаць хлеб і трэба нарваць аеру. Звычайна, калі печ была выпалена, бабуля выграбала вуголле, засцілала чарэнь аерам, на які саджала круглякі цеста. І неўзабаве смачны хлебны пах прасочваўся нават на вуліцу, казытаў у носе і прымушаў хлопчыкаў глытаць слінкі. Яны не маглі дачакацца, калі хлеб будзе вынуты, пакладзены на стол і споверх засланы чыстым абрусам, а ім — адрэжуць па добрай лусце. І гэтая цёплая луста духмянага хлеба была самым смачным ласункам! На ніжняй скарынцы заставаліся палоскі ад аеру, а дзе-нідзе трапляліся кавалачкі прысохлых лісцінак, што апетытна хрумсцелі на зубах. У бабулі летам нават каля парога замест палавіка быў пакладзены ахапачак аеру, ад якога ў хаце пахла свежасцю.

Хлопчыкі залезлі ў сажалку і пачалі рваць зялёныя пікі аеру. Але спачатку яны вырашылі паласавацца. У сярэдзіне тоўстай і сакавітай сцябліны знаходзіцца светла-зялёная палосачка, прыемная на смак. Сябры елі гэты ласунак, пакуль не забалелі жываты.

З ахапкамі аеру яны вылезлі на бераг. Іванка заўважыў, што ў нагу яму ўпілася п'яўка. Ён не спужаўся, але папрасіў Валодзю збегаць па запалкі, бо ведаў, што п'яўку трэба не аддзіраць, а прыпаліць, каб яна адвалілася. Як жа закруцілася чорнае тулава п'яўкі, калі да яе паднеслі агонь! Потым яна здрыганулася ў апошні раз і адвалілася. Хлопчык растаптаў яе нагой — не любіў ён гэтых мярзотных стварэнняў, якія пілі кроў, нібы вампіры.

Шурык заўважыў у вадзе вялікага чорнага жука-плывунца. Гэта сапраўдны драпежнік: нападае на апалонікаў і маленькіх рыбак, а ўжо калі цапне за палец, дык мала не пакажацца!

— Мальцы, глядзіце... Пятруха! — сказаў Міколка.

Так яны звалі суседскага Генку, які быў маладзейшы за іх на два гады. Вызначаўся іх сусед тым, што разбураў птушыныя гнёзды й забіраў прыгожыя яечкі, за што сябры яго не раз лупцавалі. Але сваіх шкодлівых звычак ён не пакідаў. Шурык узмахам рукі падазваў сяброў, і яны аб чымсці пашапталіся.

— Вой, які жук, ніколі такога не бачыў! — закрычаў Іванка.

— Дам цукерку таму, хто яго зловіць, — сказаў Шурык.

— Дзе жук, дзе? Пакажыце мне, — да іх тут жа падбег Генка.

— Вунь, каля таго карча, — паказаў Валодзя. — Ты што, хочаш злавіць яго? Дзе табе!

— Я змагу... Я спрытны і ўваротны! — важна заявіў Генка і залез у сажалку. Ён наблізіўся да карча, нахіліўся, падвёў руку — і радасна закрычаў: — Ура!.. Ёсць! Я злавіў яго! — Але тут жа яго вясёлы крык перайшоў на лямант: — А-а-а! Ён кусаецца! — Генка з плачам адарваў жука ад пальца, шпурнуў яго ў ваду, сунуў палец у рот і, усхліпваючы, пабег дамоў.

— Будзеш ведаць, як птушыныя гнёзды разбураць! — крычалі яму ўслед хлопчыкі.

Шурык з Іванкам развіталіся з сябрамі, сабралі аер і панеслі яго да бабулі.



# ДРЭВЫ ПОМНЯЦЬ

Чвэрць стагоддзя кожную раніцу я іду на працу ў сваю родную школу праз сквер, які раскінуўся на перакрыжаванні вуліц Дзекабрыстаў і Парашутнай. Гэтае месца прыгожае ў любую пару года. Летам сквер звініць ад дзіцячых галасоў, маладыя маці гуляюць тут са сваімі дзеткамі. У цяню дрэў прыемна пачытаць кнігу альбо пагутарыць у той час, калі тваё немаўля соладка спіць у калясцы, залюлянае пагодвайннем таполяў і бяроз. А калі расцвітаюць ліпы, дык здаецца, што можна піць гарбату і ўпрыкуску з гаючым мядовым водарам, якім напоена ўсё наваколле.

У верасні чараўніца-восень бярэцца за фарбы, і дрэвы апранаюцца ў барвовую і бурштынавую святочную вопратку. Тады зноў у скверы весела: вучні нашай школы займаюцца тут бегам і здаюць спартыўныя нарматывы.

Сумна становіцца ў канцы кастрычніка, калі калючы вецер ганяе апалае лісце, і дрэвы стаяць задумёныя ў чаканні хуткай зімы. І прыходзяць тады думкі аб сваім лёсе: колькі яшчэ адмерана на гэтым свеце і

што застанецца пасля таго, калі цябе, як самотны кляновы лісток, забярэ ў тваё апошняе прыстанішча маці-зямля...

Але сквер не доўга сумуе. У снежні ён напаўняецца птушынымі спевамі: з поўначы да нас прылятаюць амялушкі — чубаценькія жоўтагрудыя птахі. Яны весела чыўкаюць, чародкамі пералятаючы з дрэва на дрэва, і ласуюцца ліпавым насеннем ды гронкамі арабіны. Зрэдку чуецца стук дзятла. А ў лютым здараецца так, што, пачуўшы ціўканне незнаёмых птушак, глянеш уверх і замрэш зачараваны: у заснежаным голлі таполяў яркімі пунсовымі ружамі квітнеюць прыгажуны-снегіры. І стаіш у захапленні, баючыся спужаць цудоўных птушак, і ў застылай душы цяплее ад гэтага хараства. І так хочацца, каб нашыя ўнукі й праўнукі змаглі пабачыць цуд матулі-прыроды, што знаходзіцца недзе ўсяго за два прыпынкі ад цэнтра Мінска.

Вясной галінкі дрэў набухаюць клейкімі пупышкамі. Як прыемна тады перад урокамі пасядзець колькі хвілін на сонейку, слухаючы спеў шпака, які толькі што прыляцеў з далёкіх краёў і, не паспеўшы перайсці на родную мову, спявае па-іншаземнаму. Шпак — вялікі перасмешнік, і можна толькі здагадвацца, якіх заморскіх звяроў і птушак ён перадражнівае. І думаецца тады па-вясенняму: хочацца жыць, працаваць і пакінуць пасля сябе нейкі след на зямлі...

Цяпер ужо мала хто ведае, што гэты сквер быў пасаджаны ў 1937—38 гадах вучнямі нашай трэцяй школы, у тых самых трагічных для народа гадах. За два гады яны пасадзілі больш сотні дрэў, даглядалі, палівалі іх. Праз тры гады грымнула вайна... Выпускнік нашай школы 1940 года Уладзімір Сцяпанавіч Вальковіч успамінае: «22 чэрвеня 1941 года мы з сябрамі былі на адкрыцці Камсамольскага возера. Было цудоўнае надвор'е, людзі загаралі, купаліся. У 12 гадзін па радыё перадалі выступленне Молатава аб тым, што на нас напала фашысцкая Германія...»

Дрэвы, дрэвы, дзе ваша памяць? У глыбіні магутных стваловаш вашы першыя гадавыя кольцы захоўваюць цяпло далоняў тых юнакоў і дзяўчат, якія вас пасадзілі. Вось гэтую бярозку пасадзіў Леў Геллер. У 1942 годзе ён быў забіты ў Мінскім гета...

Гэтую магутную таполю пасадзіў Ігар Емяльянчык. Ён загінуў у партызанскім атрадзе...

Цябе, прыгажуня-ліпа, пасадзіў Станіслаў Шварц. Ён загінуў смерцю храбрых 12 мая 1945 года ў Берліне...

Ты, елачка, пасаджана Ботвічам. Нават імя яго мы не памятаем, а ты помніш... Мы толькі ведаем, што ў 1943 годзе хлопец скончыў Тамбоўскае лётнае вучылішча. У тым жа годзе ў жорсткім баі яго самалёт быў збіты ў трыццаці кіламетрах ад горада Славянска...

А вось, побач са сцежкай, расце прыгажуня-бярозка. Мабыць, асколкам фашысцкай авіябомбы ў яе адсекла вяршыню. Але дрэва не загінула: тры ствалы белымі свечкамі ўздымаюцца з параненага месца. Яе, пэўна, пасадзіў Герой Савецкага Саюза Казімір Шабан.

23 чэрвеня 1943 года ён здзейсніў першы баявы вылет на Курскай дузе. 3 жніўня 1943 года яго самалёт быў падбіты ў паветраным баі. Але ён змог пасадзіць самалёт на тэрыторыі, акупіраванай ворагам. Белгарад, Ахтырка, Сумы, Лебядзін, Кіеў, Жытомір — этапы яго баявога шляху. Дзень Перамогі сустрэў у чэшскім горадзе Брно. 9 ліпеня 1945 года пры здзяйсненні вучэбнага палёту, спрабуючы выратаваць баявы самалёт, у якім загарэліся маторы, загінуў...

Гэтыя выпускнікі нашай школы не паспелі пабудаваць дом і нарадзіць дзяцей. Але яны аддалі сваё жыццё за Радзіму, за нас з вамі. За тое, каб у іх роднай школе больш ніколі не было нямецкай стайні.

Але кожны з іх паспеў пасадзіць дрэва. І цяпер з вышыні магутных таполяў і ліп яны, вечна юныя, пазіраюць на нас і шамаценнем галін пытаюцца:

— Людзі, вы нас помніце?

# МАДРЫД

*(Да партрэта майстра)*

Чытаю кнігу Альбіны Скарабагатчанка «Народная інструментальная культура беларускага Паазер'я». На вочы трапляецца абзац: «Заснавальнікам традыцый гармонікавага мастацтва быў Франц Енуковіч, які ўзяў сабе псеўданім «Мадрыд» (памёр у 80-я гады). Яго творчай асобай да сённяшняга дня захапляюцца ўсе, каму хоць раз пашчасціла чуць яго ігру. Сваёй рознабаковай дзейнасцю ён стварыў вобраз музыкі-універсала, які стаў своеасаблівым эталонам для ўсіх народных выканаўцаў. Яго інтэрпрэтацыі народнай музыкі сталі яркімі ўзорамі выканальніцкага майстэрства для падрастаючага пакалення маладых музыкаў».

Памяць машынай часу пераносіць мяне на сорак гадоў назад. Раённы цэнтр Чашнікі. Бацькі аддалі мяне, дзесяцігадовга вясковага хлапчука, у музычную школу па класу баяна. Музыка для мяне — асобны свет летуценняў, дабрыні ды яшчэ нечага такога, чаго нельга выказаць словамі. Калі я чую добрую ігру на любым інструменце, у душы нешта ўскіпае,

да горла падступае незразумелы камяк, і я адварочваюся, каб ніхто не бачыў маіх слёз. Жыву я ў маленькім пакойчыку на кватэры ў знаёмых. З Тулы мне прыслалі сапраўдны баян. Вечарамі я сумую без мамы, таты й меншай сястрычкі. Тады я бяру баян і ціхенька іграю «Перапёлачку»:

— Ты ж мая, тым ж мая, перапёлачка.
Ты ж мая, ты ж мая, невялічкая...

Я адчуваю сябе маленькай шэрай птушачкай, якую пакінулі бацькі. На чорны лак інструмента капаюць празрыстыя кроплі. Але хопіць рымзаць! Я ўжо вялікі. Пальцы заводзяць «Полюшка-поле», і я ператвараюся ў ваяра на гарачым кані, які хутка скача на бітву. Супакоены, я стаўлю баян у футарал і бяруся за любімыя кніжкі.

Сярэдзіна сакавіка. Па-сапраўднаму запахла вясной. На галінах бэзу клейкія зялёныя пупышкі асцярожна выглянулі на свет з зімовых схованак. Сёння сярод звыклага чыўкання вераб'ёў і пінкання сініц я ўпершыню пачуў новы голас. Глянуў уверх: пара чорных птушак выганяла са свайго законнага жытла нахабных вераб'ёў. Дык гэта ж шпакі прыляцелі!

Я іду пасля ўрока музыкі — нікуды не спяшаюся: хочацца падыхаць вясной. Бацькі даюць мне тры

рублі на расходы, таму я — чалавек не бедны. Заходжу ў невялічкую крамку. Бачу каробкі з прыцягальнай назвай «Журавіны ў цукровай пудры». Смачная рэч! Калі пакладзеш гэты белы шарык у рот і сціснеш зубамі, журавінка брызне ў паднябенне кіслым сокам, але цукровая пудра імгненна засыпле гэты кіслы пажар соладдзю, і гэтая рэзкая змена смаку дастаўляе найвялікшую асалоду. Але ж каштуе гэты смак цэлых сорак капеек! Я збіраю грошы на футбольны мяч, і яшчэ мне абяцалі прадаць з вітрыны кнігарні доўгачаканую кніжку Жака-Іва Кусто пра падводны свет, таму, павагаўшыся, купляю за шаснаццаць капеек сто грамаў «барбарысавых» карамелек і выходжу на вуліцу. Чую гукі гармоніка. Падыходжу бліжэй. Бачу невысокага каржакаватага чалавека з гармонікам. Інструмент пераліваецца перламутрам. Значыць — «любіцельскі», як у нас называюць самыя шыкоўныя майстровыя гармонікі. Каштуе такі інструмент аднолькава з каровай і лічыцца сапраўдным багаццем.

Музыка заплюшчыў вочы й сыграў чатыры першых акорды. Іх было дастаткова, каб маё маленькае сэрца правалілася ў нейкую бездань. У гэтых акордах была перасцярога і роспач, і гора, і крык: «Людзі, вайна!» Потым я чуў шмат ваенных маршаў, але па сіле ўздзеяння «Развітанне славянкі» Агапава можна параўнаць толькі са «Свяшчэннай вайной» Аляксан-

драва і «Днём перамогі» Тукманава, ды там палова ўздзеяння ўскладзена на вершы, а тут была толькі чыстая мелодыя.

Гарманіст зайграў у сярэднім рэгістры першую тэму. Музыка крычала: «Славяне! Браты й сёстры! На нас напаў смяротны вораг. Уставайце! На барацьбу!» Я азірнуўся. Вакол стаяла чалавек трыццаць. Падыходзілі новыя людзі. Тады я ўпершыню пачуў загадкава-прыцягальнае, сказанае з найвялікшай доляй павагі й захаплення: «Гэта ж — Мадрыд!»

Мадрыд у высокім рэгістры пачаў другое калена. І ў музыцы заплакалі жанчыны, якія праводзілі на вайну сваіх мужоў, сыноў, каханых. Сваім гаротным славянскім сэрцам яны адчувалі, што назаўсёды развітваюцца з самымі дарагімі людзьмі. Толькі музыка можа выказаць тое, што адчуваюць два закаханыя сэрцы, якія больш ніколі не ўбачаць адно аднае. Жанчыны выціралі хусцінкамі слёзы. Мужчыны глядзелі перад сабой, але нічога не бачылі: музыка вяла іх па франтавых дарогах на сустрэчу з загінуўшымі сябрамі.

Тут Мадрыд страсянуў галавой і ўрэзаў трэцюю частку. Загучалі фанфары. Музыка напаўняла сэрцы адвагай і рашучасцю: «Наперад, браты! Праўда — за намі. Мы пераможам!»

Апошні пераможны акорд вырваўся з-пад пальцаў музыкі й растварыўся ў натоўпе. Мадрыд стаяў, за-

плюшчыўшы вочы. Па шчацэ, якая колькі разоў канвульсіўна здрыганулася, прабегла скупая мужчынская сляза. Ён сыграў марш, у які ўклаў усё пачуццё свайго вялікага сэрца і аддаў гэтай музыцы ўсе душэўныя і фізічныя сілы. І музыка гэтая ўзрушыла людзей, прымусіла іх перажыць самыя горкія і радасныя моманты жыцця. Натоўп маўчаў. Жанчына падышла да Мадрыда, схіліла галаў у нізкім паклоне і пацалавала яму руку. Людзі ўзрушана загаманілі. Мужчыны абнялі музыку і некуды павялі.

— Хлопчык, чаму ты плачаш? Усё добра! — ласкава звярнулася да мяне адна з жанчын.

А ў мяне на сэрцы было хораша і чыста.

Потым я думаў: чаму Мадрыд? Чаму ён выбраў сабе гэты прыгожы й экзатычны псеўданім? Можа, ён быў ваяром інтэрбрыгад?

«Адкуль у хлопца іспанскі сум?» — цяпер складана адказаць на гэтае пытанне. Потым мне даводзілася слухаць геніяльных выканаўцаў. Я сядзеў на сцэне ў пяці кроках ад Святаслава Рыхтара, які выконваў Баха. Камерныя аркестры Співакова і Башмета ўзносілі маю душу ў іншае вымярэнне, дзе няма гора і смерці, і дзе нас чакаюць дарагія сэрцу людзі. Аркестр Дзюка Элінгтона адчыніў мне дзверы ў новую краіну музыкі, дзе няма строгіх рамак тэорыі, дзе ўладарыць Яе Вялікасць Імправізацыя. Але

самае моцнае першае ўражанне зрабіў на мяне просты гарманіст з Віцебшчыны — Мадрыд.

Нізкі паклон табе і вечная памяць, Музыка з вялікай літары, які прымушаў людзей сваім выкананнем плакаць і напаўняў іх сэрцы верай і надзеяй!

# САД

*(Эскіз)*

Сад... Як лашчыць слых гэтае простае слова!

Сад, брат, рай — гэта для мяне адзіны асацыятыўны рад. Брат, бо ніколі не здрадзіць, а ў раі знаходзіцца першы й вечны сад.

Беларускія сады вымерзлі лютай зімой саракавога года. Рэдкія дрэвы пусцілі атожылле... Але гэта ўжо былі дзічкі. І ўсё ж быў адзіны з гатункаў яблык, які вытрымаў саракаградусныя маразы, — *цыганы*. Спытайцеся любога старога пра гэты гатунак, і ён закоціць вочы й зацмокае губамі ад асалоды.

У бабуліным садзе была адна такая яблыня. Яе і дрэвам было назваць цяжка: ад напалову высахлага і пабітага дзятламі ствала адыходзіў убок адзіны жывы сук. І ён ажно гнуўся ад цёмна-чырвоных, амаль чорных пладоў. Мы, малыя, не маглі дачакацца, калі яны даспеюць, і ўжо ў жніўні спрабавалі яблыкі на смак. Яны былі кіслыя і цвёрдыя. Затое ў лістападзе, калі выпадаў першы снег, цыганы навагоднімі дарункамі красаваліся на заснежаным дрэве. Вось тады ў іх быў смак! Мы ўгрызаліся ў плады, як бабёр у асіну.

Сок пырскаў у вочы, казытаў у носе, цёк па твары. Бела-ружовая мякаць, заштрыхаваная чырвонымі пражылкамі, сугучна з крокамі па першым снезе, апетытна хрумсцела на зубах. Больш я не сустракаў гэткага гатунку...

Цыганы, цыганы, зніклі вы ў золкім тумане, як табар, і засталіся адно ў снах ды ў райскім смаку далёкага маленства.

Затое ўлетку яшчэ адна яблыня прыцягвала да сябе ўсіх навакольных дзяцей. Гэта — ранеты (або *карабоўкі*, аб чым я даведаўся ужо ў сталым узросце) — маленькія, салодкія, з мядовым водарам яблыкі. Дрэва расло ў садзе старой Анцы. Яна клыпала з кіёчкам і пільнавала сваё багацце. Але мы выбіралі любы зручны момант, і за тры дні абтрасалі ўсе яблыкі. Проста не ў дзіцячых сілах было ўстаяць перад такой смакатой!

Раней людзі прытрымліваліся няпісанага закону: апасля пабудовы дома, трэба было абавязкова пасадзіць сад. Выбар гатункаў яблыні ў пасляваенных гадавальніках быў небагаты: антонаўка, штрыфель, грушаўка, белы наліў, анісаўка, мічурынскі пепін-шафран. Груш амаль не было. Маладыя садаводы толькі ўсміхнуцца пры пераліку гэтых гатункаў. Аднак жа гатункі гэтыя былі выключна зімастойкія і ўраджайныя, і яны забяспечвалі людзей у галодныя

пасляваенныя гады якаснымі вітамінамі. Гэта цяпер мы можам пакаштаваць італьянскія яблыкі, а тады былі рады й антонаўцы.

Антонаўка... Табе, невядомы Антон, удзячнае чалавецтва павінна паставіць помнік. Але самы лепшы помнік — гэты непараўнальны гатунак! Шмат стагоддзяў на Малой, Белай і Вялікай Русі антонаўка — асноўны гатунак яблык. Незвычайная духмянасць натхняла паэтаў і пісьменнікаў. З Магілёўскай губерні залатыя плады спакон веку пастаўляліся да царскага стала. А ці даводзілася вам каштаваць антонаўку, мочаную ў мядовай сыце і перакладзеную лісцем чорных парэчак, вішань і каранямі хрэну? Няўжо не? Паспытайце — і зразумееце, што нашыя продкі былі не прафаны ў гастранаміі. У спрыяльны год, калі плады ўволю пагрэюцца на сонейку і памыюцца пад восеньскімі дажджамі, у канцы верасня на дрэве можна знайсці наліўныя антонаўкі, праз мякаць якіх бачны семкі. На смак гэта нешта невымоўнае! Не памыліўся Пушкін, калі пісаў пра «наливное яблоко». Не толькі царэўну, але і Еву змей, пэўна, спакусіў менавіта гэткім яблыкам, сакаўным. І хоць у наш час рынкі завалены прыгожымі польскімі яблыкамі, якія, дарэчы, за сезон вытрымліваюць ці не дванаццаць хімічных апрацовак і годныя хіба на тое, каб ганяць глістоў, пакупнікі шукаюць простую антонаўку. І так будзе заўсёды.

Грушаўку маскоўскую ў нас, на Віцебшчыне, называюць *спасаўкай*, бо плады паспяваюць якраз да свята Яблычны Спас. Толькі мы пачыналі імі ласавацца на тры тыдні раней. Гэты гатунак даваў ураджай строга праз год, але ж які гэта быў ураджай! Хапала ўсім: і чалавеку, і свінням, і карове, і курам... Хапала нават дзецям на тое, каб набіць яблыкамі поўную запазуху і пагуляць імі ў вайну. За два тыдні мы наганялі такую дзікую аскому, што пры адным позірку на яблык рот перакошвала нястрымная грымаса.

Маленства і яблыкі — гэта непарыўныя сінонімы. Восенню паспявалі *штрыфелі* (па-навуковаму — штрэйфлінгі) — вялікія яблыкі ў прыгожай чырвона-ружовай абалонцы. Самы смак ў гэтага яблыка, калі ў бабіна лета сарвеш яго, сагрэтае промнямі восеньскага сонца, патрымаеш у далонях, сатрэш з яго непрыкметны васковы налёт, і плод усміхнецца табе, як даўняму сябру, і самаахвярна скажа: «Паспытай мяне!» Вось тады гэты пачастунак натоліць цябе сапраўднай жыватворнай сілай.

Яблыня! Ты — цуда, падараванае прыродай чалавеку! І даўжыня жыцця ў некаторых яблыняў аднолькавая, што і ў чалавека. Гэтае дрэва адчувае ўсё — як і сапраўдная жывая істота.

У мяне ў садзе расла старая высачэзная яблыня — штрыфеля. Яе вершаліну аблюбавалі пчаліныя

раі. Зняць рой адтуль было праблемай з праблем. Аднойчы, калі я ў чарговы раз, пакусаны пчоламі, сарваўся з трохметровай вышыні, пабіў бакі й парваў штаны, то са злосцю ўсклікнуў: «Усё, зрэжу я цябе, Эйфелева вежа!» І што вы думаеце? Дрэва, хоць вясной і патанала ў квеце, не дала аніводнага яблыка, пачало засыхаць. Прыйшлося яго спілаваць.

Калі жорсткае слова здольнае загубіць дрэва, то што казаць пра чалавека!

Слова ратуе, слова лечыць.
Слова катуе, слова калечыць...

Другі прыклад. У сярэдзіне мая здарыліся моцныя начныя замаразкі. Клейкія светла-зялёныя лісточкі на маладзенькай грушы пацямнелі, пакруціліся і апалі. Дрэўца было асуджана на смерць. Кожную раніцу я прыходзіў да грушы, цалаваў яе танюткі ствол, тварыў над ёй малітву і апырскваў вадой, прыгаворваючы:

— Не памірай, мая харошая, прачніся! Паглядзі, як хораша на Божым Свеце! Я ж цябе люблю і буду даглядаць да канца дзён сваіх, буду радавацца тваім першым кветкам. Твой век — двесце гадоў. Калі-небудзь мой сын пасля далёкіх блуканняў завітае да цябе, дакранецца да магутнага камля, а ты шамаценнем галін нагадаеш яму аб тым, хто

цябе пасадзіў, — пра яго бацьку. Ты — будучая памяць пра мяне. Не памірай!

Адзін знаёмы казаў мне:

— Кінь ты гэту безнадзейную справу! Нічога не атрымаецца...

Але мой клопат, ласка і пяшчота — перамаглі: праз два тыдні з адной пупышкі сарамліва выглянуў на свет зялёны цуд, а за ім — другі й трэці... Груша ажыла!

У мяне ёсць свой сад. У маі, калі нават старыя яблыні з пакручанымі сукамі расцвітаюць і ператвараюцца ў юных прыгажунь, неадольная сіла цягне мяне са сталіцы ў вёску. Я кідаю ўсе справы й на чарадзейных крылах веснавой радасці лячу на Радзіму. Цалую матулю, адчыняю веснічкі ў сад і... апынаюся ў казцы. Ад бела-ружовага хараства кружыцца галава, у кожнай кветцы гудзе пчала. Я падыходжу да юнай прыгажуні, якую пасадзіў сем гадоў назад, абдымаю яе, прыціскаюся шчакой да ствала, на якім ведаю кожную выбоіну кары, заплюшчваю вочы й адчуваю пульс жывых сокаў маці-зямлі, якімі яна поіць сваіх гадаванцаў. І яблыня шчыра дзеліцца са мной гэтай гаючай сілай.

Людзі, садзіце сады! Яны зробяць вас дабрэйшымі, бо нездарма кажуць: «Дрэнны чалавек сад не пасадзіць...»

# КУРГАНЫ

Курганы — вы вечныя вартавыя маёй Радзімы.

Тры тысячагоддзі ваша пільнае вока акідвае позіркам абшары зыбучых балот і квітнеючых палёў, векавых пушчаў і камяністых пагоркаў, сунічных крыніц і люстраных азёр, прабітых стрэламі трыснёгу.

Час для вас ідзе ў іншым вымярэнні, вы жывяце па летапісе багоў і герояў.

Вашае сэрца — апошняе прыстанішча майго далёкага продка, да якога не давядзе ні адзін радавод, і з якім я ўсё ж адчуваю непарыўную сувязь.

У гады свайго маленства вы бачылі зыркія ўспалохі зніча, асвятляючага драўляныя ідалы Купалы, Лады й Лелі. Вакханальны нястрыманы карагод ап’яняў экстазам пульсуючага гарачай славянскай крывёй танца і юных прыгажунь з ільнянымі распушчанымі валасамі й мужных сівабародых мужоў. Магічны водар летняй ночы, узбуджаючы пах свежага сена — усё гэта было прэлюдыяй Кахання, калі ад шчаслівых жаночых стогнаў заміралі конікі ў траве, а маладзік сарамліва хаваўся за хмарку. Пасля

такіях святаў душы нараджаліся самыя прыгожыя хлопчыкі з вачанятамі колеру купальскай ночы й дзяўчынкі, чые вочкі адабралі сіняву ў нябёсаў.

Вы, курганы, бачылі столькі гора і крыві, што вашае сэрца скамянела. Ваш твар пасечаны мангольскімі змеепадобнымі булатнымі клінкамі, турэцкімі ятаганамі, французскімі палашамі, нямецкімі штыкамі. Але зямля зацягнула свае раны, а зброя ніколі не пераможа вольны дух майго народа. І калі сэрца крычыць ад болю за гаротны лёс маёй Радзімы, я душой прыпадаю да кургана, і мой далёкі прашчур наталяе мяне спакоем і адвагай. Я заплюшчваю вочы, і ветрык даносіць аднекуль гаючыя словы: «Гора пройдзе. Зноў расцвітуць рамонкі. Іх нельга забіць і знішчыць. І мы — вечныя, як гэтыя кветкі!»

# АБ ЧЫМ ШУМІЦЬ СНЕЖАНЬСКІ ЛЕС?

Кажуць, дрэвы маўчаць. Не, яны размаўляюць на сваёй першабытнай прамове. Паслухайце снежаньскі лес. Аб чым так трывожна шамацяць кашлатыя лапы елак? У нервовым пагойдванні вершалінаў згадваецца спрадвечны плач аб самым дарагім для ўсяго жывога — аб сваіх дзецях. Інстынктам дрэвы адчуваюць набліжэнне подыху смерці.

Снегавымі шатамі, калючым хмызняком, непраходнымі гурбамі лес хавае сваіх гадаванцаў. Але пад Новы год прыходзіць чалавек з сякерай. Абухом ён б’е па танюткім ствале васьмігадовай прыгажуні-ялінцы, страсаючы з яе снегавыя карункі. Ад гэтых удараў уздрыгваюць наўкольныя дрэвы, а напалоханая ялінка туліцца бліжэй да маці.

— Не трэба! — адбіваецца яна маленькімі лапкамі-рукамі.

Але чалавек няўмольны. Кароткі, з надсадным гаканнем посвіст сякеры — і дрэўца, ужо ссечанае, стаіць яшчэ нейкае імгненне, а потым мякка падае

на халодна-шурпаты снегавы наст. Усё. Абарвалася існаванне цуда, якому прыродай быў адмераны век у тры чалавечых жыцці.

Гісторыя захавала звесткі аб трагедыі ў Віфліеме, дзе па загаду чара Ірада было забіта чатырнаццаць тысяч немаўлятак. А ў пераднавагоднім лесе кожны год адбываецца зло яшчэ больш грандыёзнага маштабу.

Перафразіруючы Джона Дона, хочацца напомніць усім: смерць усяго жывога прымяншае і мяне, бо я адзіны з прыродай, таму ніколі не пытайся, аб чым шуміць снежаньскі лес — ён шуміць і аб табе.

Слёзы шчасця

Пасля доўгага расстання я іду па роднай вёсцы. Кожны стрэчны дом наганяе чараду ўспамінаў і вяртае ў далёкае маленства.

Вось у гэтай хаце я жыў з бацькамі да дзесяцігадовага ўзросту. Потым сюды пераехала родная цётка, а два гады таму не стала і яе. Будынак урос у зямлю і запыленымі акулярамі вокнаў падслепавата і сумна глядзіць у наваколле. З палісадніка прабіліся на волю рослыя кусты бэзу і язміну. Плот нахіліўся. Старыя антонаўкі й штрыфелі без гаспадарчай рукі перапляліся суччам, нібы неразлучныя сябрукі, і стварылі сапраўдныя шаты. Дрэвы не вытрымліваюць веснавых вятроў — ламаецца голле, і яны пакрысе дажываюць

свой век. Але раз на некалькі гадоў яны набіраюцца моцы й выдаюць такі ўраджай, што ў верасні ўсе жадаючыя набіваюць поўныя мяхі яблыкаў, а бунінскі водар антонаўкі пару тыдняў духмяным воблакам лунае над усёй вёскай. А ці ўспомніў хто-небудзь, калі зрываў прыгожыя і смачныя плады, чалавека, які пасадзіў гэты сад — майго бацьку? Можа, толькі дрэвы захавалі цяпло яго далоняў...

Я ўспомніў, як у васьмігадовым узросце сонечным майскім ранкам сядзеў на зэдліку каля хаты й чытаў кніжку. Размораны гаючым водарам квітнеючага сада, я заснуў. Мне сніўся нейкі дзівосны сон. Прачнуўшыся, я не мог зразумець, дзе знаходжуся: у сне ці ў рэальным жыцці. Я ўбачыў родны сад у ружова-белай кіпені, пачуў спеў шпака на старой бярозе, і раптам з вачэй паліліся няпрошаныя і незразумелыя слёзы. Чаму я плакаў? Можа, маё дзіцячае сэрца інстынктыўна зразумела хараство і непаўторнасць гэтага імгнення? Можа, я адчуў, што гэта самы шчаслівы момант усяго майго жыцця, які больш ніколі не вернецца і не паўторыцца? А слёзы ліліся, такія наіўныя і шчырыя, такія непасрэдныя і паэтычныя, такія шчаслівыя і салодкія дзіцячыя слёзы. З такіх вось слёз вырастаюць дрэвы Дабрыні й Кахання.

І цяпер, калі мне адкрывае свае непрывабныя абдымкі старасць, я ўсё часцей вяртаюся ў той вясновы дзень і разумею, што там жыве шчасце.

Таму, калі праходжу каля гэтага закінутага дома, то не хачу адчыняць туды веснічкі, каб не напалохаць хлапчука, які развітваецца са сваім дзяцінствам.

# СТАРЫЯ ХАТЫ

*Домік маленькі, бачу я, знеслі.*
*А ў доміку гэтым спявалі песні.*
*А ў доміку гэтым дзяцей нараджалі,*
*А ў доміку гэтым гасцей страчалі.*

*Анатоль Вярцінскі*

Старасць аднолькавая і для чалавека, і для будынка.

Разам з бабулямі дажываюць свой век старыя хаты. Гаспадароў амаль не засталося: мужчыны заўсёды ідуць першыя і на вайну, і ў труну. Ад ран, ад непасільнай працы, ад голаду, ад гарэлкі...

Большасць дамоў у беларускай вёсцы будавалася пасля цяжкай і крывавай вайны. Вярталіся дамоў мужчыны. Хмурыя, стомленыя, параненыя, але шчаслівыя. Яны перамаглі. Мужчыны згаладаліся па жаночай ласцы й мірнай працы. Звонкі дыскант малатка, вясёлае сапрана пілы, бадзёры альт сякеры спляталіся ў гарманічным хоры будаўніцтва. Пах жывіцы й хваёвых стружак асвяжаў і бадзёрыў лепш за любы адэкалон. Пасля дружнай талакі, дзе людзі працавалі не за грошы, а за сціплы пачастунак, навюткія

пяцісценкі свяціліся золатам цёсаных бярвенняў. Гэтае золата не мела цаны, бо ў яго была закладзена душа і даўгачаканая мара аб мірным жыцці.

Жанчыны, якія за вайну засохлі без кахання, расцвіталі й горда неслі свае жываты з пульсуючым жыццём. А праз колькі часу нараджаліся яны — дзеці Перамогі.

Куды яна потым знікла, гэтая радасць? Пераможцы жылі, як рабы. Кропля радасці заставалася на дне чаркі. Але гэта была нейкая іншая радасць. Ад яе плакалі жанчыны й дзеці. І яе ўсё роўна не хапала, той радасці, каб заліць гора і самоту. Бярвенні дамоў пацямнелі й пакрыліся маршчынамі глыбокіх трэшчын. Усё радзей чуўся ў хатах гармонік дзіцячага смеху. Дзеці выраслі й падаліся ў горад.

Дом неяк адразу старэў пасля таго, як з яго выносілі труну з гаспадаром, чалавекам, які яго будаваў.

Мне не дае спакою пытанне: чаму адным з трох асноўных вынікаў жыцця чалавека з'яўляецца пабудова хаты? Чаму бяздомны чалавек — гэта апошняя стадыя гора і падзення? Можа, што не толькі яму, але і ягонай душы няма прытулку. Мабыць, душы цесна ў недасканалай абалонцы чалавечага цела. Яна смуткуе ад дрэнных учынкаў свайго ўладальніка.

Ноччу душа пакідае цела, адпачывае, ачышчаецца ад наліплага за дзень бруду, падарожнічае па Сусвеце.

Мне здаецца, дом — гэта жыллё больш душы, чым чалавека. Пасля смерці гаспадара душа яшчэ сорак дзён жыве ў родным доме і адтуль адлятае на далёкую зорку.

Таму, калі бачу самотны позірк вокнаў пакінутай хаты, я сарамліва адводжу вочы, бо нічым ужо тут дапамагчы немагчыма.



# ПАЛЯВАННЕ НА КАЧАК

Сябры, ці чулі вы пра майго дзядзьку? Не? Вы шмат чаго згубілі. Ён — асоба адметная, бо з ім здаралася столькі розных прыгод, што пра ўсё гэтае можна было б напісаць кнігу.

У маладыя гады дзядзька вельмі хацеў набыць стрэльбу. Вядома ж, добрая стрэльба — мара амаль кожнага мужчыны. Але час тады быў цяжкі, пасляваенны, дзядзька працаваў у калгасе, і на працадні амаль нічога не плацілі. Колькі яму спатрэбілася часу і цярпення, каб сабраць патрэбную суму, я не ведаю, але ён прыдбаў-такі сабе сапраўдную тульскую двухстволку. Радасці не было канца. І якраз пачаўся сезон палявання на качак. Дзядзька і адправіўся адвячоркам на аселіцу, бо адразу за вёскай пачыналіся добрыя балоты, куды качкі прылятаці на начлег. Дзядзька цішком, каб не спалохаць дзічыны, падкраўся да першага балотца, узвёў куркі й выглянуў з-за куста. Нікога. Але раптам — дзядзька не мог паверыць — з-за карча адна за адной выплылі аж дзве качкі. Ён прыцэліўся і ўсмаліў амаль дуплетам.

Качкі закруціліся на месцы й заціхлі. Ёсць! Першая здабыча!.. І тут жа, трэба ж, з-за таго самага карча выплылі яшчэ дзве качкі. Дзядзька дрыжачымі ад хвалявання рукамі перазарадзіў стрэльбу, і зноў шандарахнуў з абоіх ствалоў. Вось гэта паляванне! Ад радасці дзядзькавая душа лунала ў аблоках. Ён уявіў, як горда, на зайдрасць усім суседзям, прашыбуе праз вёску, увешаны тлустымі качкамі. Як здзівіцца жонка, якая не хацела, каб ён купляў стрэльбу. Ад гэтых прыемных мараў дзядзька на пэўны час страціў увагу, а калі зноў глянуў на балота, то убачыў, як з-за таго ж карча зноў выплыла качка. Але яна была... белая! Дзядзька аслупянеў. Ён адразу скумекаў, што гэта не які-небудзь альбінос, а качка суседкі Ганны, як і тыя, якіх ён падстрэліў раней. Што ж рабіць? І вырашыў, што не трэба пакідаць апошнюю сведку! Не марудзячы, урэзаў з левага ствала, і над балотцам закруціўся белы пух.

Дамоў ён прабіраўся агародамі зацемна, каб ніхто не бачыў. Качак сам абскуб у лазні, а пер'е старанна закапаў. Ранкам сам злажыў свае трафеі ў вялікі кацёл і паставіў у печ. Праз тры дні на качынае мяса ў сям'і ўжо ніхто глядзець не мог... А суседка Ганна яшчэ доўга ўспамінала свой прапаўшы качыны вывадак.

## ПАСВЯЧЭННЕ Ў ПАЛЯЎНІЧЫЯ

Хоць і кажуць, што са стральца і музыкі — гаспадар невялікі, але мой дзядзька нават пасля няўдалага палявання на суседскіх качак усё ж такі марыў стаць сапраўдным паляўнічым. У нашай мясцовасці існавала брыгада аматараў, якія па ліцэнзіі здабывалі сапраўдную дзічыну: дзікоў ды ласёў. Яны мелі добрую зброю, выдатных ганчакоў, сваю тэхніку. Але трапіць да іх у калектыў было не так проста: патрабавалася рэкамендацыя аднаго з пастаянных удзельнікаў, ну, і, вядома ж, немалы «уступны ўзнос».

І вось аднойчы дзядзькава мара збылася: старшыня калгаса, які быў пастаянным членам брыгады і ў якога ён быў адным з лепшых працаўнікоў, запрасіў яго ў бліжэйшую суботу на паляванне. Яшчэ па-сяброўску папярэдзіў, каб на дзядзька надзеў якую-небудзь старую, непатрэбную шапку. Той так і зрабіў.

Вось і доўгачаканая субота. Уся брыгада, у ліку пятнаццаці чалавек, загрузілася ў крыты грузавік і паехала да месца, дзе ўчора бачылі лася.

Вы памыляецеся, калі думаеце, што мужчыны выпраўляюцца на паляванне, каб здабыць кавалак мяса. Мяса яны, звычайна, бяруць з сабой. А ўсё задавальненне ў тым, каб збавіцца ад дамашніх клопатаў, пахадзіць па заснежаным лесе, надыхацца марозным паветрам, вечарам на паляне сярод елак развесці вогнішча і пасля чаркі-другой завесці вясёлую мужчынскую гамонку. Тады ўсе людзі становяцца братамі, хочацца ўсіх цалаваць, нават паляўнічых сабак. Што, дарэчы, многія і робяць. Як кажуць на Віцебшчыне, п'юць так, што сабакі морду ліжуць.

На гэты раз паляванне было не надта ўдалым: здабылі толькі двух зайцоў і лісу. Але самае прыемнае было наперадзе. Вось ужо заіскрылася вогнішча, асвятляючы вясёлыя мужчынскія твары. Дзядзька дастаў пачастунак. Усе павіншавалі яго з уступленнем у паляўнічае братства і з баявым хрышчэннем, бо ён падстрэліў аднаго з зайцаў. Тут палкоўнік, які лічыўся галоўным у брыгадзе, сарваў у дзядзькі з галавы шапку і з крыкам «Агонь!» — падкінуў яе ўверх. Чатырнаццаць стрэльбаў гахнулі амаль адначасова. Ад гэтага залпу скалануўся снег з бліжэйшых елак, а замест шапкі на зямлю пачалі апускацца шматкі тканіны.

Дзядзька, хоць і чакаў нечага падобнага, быў збянтэжаны й раззлаваны. Не доўга думаючы, ён сарваў з галавы палкоўніка каракулевую папаху і з

крыкам «Агонь!» — замашна зашпурнуў значна вышэй, чым палкоўнік ягоную шапку. Хлопцы ўрэзалі з другіх ствалоў, і ў паветры закруціліся дзесяткі маленькіх каракулевых баранчыкаў.

Палкоўнік аслупянеў. На лысіну яму мякка падалі сняжынкі. Ён ускіпеў:

— Ды я цябе !.. — і кінуўся да дзядзькі, але іх разнялі. Пасля трэцяй чаркі яны паміpыліся, пасля пятай — сталі лепшымі сябрамі, а пасля сёмай — пачалі цалавацца.

Так дзядзька стаў сапраўдным паляўнічым.

# КАЛЯДНАЯ ПРЫГОДА

Раскажу я вам, сябры, адну гісторыю. Але паколькі ўсе яе дзеючыя асобы жывыя і здаровыя, іх імёнаў называць не буду.

Дык вось. З даўніх часоў у беларускіх сялян свежына на стале з'яўлялася звычайна раз у год — на Каляды.

На працягу года гаспадыні старанна даглядалі сваіх парсючкоў, якія да зімы до-обра выраставі!

У нашай мясцовасці парсючкоў звычайна страляюць. Можа, што дзічыны ў лясах амаль не засталося, а мужыку хочацца адчуць сябе здабытчыкам. Ды толькі вось стрэльбы былі не ў кожнага. Таму паляўнічыя ў гэты тыдзень карысталіся вялікім попытам.

Мой дзядзька лічыўся адным з лепшых паляўнічых, асабліва па хатняй дзічыне, і ўвесь калядны тыдзень быў у яго загадзя распланаваны. Дамоў ён вяртаўся ўначы, на падпітку, але пад пахай трымаў добры кавалак сала, і жонка не надта яго дапякала. Аднаго разу сусед, які заўсёды карыстаўся паслугамі дзядзькі, падумаў: «А ці я не залішне яму даю? І пакармі, і напаі, і з сабой дай!» І вырашыў абысціся без дзядзь-

кавых паслуг. Папрасіў у сваяка стрэльбу, толькі набояў не знайшлося. Давялося-такі звяртацца да дзядзькі. Той узяў дзве гільзы, паставіў туды капсулі, насыпаў двайную норму пораху, забіў пыжы, але і адной карцечыны не паклаў. Зрабіў, такім чынам, два халастыя набоі. Сусед паабяцаў наліць сто грамаў і пашыбаваў дахаты. Дзядзька ж хуценька на дах, каб адтуль назіраць!

Сусед выгнаў парсюка з хлеўчука, узяў стрэльбу, прыцэліўся і націснуў на курок. Стрэльба шандарахнула так, што задрыжалі шыбы, а вароны з дрэў з карканнем узняліся ў паветра. Суседа ад штуршка прыкладам адкінула на пару метраў назад. Ад віскату парсюка заклала ў вушах, але падаць на зямлю ён не збіраўся. Сусед, калі ўбачыў гэта, ударыў з другога ствала...

Дзевяностагадовая бабулька ў суседняй хаце вырашыла, што пачалася трэцяя сусветная, залямантавала, а сусед шпурнуў стрэльбу ўбок, схапіў нож і кінуўся даразаць парсюка. Ды калі аглушаная жывёліна зразумела, што яе яшчэ і рэжуць, дык у адчаі пайшла ў наступ на свайго крыўдзіцеля. Людзі бачылі, як сусед бег па дарозе і крычаў: «Людцы, ратуйце!».

Дзядзька ад рогату скаціўся з даху і так ляснуўся, што зламаў дзве рабрыны. Давялося потым суседу разам з дзядзькам ляжаць у раённай бальніцы на суседніх ложках.

# ПЧАЛЯРСКАЯ НАВУКА

Сябры, вам падабаецца мёд? Вядома, адкажаце вы, хто ж яго не любіць! Але, каб есці мёд кожны дзень, трэба мець сваіх пчолак, бо калі на Камароўцы вы паспытаеце гэтага духмянага далікатэсу, дык не забудзьцеся хуценька закрыць рот. З чаго б гэта? Усё проста: калі вам скажуць цану, то ад здзіўлення тут жа вывіхнецца сківіца.

Вось і вырашыў я завесці пчолак. Змайстраваў вулей, прачытаў пару кніжак па пчалярству... Карацей, затрымка была за пчоламі. А дзядзька мой, скажу я вам, акрамя таго, што паляўнічы й рыбак, дык яшчэ і неблагі пчаляр. Прырода неяк ураўнаважыла яго здольнасці, бо ад першых двух заняткаў карысці мала. Пчаляр жа, калі ў яго на плячах галава, а не качан капусты, заўсёды можа мець лішнюю капейку і быць з мёдам. Звярнуўся я за дапамогай да дзядзькі. Той паабяцаў даць рой. І вось аднойчы ён тэлефануе мне і кажа:

— Гані да мяне, вылецеў рой!

Я, бы на крылах, прыбег да дзядзькі. Той павёў мяне ў сад. На вяршыні старой яблыні вялізнай шэрай грушай вісеў рой.

— Бачыш, кілаграмы на чатыры пацягне! Ужо ў гэтым сезоне прынясе табе вядро мёду. Здымай!.. — кажа дзядзька, а сам неяк хітравата ўсміхаецца.

Я не прыдаў увагі гэтай усмешцы, а дарэмна... Прыставіў да яблыні лесвіцу, распаліў дымар, адзеў сетку, узяў раёўню і палез. Тады я не ведаў, што ў дзядзькі была сям'я злосных лясных пчол, да якіх ён і сам баяўся падступіцца. Якраз на гэтым раі дзядзька і вырашыў даць мне ўрок пчалінага майстэрства. Я тым часам залез на пяціметровую вышыню і падабраўся да роя. Пчолы сустрэлі мяне напружаным гудзеннем. Я дзьмухнуў на іх з дымара. Гудзенне падскочыла на актаву ўверх і ў некалькі разоў узмацнілася. З дзесятак пчол-ахоўніц ужалілі мяне за аголеныя рукі. Потым я даведаўся, што дзядзька глядзіць сваіх пчол у тоўстых гумавых пальчатках, але пра гэта ён мне, вядома, не сказаў. Я дзьмухнуў яшчэ раз, спадзеючыся супакоіць пчол. Лепш бы я гэтага не рабіў! Дзікія лясныя пчолы не лічаць чалавека сваім гаспадаром, і яны гэта даказалі на справе. Я адчуў, як праз вопратку мне ў спіну, шыю і бакі ўтыкаюцца спякотныя джалы. Я зразумеў, што адчувае касалапы, калі лезе ў дупло па мёд, але ж у мяне, на жаль, не было мядзведжай футры. Уцякаць было б, аднак, занадта сорамна. Я хуценька

страсянуў пчол у раёўню, малпай скаціўся з яблыні й кінуўся хавацца ў лазню. Дзядзька рагатаў, трымаючыся за жывот, а мне было не да смеху. Паўгадзіны я выдзіраў са сваёй скуры пчаліныя джалы. Вы бачылі калі-небудзь надзьмутыя гумавыя пальчаткі? Вось такімі сталі мае рукі, а тварам я стаў падобны да Чынгіс-хана.

Але ж першы ў жыцці рой за свае пакуты я атрымаў. І мёду гэтыя пчолы мне прынеслі, і радыкуліт пасля іх укусаў некуды знік, так што, дзякуючы дзядзькавай суровай навуцы, я стаў сапраўдным пчаляром!

## ШТУКАРСТВЫ ДЗЕДА МАРОЗА

З прыбытку галава не баліць. Адно галава павінна быць цвярозая, а то можа здарыцца такое, што і ад Бога — грэх, і ад людзей — смех.

Захацеў я перад Новым годам крыху падзарабіць. Сябра мой ужо колькі гадоў Дзедам Марозам працуе і неблагія грошы мае.

У мяне таксама сякія-такія таленты маюцца, калісьці ў школьнай мастацкай самадзейнасці выступаў. Вывучыў я колькі навагодніх вершыкаў і пайшоў на фірму, дзе працаваў мой сябра. Там праверылі мае здольнасці, далі касцюм Дзеда Мароза і пазнаёмілі з сімпатычнай студэнткай Святланай, маёй Снягуркай. Потым я атрымаў мех з падарункамі й адрасы, па якіх трэба іх развозіць. Дырэктар фірмы папярэдзіў, каб на рабоце ніхто спіртнога не ўжываў. Мы расселіся па машынах і паехалі. Работа мне спадабалася — гэта вам не цэлы дзень каля станка парыцца. Пад'едзем на машыне куды трэба, павіншуем дзяцей, уручым падарункі — і далей. Любата! А народ у нас хоць і бедны, але шчодры: у кожнай кватэры

запрашаюць да стала, а гэта ж для чалавека цяжкае выпрабаванне... Першыя два дні я трымаўся, але, як кажуць, заракалася свіння ў гарод лазіць.

На трэці дзень, якраз 31 снежня, вырашыў зрабіць навагодні сюрпрыз і павіншаваць дзяцей свайго брата Васіля. Яго сынок Янка і дачушка Верачка былі такія шчаслівыя, калі да іх завіталі Дзед Мароз ды Снягурка! Дзеці нам і спявалі, і вершы чыталі, і нават таньчылі. Мой брат — хлопец вясёлы, кампанейскі, і яму ўдалося-такі запрасіць нас да святочнага стала. Добра, думаю, засталося два адрасы, справімся. Снягурка выпіла крыху шампанскага, а я куляну ў тры чаркі гарэлкі. Адразу нам стала весела. І тут Васіль папрасіў нас павіншаваць ягоных суседзяў. Завіталі мы яшчэ ў дзьве кватэры. Паўсюль радасць, вяселле, нас запрашаюць да святочнага стала...

Святлана піла толькі ліманад, а я не адмаўляўся. Гуляць дык гуляць! Мне ўжо болей нікуды не хацелася, але праца ёсць праца. Паехалі мы яшчэ па адным адрасе. Цяпер гаварыла Снягурка, а я маўчаў. Застаўся апошні адрас. Па падарунках бачым, што жыве там нейкі новы беларус. Усім астатнім дзецям даюць цацкі ды цукеркі, а тут — відэямагнітафон, касеты, нейкую электронную гульню... Хлопчыка завуць Артурам.

Заходзім у кватэру. Бачым: поўны еўрарэмонт, усё зіхаціць і блішчыць. Прыхожая — больш, чым

уся мая двухпакаёўка. Выйшаў гаспадар. Адразу відаць — з тых, што ўвесь пакрыты «зеленню», абсалютна ўвесь: кароткая стрыжка, малінавы пінжак, нахабны твар.

— Чаму спазніліся? — адразу кідаецца ў наступ.

— Не твая справа, — кажу. — Навучыся спачатку, як трэба Дзеда Мароза сустракаць, а потым ужо высвятляй адносіны.

— А-а, дык ты яшчэ пад градусам?!. Вон адсюль! — ён моцна схапіў мяне за плечы, каб выпіхнуць з кватэры. Але не на таго натрапіў: я не люблю, калі да мяне так ставяцца! Не дарэмна ж некалі секцыю каратэ наведваў! Таму з крыкам «кі-я!» «падарыў» яму ўдар «мае-гіры» ніжэй пэйджэра. Ён вырачыў вочы ад жаху і здзіўлення — і зваліўся на падлогу. Снягурка, калі толькі ўбачыла такі кавардак, выбегла на двор. З суседняга пакою выхапіўся «квадратны» ахоўнік і папёр на мяне, як танк. Для яго ў мяне была процітанкавая міна ў выглядзе відэямагнітафона ў мяху, якім і ляснуў яго па фэйсе. Тады заявіўся яшчэ адзін ахоўнік, і пачалася сапраўдная бойка. У мяне закіпела кроў, я скінуў кажух...

Сілай мяне Бог не абдзяліў, яшчэ б розуму паболей. Праз дзесяць хвілін прыхожая новага беларуса нагадвала руіны. І тут — міліцыя. Мяне адлупцавалі дубінкай і адвезлі ў медвыцьвярэзнік.

Раніцай пабудзіў сяржант. Смяецца:

— Прачынайся, Дзед Мароз — сіні нос. Ну і даў ты ўчора чаду! Ідзі дамоў, сёння ўжо новы год уладарыць. Заплаці штраф і бярыся за розум, бо п'яніца праспіцца, а дурань ніколі! І малі Бога, каб новы беларус на цябе ў суд не падаў! Праўда, ён сам за бойку з супрацоўнікамі міліцыі ў кутузку трапіў...

«Сапраўды, — думаю, — трэба брацца за розум. Каб яшчэ калі ўзяўся за чарку!.. — Пайду дамоў. Калі грошы не выцягнулі, куплю жонцы белыя ружы, а дачушцы — хамячка, як і абяцаў. Можа, даруюць, што разам з імі Новы год не сустракаў?»

# ПАДАРУНКІ ДА ЖАНОЧАГА СВЯТА

Набліжалася восьмае сакавіка. Цудоўнае свята, але для мужчын яно стварае шмат праблем. І галоўная з іх — падарункі... Не, калі быць Беразоўскім ці хаця б рубшчыкам мяса на Камароўскім рынку, усё было б прасцей. А калі ты — законапаслушны грамадзянін і жывеш ад аванса да зарплаты, то гэта вельмі балючае пытанне.

Але я ў шапку не спаў — загадзя ўсё прадугледзеў: адразу пасля мінулагодняга свята пачаў пакрысе збіраць грошы. За год сабраў двесце тысяч. За такія грошы можна купіць нешта больш-менш прыстойнае, каб дагадзіць жонцы. Таму за колькі дзён да свята з лёгкім сэрцам і важкім кашальком паехаў у ЦУМ на пошукі падарунка.

Што б гэта лепш купіць? Можа, якую футру, бо гэта даўняя мара маёй жонкі? Глянуў на цэны й зразумеў, што за свае грошы змагу купіць адно танны каўнер ад футры.

А вось і аддзел гадзіннікаў. Ёсць вельмі прыгожыя, нібы з Эрмітажу. Толькі не люблю я гадзіннікі:

кожным паваротам сваіх стрэлак яны, нібы нажніцамі, адразаюць кавалачак нашага жыцця. А колькі там яшчэ адразаць засталося? Таму лепш без гэтых напамінальнікаў хуткацечнасці лёсу.

Вось спартыўны аддзел. Зазірнуў — і сэрца пачало калаціцца ўдвая хутчэй. Там стаяла мая даўняя мара — гумавая лодка. Я адразу ўявіў сабе, як прыеду на лясное возера, надзьму лодку, і паплыву на ёй, куды сэрца пажадае. Наўкола прыгажосць, спяваюць птушкі. У думках я ўжо цягнуў на вудачку здаравеннага ляшча, калі мяне вярнуў у рэальнасць голас прадаўца:

— Мужчына, не ўпусціце свой шанц, у нас сезонны распродаж, таму гэтую лодку вы можаце купіць напалову танней, усяго за 180 тысяч. Ды яшчэ ад фірмы атрымаеце ў падарунак насос.

Гэты «насос» мяне дабіў канчаткова. Карацей, купіў я лодку.

І тут, бачу, прадаецца набор з двух ракетак для настольнага тэніса і сеткі. Гэта ж даўняя мара майго сына, дый сам я люблю пагуляць у тэніс! Калі падвернецца магчымасць. А заняткі спортам — гэта здароўе і добры настрой. На такое аніякіх грошай не шкада, а набор каштуе ўсяго 10 тысяч. Купіў.

Зайшоў у аддзел хатніх кветак. А там — такая прыгажосць, аж вочы разбягаюцца! Кветкі з самай

Галандыі. Бачу, вазон з цвітучай глаксініяй. Кветкі вялікія, снежна-белыя, а па краях — ярка-чырвоная паласа. Абалдзець можна! Жонцы, канешне, спадабаецца. І каштуе ўсяго сем тысяч. Купіў.

Яшчэ і на шампанскае засталося. Вось што значыць спрытны мужчынскі розум: зрабіў свята для ўсёй сям'і! Таму, паважаныя жанчыны, любіце сваіх мужчын. Што б вы без нас рабілі?!. Дарэчы, як і мы без вас...

— Са святам вас!

А я пачынаю збіраць грошы да наступнага жаночага свята: вельмі мне ружжо для падводнага палявання спадабалася.

# ЛАНЦЭПУП

Усе зараз сталі мічурынцамі. Адны — на кухні ананасы вырошчваюць, другія — у парніках кавуны й дыні. А ў маёй знаёмай нават лімон на падаконніку пладаносіць — дзіва дый годзе! Нават мой вясковы сусед Васіль узяў рыдлёўку і пачаў ускопваць зямлю ў сваім агародзіку. Напэўна, усе ваўкі за гарой здохлі, бо Васіль жа — лайдак і п'яніца, жонка ад яго даўно ўцякла, так і жыве бабылём. З жыўнасці — адзін худы кот, які ад бяскорміцы стаў вегетарыянцам. Скубе траву, нібы трус, і на кошак нуль увагі. Мне ж, як і любой жанчыне, цікава: з якой гэта нагоды сусед ўзяўся за рыдлёўку і што ён збіраецца сеяць? Падыходжу да агароджы, пытаюся:

— Васілёк, што сеяць будзеш: цыбулю ці буракі?

Ён — у адказ:

— Тундра ты, чорназёмная!.. Што ты разумееш, Марыля, у раслінаводстве? Я пасею такое дзіва, якога ў нас ніхто не бачыў. Не верыш? Насенне мне з-за бугра прывезлі. І называецца гэты цуд — індыйскі ланцэпуп!..

«Што гэта за ланцэпуп такі? — думаю. — І з чым жа яго ядуць?..» Але пытацца баюся, каб не паказаць сваю недасведчанасць. Васіля ж, як падмянілі, — з раніцы завіхаецца на сваім агародчыку, палівае грады, нават пустазелле поле. І вось — бачу: з'явіліся на яго градках парасткі — пруць уверх, як быццам іх хто знізу піхае. За лета вымахалі аж пад два метры. Васіль скасіў свой дзівосны ланцэпуп і развесіў сушыць пад страхой. А я ўсё не магу супакоіцца: для чаго ж яму спатрэбілася гэтая расліна? Пачала ўгаворваць свайго мужыка:

— Міхась, схадзі да Васіля, даведайся, што ён будзе са сваім ланцэпупам рабіць?

Міхась нехаця дацягнуўся да суседа. Вярнуўся ажно гадзіны праз дзве ў нейкім незразумелым стане — вясёлы, узрушаны, хоць і не падобна, што п'яны.

— Марыля, — кажа, — ведаеш, што такое ланцэпуп?.. Гэта ж — індыйскі тытунь. Б'е па галаве не тое, што наш самасад — ад яго, як на крыллях лётаеш!

З таго часу нашыя мужыкі зачасцілі да Васіля, кураць у яго ланцэпуп і балдзеюць. Добра, што гарэлку піць перасталі, а дрэнна тое, што апошнія грошы аддаюць за гэты тытунь, і — ой, ой! — мужчынскія абавязкі перасталі выконваць: накурацца і храпуць на ўсю вёску, аж сабакі пужаюцца.

Мо, так бы цягнулася і далей, каб не адзін выпадак...

Аднойчы надвячоркам, бачу, мой Міхась вяртаецца ад Васіля, бярэ драбіны й лезе на дах. Я выйшла паглядзець. А ён стаіць на самым версе і крычыць:

— Бывай, Марыля! Лячу ў Новую Гвінею да сіняга мора!..

Памахаў мне ручкай і... паляцеў. Толькі не ў Новую Гвінею, а ў градку з цыбуляй, што расла каля дому. І мой стокілаграмовы верабейчык так «удала» спікіраваў, што носам ўзараў усю градку не горш, чым плугам. Добра, што зямля пасля дажджу была мяккая, дык толькі руку вывіхнуў і бакі сабе паадбіваў.

Тут я ўжо не вытрымала і пайшла да ўчасковага, расказала яму, у чым справа. Той прыехаў на «варанку», арыштаваў Васіля і забраў усе яго запасы ланцэпупа. Аказалася, што гэта ніякі не тытунь, а наркотык, індыйская канапля. Цяпер нашыя мужыкі не лётаюць у вырай, зноў перайшлі на самасад і самагонку, а па начах і пра нас не забываюцца.

Так што ўсё ў нас, дзякуй Богу, у парадку.

# БЕДНЫ ПУШКІН

Як стварыць шэдэўр? Вас не вельмі цікавіць гэтае пытанне? А мяне надта хвалюе. Кажуць: талент, натхненне... Усё гэта так. Але ў адных Муза, можна сказаць, начуе, а да іншыіх і не заглядвае. І як яе прыручыць, хто ведае...

Сам я пішу вершы. Зрэдку друкуюся. Але на шэдэўр мае творы не цягнуць. Да Пушкіна і Купалы далёка. А стварыць «нятленку» вельмі хочацца. Чалавек я ўпарты, таму вырашыў дазнацца: якія ж умовы патрэбны для стварэння шэдэўра? Пералапаціў горы літаратуры... У французкага паэта Арцюра Рэмбо знайшоў цікавую гіпотэзу. Ён лічыў, што сапраўднае натхненне з'яўляецца тады, калі нервы творцы ўзбуджаны да надзвычайнай ступені. І нібыта такога стану чалавек можа давесці сябе галадам, ужываннем спіртнога... Ды нервовымі стрэсамі. «Трэба паспрабаваць! — цвёрда вырашыў я. — Дзеля стварэння шэдэўра на ўсё можна пайсці».

Хоць стрэсаў у жытцы нашай і так хапае, але я вырашыў колькасна павялічыць іх... Пасварыўся з

жонкай, на працы нахаміў кіраўніцтву, заплаціў штраф за безбілетны праезд. Адчуваю — нервы на ўзводзе. Пачаў галадаць. Праз тры дні, прызнацца, ледзь перастаўляў ногі. На чацьвёрты дзень вырашыў: пара! Купіў бутэльку гарэлкі. Апаўночы, калі ў кватэры ўсе моцна спалі, я запаліў свечку, узяў бутэльку, чысты акруш паперы й сеў за пісьмовы стол. Выпіў першую чарку. Спіртное адразу ўдарыла ў галаву. Праз паўгадзіны выпіў яшчэ. У галаве мроіліся нейкія думкі й вобразы. Я глядзеў на зыркі агонь свечкі — пакуль ён не пачаў дваіцца, але Муза не прыходзіла. «Можа, дозу павялічыць?» — падумаў я. Кульнуў цэлую шклянку... На гэтым мае ўспаміны абрываюцца. Ачуняў толькі раніцай за пісьмовым сталом. Свечка даўно дагарэла... Страшэнна балела галава. Але на акрушы паперы быў напісаны радок. Значыць, Муза прылятала!

Дрыжачымі рукамі я ўзяў паперу і прачытаў:

— Мороз и солнце, день чудесный!

Да чаго ж хораша! Толькі ж нешта знаёмае... Зноў Пушкін мяне апярэдзіў! О, колькі ж давялося выпіць Аляксандру Сяргеевічу, каб стварыць свой шэдэўр?!. Вось на якія ахвяры прыходзіцца ісці нам, паэтам.

Аднак жа я на гэтым не супакоюся. Буду тыдзень галадаць, развядуся з жонкай і куплю скрыню гарэлкі. На добры верш, думаю, хопіць!

# АДВУЧЫЎ...

Гісторыя гэта здарылася ў тыя часы, якія цяпер называюць «застойнымі». Я пасля заканчэння інстытута і армейскай службы ўладкаваўся на працу настаўнікам спеваў у адну з мінскіх школ. Усё было б нядрэнна, але дырэктар школы, Вера Захараўна, якая вельмі любіла рабіць праборкі настаўнікам і вучням, панадзілася хадзіць да мяне на ўрокі. У кожнага настаўніка паджылкі трасуцца, калі на яго ўроку за апошняй партай красуецца не другагоднік Сідараў, а грозная постаць кіраўніка школы, які фіксуе ўсе твае хібы й метадычныя памылкі. Ад хвалявання заплятаецца язык, і гэтых памылак робіцца ўдвая больш. У мяне пачыналі ўжо здаваць нервы, але пазбегнуць назойлівага прысутнічання дапамог адзін выпадак...

Я праводзіў урок спеваў у шостым класе. Пасля званка ў класс зайшла Вера Захараўна і, акінуўшы мяне і вучняў ледзяным позіркам, пашыбавала за апошнюю парту. Тэма ўрока была такая: «Вывучэнне гімнаў». У тыя часы быў строгі загад зверху, каб усе

вучні, пачынаючы з першага класа, ведалі Гімн Савецкага Саюза, Гімн БССР, а старэйшыя — яшчэ і Інтэрнацыянал. Партыйным босам было бальзамам на душу чуць, як маленькія дзеткі, якія і чытаць яшчэ не ўмелі, тонкімі галасочкамі выспеўвалі: «...великий, могучий Советский Союз».

Я пачаў урок, кажу:

— Дзеці, зараз мы з вамі праспяваем Гімн Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік... Пеця, як трэба сябе весці пры выконванні гімна?

— Трэба стаяць па стойцы смірна!

— Правільна, малайчына!

Я ўзяў на баяне першы акорд. Трыццаць пяць вучняў бадзёра ўскочылі на ногі. Яны з вялікім натхненнем, але без усялякага слыху загарланілі:

— Союз нерушимый республик свободных
сплотила навеки великая Русь...

Ад рэзанансу задрыжэла шкло ў вокнах, а мясцовыя сабакі заліліся брэхам. Разам з вучнямі вымушана была ўстаць і Вера Захараўна. Адстаяўшы тры куплеты з прыпевам, яна з бачнай палёгкай села за парту.

Я працягваў урок:

— А цяпер мы выкананаем Гімн Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі... Міхась, напомні ўсім, як трэба сябе весці ў час выканання гімна?

— Трэба стаяць смірна!

— Малайчына!

Я зайграў. Вучні ўскочылі з-за партаў і дружна заспявалі:

> — Мы, беларусы, з братняю Руссю
> разам шукалі к шчасцю дарог...

Павагаўшыся, устала і дырэктар. Калі скончылі спяваць, вядома ж, я працягваў урок, кажу дзецям:

— Цяпер мы з вамі будзем спяваць інтэрнацыянал — гімн камуністаў усяго свету...

Дзеці ўсталі й заспявалі:

> — Вставай, проклятьем заклеймённый,
> весь мир голодных и рабов...

З вялікай неахвотай устала і Вера Захараўна. Добрых пяць хвілін яна слухала натхнёныя словы пра тых, «кто был никем, а станет всем».

Больш да мяне на ўрокі яна не прыходзіла.

# ДЗЕДАВА ЛАСКА

Начальнік райаддзела міліцыі Сазонаў сабраў сваіх падначаленых на ранішнюю планёрку. Разгледзеўшы галоўныя пытанні, ён сказаў:

— Паступіла заява ад грамадзянкі Гурко з вёскі Тараскі. Жанчына скардзіцца на самагоншчыкаў, у якіх яе муж прапівае ўсе грошы... — І прыводзіць спіс з дзевятнаццаці прозвішчаў. — У вёсцы 55 двароў. Значыць — кожны трэці самагоншчык. Каго пашлём у рэйд?

— Прапануем старшыню Цыбульку... Ён сівушны прадукт за кіламетр чуе! — загаманілі супрацоўнікі.

— На гэта ў яго талент — пад зямлёй унюхае, — з іроніяй сказаў Сазонаў. — Жонка скардзілася, што закапала ў садзе скрынку гарэлкі на вяселле дачкі, дык яе Шэрлак Холмс знайшоў, выпіў з сябрамі, а ў бутэлькі party наліваў вады. Потым на вяселлі было не абрацца сораму перад гасцямі. Што скажаш, Цыбулька?

— Вінават, таварыш падпалкоўнік!.. Больш такога не паўторыцца, — бадзёра адказаў Цыбулька, чырвоны твар якога паказваў на рэгулярнае ўжыванне моцных напояў.

— Маўчы лепш, — махнуў рукой начальнік. — Добра, Цыбулька ў нас будзе замест пошукавага сабакі, а з ім паедуць інспектары Парцянка і Замойскі. І глядзіце — каб на рабоце ні-ні! Адпраўляйцеся!

У Тарасках справа пайшла весела. Цыбулька сваім звышнюхам знаходзіў самагонку і брагу, дзе б іх ні хавалі. Вадкасць вылівалі, самагонныя апараты зносілі ў машыну, складалі акты — справа кіпела. Бабулькі плакалі, дзяды пахмурна смалілі самасад, але што зробіш... Нарэшце, і апошні адрас. Зайшлі.

— Ну што, дзед, прызнайся шчыра, — сказаў Цыбулька. — Самагонку гоніш?

— Як на духу, сынок, зрэдку ганю для медыцынскіх мэтаў... У мяне хворы страўнік, дык я першачку настою на прапалісе і па лыжцы ўжываю — вельмі памагае!.. А бабулі сваёй націранне раблю ад радыкуліта, — не надта палохаючыся дадаў рухавы дзядок.

— Гм... Пяршак на прапалісе? — задумаўся Цыбулька і аблізнуўся. — Нядрэннае, напэўна, пітво.

— Дык, можа, пакаштуеце?.. — смела прапанаваў дзядок. — У мяне і мядок ёсць.

— Ну што, сябры, праца закончана... Давайцека здароўе паправім, — прапанаваў Цыбулька.

Яго калегі, убачыўшы на стале талеркі з грыбамі, ружовым салам і графін з карычневай вадкасцю, не змаглі ўстаяць.

— Давайце, сыночкі, за ваша здароў'е, каб вам жыць да ста гадоў і гора не знаць! — павёў рэй дзядок, наліўшы міліцыянерам па добрай чарцы й крыху капнуўшы сабе.

Усе дружна кульнулі.

— Смаката... Пахне шакаладам — не горш, чым армянскі каньяк! — з захапленнем сказаў Цыбулька.

— Моцная, аж дух перахоплівае! — падтрымаў Парцянка.

Хударлявы Замойскі прамаўчаў, бо не да размоў было — налёг на сала.

— Давайце, хлопцы, па другой, каб першай сумна не было! — прапанаваў дзядок, наліваючы ўсім па паўнюткаму кілішаку.

— Давай, дзед!.. Толькі акт мы на цябе ўсё роўна складзем, — сказаў Цыбулька.

— Што ж, ваша служба такая, я не супраць.

Пасля трэцяй чаркі Парцянка заўважыў на шафе гармонік.

— О, дык у цябе і музыка ёсць. Давай сюды! — закамандаваў ён.

Праз хвіліну ад песні «Распрагайце, хлопцы, коней» задрыжэла шкло ў вокнах.

Дзядок наліў другі графін. Калі й гэты апусцеў, хлопцы выйшлі ў сад пакурыць.

— Ну што, Мікола? — Цыбулька звярнуўся да Парцянкі. — Паспрачаемся, можа, на бутэльку, што ты з пятнаццаці крокаў не патрапіш у гэтую бляшанку, а я пападу!

— Згодзен!

Яны дасталі табельную зброю, і над вёскай панеслася страляніна. Пасля Замойскі, які трымаўся на нагах больш упэўнена, з цяжкасцю запіхаў сваіх сяброў у машыну, сеў за руль — і «Газік», выпісваючы па дарозе «васьмёркі», пакаціў у бок райцэнтра.

Раніцай Цыбулька прачнуўся на канапе. Жонкі дома не было. Скіпалася галава. Дрыжачай рукой ён паліў на макаўку вады й зірнуў у люстэрка. Жах! Фінгал аднекуль з'явіўся. Цыбулька намацаў кабуру... і калені яго падагнуліся. Пісталета не было! Ён перавярнуў усё ў хаце — няма!

Цыбулька пабег да Парцянкі.

— Мікола, я зброю згубіў! — ледзе не плачучы, сказаў ён. — Ты не ведаеш, дзе я мог пасеяць пісталет?

— Можа, у машыне? Пойдзем да Замойскага, ён быў самым цвярозым з нас... Ну і самагон у дзеда — збівае з ног, як снайперская куля!

У машыне пісталета не знайшлося, і Замойскі нічога не ведаў.

— Трэба ехаць да дзеда і там пашукаць, — вырашыў Парцянка.

...Дзядок сустрэў іх ветлівай усмешкай, пацікавіўся:

— Як маецеся, хлопцы?..

— Ты майго пісталета не знаходзіў, дзед?.. — спытаў ніякавата Цыбулька.

— Што, зброю згубіў?.. А-я-яй! Гэта ж падсудная справа... Пісталет можна пашукаць, толькі й вы мне дапаможаце. Гною ў мяне ў хляве цэлая гара. Трэба яго на агарод вывезці. А я тым часам коніка запрагу і зброю пашукаю.

Цэлы дзень Цыбулька, Парцянка і Замойскі вывозілі гной. Пасля пятнаццаці рэйсаў хлеў апусцеў, рукі пакрыліся крывавымі мазалямі, а пах ад міліцыянераў ішоў такі, як быццам яны ўсё жыццё працавалі даглядчыкамі жывёлы.

— Вось якія малайцы, сыночкі... Пісталет я ўсё ж такі знайшоў, — весела пахваліўся дзядок. — Можа, выпіце па кілішаку? Не?.. То хоць падзяку напішу вашаму кіраўніцтву за дапамогу старым, га?

— Не трэба, дзед, ні кілішакаў, ні падзякі, — пахмурна звёў бровы Цыбулька, забіраючы зброю.

Міліцэйскі газік, пакідаючы за сабой шлейф дыму і ядраны пах гною, ірвануў у бок райцэнтра.

# ПСІХАЛОГІЯ ПАДВЯЛА

Старшына дарожнай аўтаінспекцыі Пётр Свістуноў знаходзіўся на сваім любімым месцы. Дарога пасля імклівага спуску ішла пад гару, а на пад'ёме стаяў знак абмежавання хуткасці да сарака кіламетраў у гадзіну. Вельмі разумны чалавек прыдумаў гэты знак, напэўна, сам калісьці быў аўтаінспектарам. Помнік яму трэба паставіць!

Звычайны круглы кавалак бляхі, а калі падлічыць грошы, якія заплацілі аўтааматары, то ён даўно ўжо мог быць залатым. Многім вадзіцелям не хацелася ў гэтым месцы пераходзіць на больш нізкую перадачу, і яны ціснулі на газ, каб лягчэй уз'ехаць на гару, а тут з-за кустоў з'яўляўся ён, інспектар Свістуноў, са сваім чарадзейным жэзлам — і чарговая ахвяра лезла ў кішэню па грошы на штраф.

Школу Пеця Свістуноў скончыў з цяжкасцю. Ён блытаў сінусы з косінусамі, «Вайну і мір» адужаў толькі да пятай старонкі, і настаўнікі ўздыхнулі з палёгкай, калі яго ўдалося выпіхнуць са сцен сярэдняй навучальнай установы. Затое ўжо ў падлеткавым

узросце ў хлопца праявіўся талент псіхолага. Ён дакладна ведаў у каго з сяброў можна «стральнуць» цыгарэту і ў каго з дзяўчынак спісаць кантрольную. І яшчэ ён ведаў выявы ўсіх амерыканскіх прэзідэнтаў, якія былі надрукаваныя на далярах. Настаўніца гісторыі, паказваючы на партрэт, пыталася: «Хто гэта?». Пеця бадзёра адказваў: «Жорж Вашынгтон! — і ўдакладняў: — Дзесяць даляраў». За гэтыя ўдакладненні, аднак, адзнака яму не павышалася. Больш за ўсіх гістарычных дзеячаў Пеця паважаў прэзідэнта Злучаных Штатаў Франкліна, хоць і не быў знаёмы з яго біяграфіяй.

Але Свістуноў быў упэўнены, што трэба быць выключным чалавекам, каб твой партрэт друкавалі на стодоларавай купюры.

Пасля службы ў аўтамабільным дывізіёне Свістуноў уладкаваўся на працу аўтаінспектарам. Вось дзе ён змог у поўнай меры раскрыць свой талент псіхолага!

Усе аўтааматары ў яго былі раздзелены на пэўныя катэгорыі па прынцыпу: з каго можна ўзяць, а з каго не. Уладальнікаў «Запарожцаў» і «Масквічоў» Свістуноў не чапаў: што з іх возьмеш?!. Гаспадароў «Мерсэдэсаў» і «Аудзі» таксама лепш прапусціць — можна на кіраўніцтва нарвацца, альбо на вельмі «крутых». Самымі лепшымі кліентамі Свістуноў лічыў уладальнікаў патрыманых «Фордаў», «Опеляў»

і «Фольксвагенаў». Гэтыя людзі гадамі адмаўлялі сябе ва ўсім, каб прыдбаць жаданую іншамарку. Праз пэўны час яны з жахам бачылі, што машына, як ненажэрны Молах, патрабуе новых ахвяр у выглядзе запчастак, страхоўкі, бензіну. Гэтыя людзі зразумелі галоўную аксіёму: калі хочаш катацца — трэба плаціць. І яны плацілі без асаблівых скаргаў.

Свістуноў убачыў, як з хуткасцю больш за сотню кіламетраў пранеслася шыкоўнае «БМВ». «Стрыжаныя браткі панесліся, — падумаў інспектар. — Я іх не чапаю, яны мяне таксама. У кожнага свой фронт працы... А вось коціць патрыманы «Форд». Хуткасць не перавышае, але ўсё роўна — мой кліент!»

Свістуноў выйшаў на дарогу і жэзлам загадаў вадзіцелю спыніць машыну.

— Інспектар Свістуноў... Прашу пасведчанне вадзіцеля, — казырнуўшы, прамовіў ён строгім голасам.

Яму падабалася назіраць за той палахлівасцю, з якой ні ў чым не павінныя людзі таропка шукалі правы й дрыжачымі рукамі працягвалі яму. Ён цяпер для іх не Пеця Свістуноў, а Прэзідэнт гэтай гарушкі, які можа зрабіць усё, што захоча.

— Так... Пакажыце аптэчку.

— Калі ласка...

— Цяпер — аварыйны знак і вогнетушыцель.

— Калі ласка...

— Хм... Добра. — Інспектар дастаў лінейку і схіліўся да кола. — Што ж гэта вы, грамадзянін Спірыдонаў, ездзіце на «лысай» гуме? Вышыня пратэктара ўсяго паўтара міліметры, а павінна быць не менш, чым адзін і шэсць. Гэта грубае парушэнне. Будзеце плаціць ці забраць правы?..

— Буду плаціць, — вымавіў разгублены Спірыдонаў. — Колькі трэба?

— Па закону — пяць тысяч... Але для вас зраблю скідку: давайце тры, — міралюбіва сказаў Свістуноў.

Задаволены «кліент» хуценька адлічыў тры тысячы.

— Вялікі дзякуй! — сказаў ён і ў вомігі вока змыўся са злашчаснага месца.

Квітанцыю інспектар, вядома ж, не выпісаў, а грошы спакойна паклаў у кішэню.

«Ага! Бяжыць блакітны «Гольф». Хуткасць пяцьдзесят... Тармазнём!»

Машына спынілася. Дверцы адчыніліся і... Свістуноў ажно вочы прыжмурыў ад захаплення: малочна-белыя жаночыя калені ледзь прыкрывала міні-спадніца. Свістуноў з цяжкасцю адарваў позірк ад гэтага хараства і паглядзеў вышэй. Пышныя грудзі й халёны твар прывабнай бландзінкі дапаўнялі ўражанне.

— Парушаем правілы, — няўпэўнена вымавіў інспектар.

— Мой жэнераль, можа, вы як-небудзь вечарам дадзіце мне ўрок ваджэння?.. Вось мая візітоўка, — прамурлыкала бландзінка і соладка ўсміхнулася.

— Вядома... Няма праблем! Шчаслівай дарогі! — інспектар бадзёра казырнуў і памахаў даме ручкай, падумаўшы: «Якая краля!.. З вялікім задавальненнем дам ёй урок начнога ваджэння па перасечанай мясцовасці...»

Працоўны дзень заканчваўся. У кішэні Свістунова ляжаў добры стос купюр, не абкладзеных налогам. Ягоны звычайны дзённы заробак. Нездарма ж, калі пасля смерці гаішнік папаў да Святога Пятра і той прапанаваў яму выбіраць дарогу ў пекла альбо ў рай, гаішнік папрасіў: «А можна — я пастаю тут, на пераскрыжаванні?..»

«Пара збірацца дадому. А вечарам — патэлефаную шыкоўнай бландзінцы... У-у, «Волга» ляціць. Тармазну, — вырашыў Пётр-даішнік, бо ў яго не хапала акурат усяго толькі пяці тысяч да сотні».

— Добры вечар!.. Інспектар Свістуноў... Прад'явіце ваша пасведчанне вадзіцеля, — жорсткім голасам загадаў інспектар.

— Калі ласка, — надзіва ветліва адказаў мужчынаакулярык, якому было недзе гадоў каля пяцідзесяці.

Свістуноў уважліва ўсё праверыў і не знайшоў да чаго б прычапіцца. Але на тое ён — інспектар, і парушэнне адшукае!

— Праверым камплектаванне аптэчкі... — І стаў поркацца ў аптэчцы. — Бінт, жгут, валідол на месцы. А дзе тры прэзерватывы? — спытаў нібы жартам, бо ведаў, што камплектаванне з імі аптэчак ужо адмянілі. — Няма?.. А гэта ж самае што ні ёсць парушэнне. З вас штраф — пяць тысяч.

— Хай сабе і пяць, — тут жа пагадзіўся «інтэлігент», як яго ў думках «ахрысціў» Свістуноў. — Толькі выпішыце, калі ласка, квітанцыю, бо перад жонкай трэба зрабіць справаздачу — гэта, думаю, яна і пачысціла аптэчку.

«Не пашанцавала», — падумаў інспектар, выпісваючы квітанцыю. Сказаў ветліва:

— Вось, атрымайце...

— А цяпер, інспектар Свістуноў, дазвольце адрэкамендавацца: я — новы старшыня райвыканкама Лявон Міхайлавіч Філімонаў. Прыемна, што вы клапоціцеся аб процізачаткавых сродках... Толькі гэта не ўваходзіць у вашыя абавязкі. І вось што, інспектар Свістуноў: на вас шмат скаргаў ад аўтааматараў, а цяпер — я сам убачыў, як вы працуеце... Заўтра ў дзевяць гадзін раніцы прашу вас быць у маім кабінеце. Вашае кіраўніцтва таксама будзе запрошана. Прыйдзецца вам памяняць жэзл на рыдлёўку, — сказаў «інтэлігент» і паехаў, пакінуўшы аслупянелага Свістунова на яго любімым месцы, дзе хутка будзе стаяць іншы шчаслівчык.

## ЯК ПАКІНУЦЬ СЛЕД НА ЗЯМЛІ?

Кажуць, што жыццё пражыта не дарэмна, калі ты пасадзіў дрэва, пабудаваў дом і ўзгадаваў сына. Дажыў я да паўсотні гадоў — трэба і мне нейкія вынікі падвесці. Дрэў пасадзіў не адзін дзесятак — значыць, план перавыканаў. Займеў дачку і сына, род не перавёў. Добра. З домам складаней, бо жыву ў гарадской кватэры...

Пачаў я думаць, — а што б замест дома пасля сябе пакінуць? І прыдумаў: трэба стварыць мастацкі твор, які застанецца ў памяці нашчадкаў. Дом можа згінуць або згарэць, а мастацтва — вечнае! Такая думка мне спадабалася.

З чаго лепш пачаць?

«А паспрабую-такі я свае сілы ў паэзіі!..» — спакусліва падумаў я. І што ж? Два тыдні тварыў — не спаў па начах, пакутліва падбіраў рыфмы, шукаў вобразы й метафары. Атрымалася чатыры вершы. Для пачатку прачытаў іх жонцы.

Тая аж праслязілася:

— Міхасёк, ды ты ў мяне — талент! Хутчэй станавіся знакамітым паэтам, то, можа, хоць раз

у жыцці купіш мне футру альбо звозіш адпачыць на які-небудзь курорт.

Ах, жанчына, як можна мастацтва разменьваць на грошы! Але я не спрачаўся з ёй — занятак безнадзейны. Узяў вершы й пайшоў да рэдактара «тоўстага» часопіса — знакамітага паэта. Ён ветліва мяне прыняў, вершы мае паклаў на свой стол і папрасіў зайсці праз тыдзень. Гэты тыдзень быў я сам не свой, бо вырашаўся мой лёс. І вось — я зноў перад галоўным редактарам. Ён трымае мае вершы, пакрэсленыя ў розных месцах алоўкам і кажа:

— Гэта добра, што вы, хоць і пазнавата, пачалі пісаць. Цютчаў з Аксакавым пад старасць стварылі шэдэўры. Але ж і пісаць трэба толькі тады, калі не пісаць немагчыма. Сякія-такія здольнасці ў вас ёсць, іх трэба развіваць. Але і хібаў зашмат. Вось рыфма «свая-зямля» нікуды не годная. Вы ўспомніце, што сам Маякоўскі за трапную рыфму нават грошы плаціў, а якія ў яго былі нечаканыя рыфмы: «обоюдоострая-двухметроворостая». Бліскуча! А вось тут у вас напісана «разліўшайся шчодра ракой». Што гэта за шыпенне? І яшчэ: «ра-рак»? Вужакі й ракі — гэта дрэнна. Паслухайце, паважаны, вазьміцеся лепш за прозу! Думаю, у вас лепш атрымаецца... Жадаю поспехаў! — З гэтымі словамі ён пацiснуў мне руку і мы развіталіся.

«А што, — думаю, — напішу апавяданне. Гэта ж — куды лягчэй, чым верш».

Узяў цікавы выпадак са свайго жыцця і за тыдзень аформіў яго ў выглядзе апавядання. Прачытаў жонцы. Лепш бы я гэтага не рабіў! Яна адразу прычапілася:

— Што гэта за Вера, з якой ты пазнаёміўся ў час адпачынку?.. Адказвай!

— Усяго толькі мастацкі вобраз, даражэнькая. Ты не ўспрымай усё так літаральна!

— Я табе пакажу «вобраз»! Гэта «вобраз» табе некалькі разоў тэлефанаваў і пісаў пісьмы пасля паездкі на Нарач?

Ледзь супакоіў жонку. Панёс свой твор да вядомага празаіка. Той пры мне яго прачытаў і сказаў:

— Добра, што вы ўзяліся за пяро. Відаць, патрабаванне душы. Але сюжэт у вас занадта банальны: звычайны «курортны раман». Тут не хапае напружання... Жыццё, ведаеце, імклівае... А вы зрабіце вашага героя засакрэчаным фізікам, а Веру — замежнай шпіёнкай. Дабаўце некалькі забойстваў, парачку «гарачых» інтымных сцэнак — і чытача за вушы не адцягнеш ад вашага апавядання. А яшчэ лепш — напішыце гумарэску, бо ў вас адчуваюцца здольнасці сатырыка. Поспехаў Вам!

«Што ж, — думаю, — гумарэску дык гумарэску. Чэхаў таксама з гумарэсак пачынаў. Толькі трэба знайсці вострую тэму ды прапясочыць тых, хто парушае закон».

Тэму знайшоў. Напісаў. Прачытаў жонцы.

Тая залямантавала:

— Ты хоць пад старасць пажыві спакойна! Цябе за тваю пісаніну хутка прыстукнуць у пад'ездзе!

Але я мужна пайшоў у рэдакцыю сатырычнага часопіса. Там мне сказалі:

— Ваш матэрыял вельмі востры, але ён кідае цень на Міністэрства гандлю. Таму ўсё трэба праверыць...

— А колькі часу будзеце правяраць?

— Не ведаю... І наогул — у нас чарга. Чакайце, але добра было б, каб вы паспрабавалі свае сілы ў паэзіі. Можа, у Вас атрымаецца.

— Не! — кажу. — Лепш я пабудую дом! — З гэтымі словамі й выйшаў, пакінуўшы рэдактару магчымасць паламаць галаву над маімі словамі.

Ён хай падумае, а мне і вам і так усё ясна!

# НЯЎДАЛАЕ СПАТКАННЕ

Я цяпер ужо ніколі не ажанюся. А навошта? Аднаму лепш. Да трыццаці хадзіў у халасцяках, буду хадзіць і далей. І не тое, што які-небудзь я жанчынаненавіснік, не. Але лічу, што жанчына павінна быць упрыгожваннем нашага жыцця. А на самой справе што атрымліваецца? Не паспее нявеста скінуць вясельную сукенку, як з райскай птушкі ператвараецца ў шэрую курыцу — ходзіць перад мужам у мятым халаце, непрычасаная і без усялякай касметыкі. А калі вас кожны дзень будуць карміць самым лепшым мясам без разнастайнага гарніра, то праз два тыдні вы на яго глядзець не зможаце. Дый жанчыны пайшлі цяпер такія, што адно трымайся! Я гэта праверыў на сваім горкім вопыце.

Сябры й знаёмыя дасталі мяне: « Жаніся ды жаніся!» А што, думаю, можа, і праўда? Толькі як жа лепей пазнаёміцца з добрай жанчынай? Вырашыў: пачытаю аб'явы ў газетах. Чытаю:

«Уладалюбівая сэксапільная бландзінка з пышнымі формамі шукае забяспечаннага бізнесмена».

Не, гэтая не падыдзе — не люблю, каб мной камандавалі, дый які з мяне бізнесмен?

Чытаю далей:

«Інтэлігентная, абаяльная дзяўчына з ізумруднымі вачыма шукае свайго багатага гаспадара».

Таксама не падыходзіць... Ну які з мяне багацей?

А можа, гэтая?

«Зграбная, сімпатычная жанчына, пяшчотная і ласкавая шукае сваю другую палову».

Трэба патэлефанаваць. Набіраю нумар. Жаночы голас адказвае, што завуць яе Алёнай, што яна рада знаёмству і запрашае ў суботу да сябе на госці.

Я пачаў рыхтавацца. Купіў бутэльку шампанскага, каробку цукерак, шыкоўны букет, адпрасаваў свой лепшы касцюм і ў вызначаны час быў каля дзвярэй яе кватэры. Званю. Адчыняе мне здаравенны амбал на добрым падпітку. Я пытаюся Алёну.

— Я братан ейны, — кажа амбал. — Заходзь, Алёна зараз будзе.

Распранаюся, заходжу.

Бачу пакой, дзе рамонт не рабілі з моманта атрымання кватэры, абстаўлены, мякка кажучы, вельмі сціпла. Вельмі сціпла — гэта хісткі стол, некалькі табурэтак і прадаўленая канапа, якая не стала б упрыгожваннем нашага сметніка. З-за стала, загрувашчанага пустымі бутэлькамі й парэшткамі ежы, на мяне пазіралі восем

пар мутных вачэй, дзе-нідзе ўпрыгожаных рознакаляровымі «ліхтарамі». Наогул, твары без прыкмет інтэлігентнасці, затое рукі ў блакітных наколках маглі лепш любой анкеты паведаміць біяграфіі гаспадароў.

— Так, хлопец, — кажа той, што назваўся братам, — усе мы тут родныя і знаёмыя Алёны. Нас вельмі хвалюе яе лёс, таму хочам сур'ёзна з табой пазнаёміцца. За знаёмства трэба выпіць, але ў нас зараз пэўныя фінансавыя цяжкасці, таму, калі ты выдзеліш тысяч дзесяць, Тарзан зганяе ў краму.

Прыйшлося мне раскашэліцца. Пры гэтым я ледзь не ўмольна параіў:

— Толькі не бярыце «чарніла»... І вазьміце чаго-небудзь закусіць.

— Няма базару!.. — узрадавана ўсклікнуў рухавы Тарзан і знік за дзвярыма.

Неўзабаве на стале аказаліся тры бутэлькі гарэлкі, бохан хлеба, дзесятак яек і бляшанка кілек у таматным соўсе.

— Гэта здорова!.. — радасна гаманілі мае новыя знаёмыя.

— Сядай і ты з намі...

— І давай сюды свой венік!

Мой шыкоўны букет з сямі белых ружаў быў пастаўлены ў трохлітровы слоік, дзе адзінока плаваў недаедзены агурок. Мне налілі амаль поўную шклянку гарэлкі.

— За знаёмства!..

— Пі да дна, каб была Алёна відна...

Прымусілі выпіць да кроплі. Я звычайна па святах выпіваю, але ж не такімі дозамі!

— А дзе ж усё-ткі Алёна? — спытаў я, праглынуўшы кільку не жаваўшы.

— Яна падыдзе, чакай, — адказаў яе брат, якога ўсе прысутныя звалі Рэмба, і выйшаў у суседні пакой.

Праз колькі хвілін разам з ім з'явілася заспаная кабета нявызначанага ўзросту — у дамашнім халаце, па якім плакаў прас, і хатніх панчохах на босую нагу.

— Давайце знаёміцца — мяне завуць Алёна, — яна падала мне руку і ўсміхнулася, паказваючы адсутнасць двух пярэдніх зубоў.

— Вельмі прыемна... Васіль, — збянтэжана прамармытаў я.

— Табе — што: не падабаецца мая сястра?!. — пагрозна прагракатаў Рэмба.

— Не-е, што ты!.. Вельмі нават падабаецца, — паспешліва адказаў я.

— О-о, ёсць «шампунь»! — усміхнулася Алёна. — Хачу «белага мядзведзя!»

— Хвілінку, зробім!.. — адказаў Тарзан.

Корак з-пад шампанскага з трэскам ударыў у столь. Усім налілі шклянкі гарэлкі й далілі шампанскага.

— За мілых дам! Прашу ўстаць!.. — камандаваў Рэмба.

Алёна так зухавата асушыла сваю шклянку, што ў мяне аж вочы на лоб палезлі. Яна тым часам закінула нагу за нагу, адкрываючы вялізны сіняк на калене, і закурыла «Прыму». З лямантам у пакой уварваліся чумазыя дзеці: хлопчык гадоў пяці й крыху старэйшая дзяўчынка.

— Мама!..

— Мама!..

— Мы есці хочам! — абодва падбеглі да Алёны.

— Дзеці, гэта — ваш будучы тата... Ён вам цукеркі прынёс!

Узрадаваныя, малыя схапілі каробку цукерак і зніклі ў суседнім пакоі. Я ўжо крыху захмялеў, але ад перспектывы стаць бацькам двух дзетак адразу працверазеў.

— Цябе, можа, дзеці палохаюць, дарагі? — нібы прачытала мае думкі, пасунулася да мяне бліжэй Алёна. — Не турбуйся — мы іх у дзіцячы дом зафундычым!

Тым часам з'явілася гітара. Ад слоў песні «Таганка, вы ночи полные огня, Таганка, зачем сгубила ты меня?..» — дрыжалі сцены, гайдалася, як ад ветру, лямпачка ў чорным парэпаным патроне.

Алёна запрасіла мяне на танец і, абхапіўшы за шыю рукамі, задыхала ў твар перагарам.

— Вася, я ад цябе балдзею! Пойдзем у спальню... — горача шапнула яна.

— Пачакай крыху... Няма куды спяшацца, пасядзім яшчэ, — я аднекваўся, як толькі мог.

— Ужо ўсё выпілі! — голасна залямантаваў Рэмба. — Вася, брат, давай-ка грошы!

Я дастаў партманэ, каб адлічыць грошы, але Рэмба рашуча вырваў яго з маіх рук.

— Здачу прынясу! — заявіў ён.

...Больш ні партманэ, ні грошай я не бачыў.

Не буду апісаваць тую оргію, што адбывалася далей. Праз пару гадзін, калі ніхто з прысутных ужо не трымаўся на нагах, мне ўдалося-такі збегчы ад сваёй «нявесты», пакуль тая тузалася ў чэпкіх абдоймах Тарзана. Ляжалі яны на канапе. Дзверы ў пакой былі расчыненыя напята.

З таго часу я не веру ні салодкім аб'явам, ні абяцанням зямнога рая побач з жанчынай. І многія жанатыя сябрукі мне зайздросцяць.

# АРХІДЭЯ

Для каго і ананасы не ласунак, а для нас — бульба галоўная смаката! Пятроўна не магла нарадавацца. Сын прывёз ёй з Мінску новы гатунак бульбы. «Архідэя» называецца. Дастаў па знаёмству аж у інстытуце бульбаводства. Бульбінкі кругленькія, жоўценькія, нібы маленькія кураняткі.

Пятроўна пасадзіла навіну на лепшым месцы. Атрымалася дзве градкі. Кожны дзень бегала глядзець, калі з'явяцца парасткі. І вось, нарэшце, дачакалася. Дружна з'явіліся ўсходы й пацягнуліся да сонейка. Вымахалі высокія, кусцістыя ды прыгожыя. Удвая вышэйшыя за суседскую бульбу. А ўжо калі зазіхацелі белыя зорачкі кветак, Пятроўна аж слязу пусціла ад захаплення. Такое хараство! Сапраўдныя архідэі!

Пятроўна ўжо марыла, які ўраджай яна атрымае, як на будучы год засее новым гатункам увесь участак на зайздрасць суседзям. Але аднойчы сярод ночы яна праз сон пачула, як нехта стукае у шыбу. Муж на суседскім ложку храпе, аж фіранкі калыхаліся. Па ім хоць ты печ разбірай — не пачуе.

Нехаця Пятроўна ўстала, выйшла у калідор. Спыталася:

— Хто?

— Я-а, га-спадыня... А-адчыняй.

Яна пазнала голас. Гэта быў яшчэ не стары мужчына, якога за п'янку выгналі з калгаса. Трэба адчайна піць, бо калгас — апошняя арганізацыя, адкуль выганяюць за выпіўку. Ён піў адчайна. І мянушка да яго прыліпла нейкая незразумелая: «Мік-Мак». Што гэта за Мік ды Мак? Мак то, вядома куды, — у чарку. А каб атрымаць гэтую чарку, ён цягнуў, што мог з дому, дый украсці мог.

— Што ты хочаш? — запытала Пятроўна.

— Бу-ульбачка ёсць... Све-эжая. Новага ураджаю. Сма-аката! Сам бы еў, ды вы-ыпіць хо-очацца, — лапатаў Мік-Мак.

У Пятроўны бульба старога ўраджаю ўжо скончылася, а маладую капаць яшчэ шкадавала. «Мо, узяць вядзерца?» — падумала яна і адчыніла калідор. Цыбаты Мік-Мак зайшоў з вуліцы й развязаў мяшок. У калідор ледзь трапляла святло, але Пятроўна заўважыла, што бульба добрая, клубні вялікія, круглыя.

— Якую плату хочаш? — спытала яна.

— Вя-адома якую... — нахабна зазірнуў ёй у вочы Мік-Мак. — Пляшку га-аручай сумесі за вя-адро. І ху-утчэй думай, бо за-асталіся два а-апошнія вя-дры.

Пятроўна аддала дзве пляшкі віна, перасыпала бульбу ў свой мяшок і аднесла ў кладоўку.

Муж працягваў храпець, а ёй не спалася — перабіў сон гэты Мік-Мак. Дый на душы было трывожна. Здагадвалася Пятроўна, што бульба была крадзенная, а на чужым дабры, кажуць, не разжывешся.

Раніцай вырашыла зварыць на сняданак маладой бульбачкі. Прынесла мяшок на кухню, дастала бульбіну і… — нож выпаў з яе рук: бульбіны былі круглыя і жоўтыя, нібы маленькія кураняткі.

Пятроўна кінулася ў агарод. На двух градках з «Архідэяй» валялася адно выдраннае каліўе. Жанчына ўпала на калені й загаласіла. Але, паплакаўшы ўволю, вырашыла, што слязьмі гору не дапаможаш — трэба «аддзячыць» крыўдзіцелю.

Яна схапіла добры дрын і рашуча накіравалася ў суседнюю вёску, дзе жыў пры сваёй маці Мік-Мак.

— Агееўна, дзе твой сын? — спытала яна.

— Спіць п’яны, дзе ж яму быць. А што здарылася?

— Зараз ён табе сам скажа, — заявіла Пятроўна і зайшла ў хату.

П’яны Мік-Мак спаў на ложку. Ён нават не распрануўся.

Ад першага ўдару ён прачнуўся, ад другога пачаў мацярыцца, ад трэцяга — завыў, нібы пераляканы

воўк. У Пятроўны сілы яшчэ хапала, і лупцавала яна напаўсоннага Мік-Мака ад усяго сэрца аж пакуль не зламаўся кіёк. Збіты Мік-Мак плакаў, размазваючы крывавыя слёзы.

— Каб ты падавіўся маёй бульбачкай, гад! Каб ты захлібнуўся маім «чарнілам», — крычала Пятроўна.

Нарэшце бразнула дзвярыма — выбегла з хаты. Больш чужога яна ніколі не купляла

## «ШЧАСЛІВЫ» НЕДАКУРАК

— Васіль, прывітанне!

Я азірнуўся. Да мяне падбягаў маладжавы мужчына ў спартыўным касцюме. Я прыглядзеўся. Божа ж мой! Ды гэта ж Міхась — былы сусед па кватэры. А трэба сказаць — быў ён не дурань выпіць, а ўжо курэц, дык з самых заядлых. Аднойчы, выпіўшы, заснуў з цыгарэтай у руцэ. Здарыўся пажар. Міхася ледзь уратавалі, а ў кватэры амаль усё згарэла. Жонка не даравала яму гэтага ўчынку: падала на скасаванне шлюбу і разменяла кватэру. Дзетак, вядома, забрала з сабой. Я думаў, што пасля гэтага Міхась зусім сап'ецца, а тут — на табе! Займаецца бегам і выглядае гадоў на дзесяць маладзей!

— Што, не пазнаеш? — смяецца Міхась. — Во! Старыя знаёмыя не пазнаюць... Зойдзем, пагутарым.

Дзень быў выхадны, я нікуды не спяшаўся, таму пагадзіўся зайсці да былога суседа.

Аднапакаёўка. Усё чыста, утульна, адчуваецца жаночая рука. І тут з пакою выходзіць Зіна, былая жонка Міхася. Вітаецца.

— Не здзіўляйся, Васіль. Міхась стаў другім чалавекам. Мы зноў разам. Дзеці выраслі. Ім пакінулі двухпакаёўку, а нам і тут месца хапае. Пойдзем на кухню, пап'ем гарбаты.

Яна прыгатавала нам духмяную гарбату на травах з мёдам і выйшла да суседкі, каб не замінаць.

Міхась пачаў сваю споведзь.

— У мяне, Васіль, зараз усё добра, і прыйсці да такога жыцця мне дапамог адзін выпадак. Гады тры назад атрымаў я кавалак зямлі пад агародніну. І вось аднойчы ў маі ўзяў я рыдлёўку, сёе-тое перакусіць і паехаў на электрычцы на сваю дзялянку. Дзень быў будні, на сотках, акрамя мяне, нікога не было. Ярка свяціла сонейка. Я распрануўся, паклаў рэчы на рукзак з прыпасамі, лёг на траўку і закурыў. Наўкола спявалі птушкі, цела абдаваў цёплы ветрык. Але пара было брацца за справу. Я ўстаў, кінуў недакурак цераз плячо, узяў рыдлёўку і стаў капаць зямлю... Папрацаваўшы з паўгадзіны, я адчуў пах дыму. Пачаў азірацца і ўбачыў, што дым валіць з таго месца, дзе паклаў свае рэчы. Калі прыбег, ратаваць ад агню было ўжо нечага. Я зразумеў, што мой недакурак трапіў у самае яблычка: згарэла вопратка, кашалёк з грашыма і праяздным, наогул — усё. Я застаўся ў трусах і красоўках. Хацелася выць ад злосці! Але ж трэба было штосьці рабіць. Пакапаўшыся рыдлёўкай на папялішчы, знайшоў ключы ад

кватэры й пайшоў на станцыю. Там схаваўся за дрэвамі — чакаў электрычку. Знайшоў старую газету, каб прыкрыцца. Калі падышоў цягнік, хуценька ўскочыў у вагон і зашыўся ў вугал, прыкрыкрыўшыся газетай. Але ўсё роўна людзі глядзелі на мяне, як на вар'ята. Увесь час я з жахам чакаў з'яўлення кантралёра, але — пранесла... З вакзала вырашыў дабірацца дамоў бягом, каб сыйсці за спартсмена. Першы кіламетр ледзь асіліў, а потым — з'явілася другое дыханне, і астатак шляху адолеў без цяжкасцей. Нават задавальненне атрымаў: аказваецца, яшчэ нешта магу! Тады якраз і падумаў: «Колькі ж цярпець мне з-за цыгарэт ды гарэлкі?!. Я ж — мужчына, у рэшце рэшт, вазьму сябе ў рукі! І ўзяў... Вось ужо тры гады не п'ю, не куру, займаюся бегам, і жыць стала цікава. Жонка да мяне вярнулася, нават вершы пачаў сачыняць! Я вельмі ўдзячны таму трапнаму недакурку, які змяніў увесь мой лёс.

# ЗМЯІНЫЯ ЗДЗЕКІ

— Вось вы кажаце: канец тысячагоддзя, год белай змяі... А што тут добрага? Усявышні нездарма пакараў змей, брыдкія гэта істоты. Я сам напакутаваўся з-за іх, вужак праклятых, ледзь за краты не трапіў. А пачыналася ўсё так добра...

Мінулым летам паехалі мы з жонкай і дзецьмі да цешчы. Жыве яна ў маленькай лясной вёсачцы на беразе сінявокай рачулкі. Прыгажосць такая, што куды там Швейцарыі! Надвор'е стаяла цудоўнае. Мы купаліся, загаралі, лавілі рыбу — наогул, адпачывалі па поўнай праграме. Ды толькі вось бяда — не было ў цешчы халадзільніка, а для мяне ў спёку выпіць сцюдзёнага малачка — найвялікшая асалода! І тут я ўспомніў — дзесьці вычытаў, што нашыя продкі для ахалоджвання апускалі ў гарлач з малаком вужа. Чаго-чаго, а вужоў у гэтых мясцінах хапала. Я іх не надта палохаўся, але калі жонка ці цешча бачылі ў траве чорны ланцужок з дзьвума жоўтымі плямамі, то спраўлялі такі візгат, што закладвала ў вушах. Аднойчы я заўважыў вужа, які грэўся на сонейку,

адзеў гумавыя пальчаткі, бо ўзяць голымі рукамі ўсё ж баяўся, падкраўся і схапіў яго. Вуж зашыпеў, паказваючы свой раздвоены язычок, але кусацца не стаў. Я прынёс яго ў хату і апусціў у гарлач з сырадоем. Сам пайшоў лавіць рыбу. Але паспытаць халоднага малачка мне не давялося, бо калі праз некалькі гадзін вярнуўся з рыбалкі, каля хаты стаяла хуткая дапамога, а санітары на насілках выносілі цешчу з пасінелым тварам. А здарылася вось што. Цешча пасля паліва зайшла ў хату і захацела папіць малачка. Узяла кубак, нахіліла гарлач, а адтуль разам з малаком плюхнуўся вуж і папоўз проста на яе. Цешча адкрыла рот, каб залямантаваць, але з горла пачуліся толькі нейкія шыпячыя гукі, як быццам яна сама перайшла на вужыную мову. Потым яна схапілася за сэрца і асунулася на падлогу. Там яе і знайшла суседка і выклікала хуткую дапамогу. На шчасце, цешчу ўдалося выратаваць, а не то плакала б па мне турма. Жонка, калі даведалася пра ўсё, учапілася мне ў валасы й тузала так, што ад маёй пышнай чупрыны застаўся абскубаны галень. Галоўны ж віноўнік гэтага здарэння некуды знік, як быццам яго забрала нячыстая сіла...

Таму, сябры, у новым годзе будзьце пільнымі й не трапляйце ў падобныя гісторыі!

# НЕШЧАСЛІВАЕ ПРАДКАЗАННЕ

Правільна кажуць: ад лёсу не ўцячэш, што накавана, тое і збудзецца. Колькі гадоў таму нагадала мне цыганка: «Сцеражыся, з-за пчол страціш свой аўтамабіль».

— Што яна — блёкату аб'елася? — думаю. — Якія пчолы, які аўтамабіль?.. Няма ў мяне ні таго, ні другога.

Але праз колькі часу завёў я пчолак, а ў мінулым годзе прыдбаў і патрыманае аўто. Прадказанні пачалі збывацца, але я тады не прыдаў гэтаму аніякай увагі. І вось — у жніўні вырашыў дастаць мёд з вулляў. Пчолы вельмі не любяць гэтую працэдуру: каму ж хочацца дзяліцца салодкім золатам, якое яны руплiва назапашвалі на ўсю зіму. Пчаляр працуе ў спецыяльнай вопратцы, але і яму дастаецца джалаў, а ўжо калі побач акажуцца чалавек ці жывёла, дык яны будуць даваць дзёру, куды Макар цялят не ганяў.

Зняў я вечка з вулля, адганяю пчол дымам, а яны са злосным гудам носяцца наўкола, нібы пікіруючыя «Юнкерсы». У гэты час, як па загадзя напісаным

сцэнарыі, сусед прыехаў дамоў на кані й прывязаў яго да плоту. Коні ж баяцца пчол болей, чым ваўкоў, бо дастаткова некалькіх укусаў, каб жывёліна адкінула капыты. І тут мае раз'юшаныя пчолы якраз і накінуліся на беднага каня. Ён сарваўся з прывязі й ракетай паімчаў на вуліцу. Калі б хто паспеў засекчы яго хуткасць — кніга Гінеса абнавілася б яшчэ адным рэкордам. І вось гэты, напалоханы да жаху Пегас, выхапіўся на дарогу. А там — на іншамарцы ехаў малады хлопец. Нечакана перад сабой ён ўбачыў прывід у выглядзе шалёнага каня, ударыў па тармазах, крутнуў руль ўлева, каб пазбегнуць сутыкнення, і... сустрэўся з прыдарожным электрычным слупом. Хлопец застаўся жывы, толькі з таго часу крыху заікаецца, а ягоная іншамарка ператварылася ў груду каляровага металу. Каня знайшлі ажно на другі дзень у суседнім раёне. Ён мірна скуб траву, забыўшыся пра ўчарашнія жахі.

Справа дайшла да суда і, каб разлічыцца за разбітую машыну, мне прыйшлося прадаць сваю і яшчэ залезці ў пазыку. Як жа пасля гэтага не верыць прадказанням!

Цяпер, калі мне нагадаюць, што я ўтаплюся, дык адразу пайду на рэчку і, не трацячы лішнія сілы, буду апускацца на дно.

# МАЛОЧНЫ РУЧАЙ

Ганна Бузукова была даяркай. Праца гэтая цяжкая, асабліва ўлетку. З першымі пеўнямі трэба ўстаць, ісці на ферму даіць кароў. Потым у самую спёку пацягнецца ў поле на абедзенную дойку, а вечарам будзе чакаць, пакуль пастухі прыгоняць статак. І толькі з цёмным яна вернецца дамоў. А дома ж — свая гаспадарка, муж і двое дзетак...

Калгас, дзе працавала Ганна, быў з адсталых. Зарплату плацілі са спазненнем на тры месяцы, дый што за грошы — слёзы! Ад такога жыцця некаторыя вясковыя кабеты прызвычаіліся да гарэлкі, апраўдваючыся:

— Мужыкі п’юць, будзем і мы... У нас — раўнапраўе!

Ганна — не выключэнне. Канешне, яна — не п’яніца. Проста пасля чаркі-другой некуды знікалі стомленасць, клопаты — хацелася адно смяяцца ды спяваць. Даяркі зацягвалі песню... Гэта было адзіным «культурна-масавым мерапрыемствам» у іх шэрай будзёншчыне.

Праўда, грошай на пляшку не заўсёды хапала. Ды кемлівыя даяркі знайшлі выйсце. Нездарма ж кажуць: дзе чорт сам не зробіць, туды бабу пашле. На вячэрнюю дойку кожная жанчына брала з сабой па дзве пластмасавыя пляшкі з-пад мінералкі, напаўняла іх сырадоем. Потым пляшкі гэтыя хавалі за пазуху і неслі дахаты. Малако прадавалі, а грошы — на выпіўку. Але да пары збан ваду носіць...

Неяк надвячоркам вярталася Ганна з фермы. Сяброўкі пайшлі раней, а яна затрымалася. Каб скараціць шлях, папраставала полем. Грудзі прыемна сябе адчувалі пад двухлітровымі пляшкамі з цёплым сырадоем.

Нечакана Ганна ўбачыла, як нейкая машына кіруецца проста на яе. Хацела пабегчы, але пазнала старшынёўскі «газік»... Уцякаць было позна. Машына спынілася. Старшыня, Васіль Лявонавіч, на сваёй пасадзе яшчэ і года не працуе. Вядома ж, прыглядваецца да людзей, а людзі — да яго. Адны кажуць, нібыта ён справядлівы й сумленны, іншым — не падабалася ягоная патрабавальнасць.

— Добры вечар, Ганна, — сказаў Васіль Лявонавіч, набліжаючыся.

«Бач, запомніў маё імя...» — падумала Ганна і адказала:

— Добры вечар, Лявонавіч!

— Ганулька, я даўно хацеў табе сказаць, што ты мне надта падабаешся, — неяк няўцямна прамармытаў старшыня і — што гэта з ім? — абняў яе за плечы.

— Ды няўжо закахаўся?.. — Ганна не ведала, што ёй рабіць: за такім чалавекам яна пабегла б на край свету!

А Васіль Лявонавіч тым часам усё мацней прыціскаў яе да машыны, яго правая рука пацягнулася да грудзей...

У Ганны ажно перахапіла дыханне, стала соладка на душы, але і страшна было, нібы ў час першага спаткання. Не, Ганна пра малако і не думала, але нечакана адчула, як нечага ўзмакрэлі грудзі — пацякло па жываце і нагах. «Малако!.. Пэўна, корак сарваўся, недавінціла — спяшалася!» — здагадалася яна.

Старшыня, калі адчуў пад рукой гэту яе макрэдзь, нечага раптам адскочыў убок, выхапіў з кішэні ліхтарык і асвяціў Ганну... Пасля стаў рагатаць.

— Вой, Ганулька! Дык табе ж і карова не трэба — сама малако даеш...

Потым сеў у машыну і паехаў, пакінуўшы даярку на голым прыдарожным узлобку.

З таго часу, сустракаючы Ганну, Васіль Лявонавіч адно пасміхваўся. І тая ад гэтых яго «заляцанняў» густа чырванела — акурат першакласніца.

# ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ

Дырэктар школы Ніна Андрэеўна акінула педагогаў усхвалявана-ўзнёслым позіркам і рашуча пачала:

— Калегі, я сабрала вас для сур'ёзнай размовы. У святле патрабаванняў рэформы школы, — Ніна Андрэеўна паказала пальцам на столь, — зверху пастаўлена задача: навучыцца дадаткова зарабляць грошы... Якія будуць прапановы?

— Давайце шукаць спонсараў і багатых бацькоў нашых вучняў, — пачуўся голас.

— Усе спонсары ўжо даўно прыбраны да рук, — сказала Ніна Андрэеўна. — У нас ёсць адзін. Праўда, вы ведаеце, што гэта за тыпус. Колькі ён папсаваў усім нерваў. Але ж даводзіцца трываць... А наконт прапановы адносна пошуку багатых бацькоў вучняў я згодна. Ёсць у нас свае карэйкі. Праўда, трэба з імі вучыцца працаваць. Так бы мовіць, псіхалагічна адчуваць, тонка разумець іх захады, намеры, пажаданні. Так, бацька Дабраломава ўчора мне сказаў: «Я падкінуў «капусты», але ж у майго Пецькі па матэматыцы двойка». Таму я ў вас, Марыя Сцяпанаўна, пытаю: чаму ў яго двойка?

— Ён шасцікласнік, — тут жа знайшлася настаўніца, — а табліцу множання да гэтага часу не засвоіў. А на мае заўвагі кажа, што калі ёсць калькулятар, камп'ютэр, то не трэба ведаць аніякіх табліц, і што яго бацька зарабіў свае мільёны без усялякай матэматыкі... Ці ж не нахабства гэта?!.

— Супыніцеся, Марыя Сцяпанаўна, але адзнаку яму выпраўце. Для дзяцей шчодрых бацькоў павінны быць выключэнні. — І рашуча-загадным тонам: — Дык вось, задача першая: усім класным кіраўнікам выявіць багатых бацькоў і правесці з імі адпаведную работу. Толькі працаваць трэба на агульную справу... Мне стала вядома, што Зінаіда Мікалаеўна нядаўна так «дастала» сваіх выхаванцаў скаргамі на дрэнны тэлефонны апарат, што яны вымушаны былі скінуцца і падарыць ёй апарат з вызначальнікам нумароў... За трыццаць даляраў купілі. Каб я ніколі больш не чула пра такія прэзенты!

— Можна школьную сталовую вечарамі ператвараць у кавярню і нават адпускаць яе пад вяселлі!.. — падаў прапанову настаўнік працоўнага навучання.

— Памаўчалі б лепш, Васіль Ігнатавіч, — зрэзала яго дырэктар. — Вы й так майстэрню са сваімі сяброўкамі ператварылі ў бар. Мала таго, што распіваеце моцныя напоі, дык яшчэ цыгарэты ў вучняў «страляеце».

— Дык у іх, ведаеце, такія цыгарэты, якія мне не па кішэні, — пачаў апраўдвацца настаўнік. — Да таго ж — яны самі прапануюць...

— Вам, Васіль Ігнатавіч, канкрэтнае заданне: арганізаваць у самы бліжэйшы час вучнёўскую брыгаду і наладзіць выпуск нескладаных сталярных вырабаў. І неківайце галавой. На свае халтуры майстэрню выкарыстоўваеце. Папрацуйце і для школы.

— Я магу, — падаў голас фізрук, — арганізаваць платныя курсы па шэйпінгу.

— Ах, Ігар Іванавіч!.. — іранічна выгукнула дырэктар. — Займайцеся гэтым самым шэйпінгам са сваёй жонкай. Дзяўчаты-вучаніцы старэйшых класаў нядаўна скардзіліся, што на ўроках гімнастыкі вы падтрымліваеце іх... Яшчэ адна скарга — і будзеце весці толькі групу хлопчыкаў.

— Ну, саслізнула рука разы са два, дык ужо адразу і скардзіцца, — прабурчаў фізрук, які прызнаваўся ў каханні добрай палове жаночага калектыву.

— Давайце, — прагучала прапанова, — наладзім платныя паслугі па рэпетытарству.

— Многія з вас і так займаюцца гэтай справай. Мала таго, што без усялякіх там ліцэнзій, дык яшчэ і вучням кажаце, што без дадатковых заняткаў добрай адзнакі ім не бачыць. А не ў кожнай сям'і ёсць

магчымасць па два даляры за ўрок выкладваць. У нас ёсць гадзіны на дадатковыя заняткі — выкарыстоўвайце іх па прызначэнні.

— За школьным дваром закінутае бомбасховішча... — падала голас настаўніца біялогіі. — Можа, у ім грыбы пачаць вырошчваць на продаж?

— Можна падумаць... Што ж, сябры, — падвяла рысу Ніна Андрэеўна. — Я не бачу цяжкасцяў... Вы — людзі ініцыятыўныя. Дык — за справу!

* * *

Ці трэба цалаваць жонку на развітанне, калі жонка чужая?

Ці трэба дарыць жанчыне кветкі, калі яны сарваныя ў яе ж кветніку?

Ці трэба жадаць жонцы добрай ночы, калі вы з'явіліся дамоў апоўначы?

Ці трэба лічыць сябе продкам Ганібала, калі жонка з раддому вярнулася з негрыцёнкам?

Ці можна стварыць зямны рай з жанчынай, калі яе ўжо выгналі з нябеснага?

— Які спосаб лепшы для заваявання сэрца жанчыны: «бабе – кветкі, дзецям — марожанае», альбо: «мужу — бутэльку, жанчыне — футра»?

* * *

Жанчына страляе спачатку па нашым сэрцы, а потым — па нашаму кашальку.

Разумныя дзяўчаты вывучаюць псіхалогію, філасофію, маркетынг, а прыгожым дастаткова ведання «Камасутры».

Колькасць накладзенай касметыкі прапарцыянальна ўзросту.

Жыццё на пенсію — лепшы сродак ад залішняй вагі; або: жыццё на пенсію — лепшы суперпаглынальнік тлушчу.

## Музычны раман

Чувак быў такі клёвы, проста мажор! Я закахалася ў яго ў тэмпе прэста. Мы зблізіліся бліжэй, чым на паўтона. Гэта быў поўны экстаз са шматразовай рэпрызай. Але хутка ён сказаў, што гэта — кода... І знік у невядомым накірунку.

Цяпер я хаджу з бемолем, і настрой у мяне — поўная лакрымоза.

* * *

Трамбон з гонарам казаў:

— У нас, трамбонаў, голас самы важкі, з намі не паспрачаешся, бо ўтраіх мы перакрычым увесь сімфанічны аркестр.

## Загады па сімфанічным аркестру:

«У сувязі з попытам на каляровыя металы — самай каштоўнай групай сімфанічнага аркестра лічыць медную».

«З улікам павышанай пажарнай бяспекі групе драўляных музычных інструментаў прайсці інструктаж у пажарніка».

«У сувязі са шматразовымі скаргамі суседзяў — барабаншчыку Іванову выдзеліць кватэру з павышанай гукаізаляцыяй».

«У сувязі з тым, што спірт для праціранння музычных інструментаў выкарыстоўваецца не па прызначэнню, замяніць яго тармазной вадкасцю».

«Савет аркестра разгледзеў заяву трубача Пятрова аб тым, што да яго пастаянна з'яўляюцца белыя коні. Пастанавілі: «Даплачваць Пятрову паўстаўкі конюха».

«Для павышэння ўзроўня жыцця групу струнных інструментаў уладкаваць на падзаробак у ЗАГС, групу медных — у пахавальнае бюро, а групу ударных — адправіць на лесасеку».

* * *

— Маэстра, чаму ваша музыка гучыць так пасучаснаму?

— Вельмі проста... Я пішу традыцыйную гармонію, а дысанансы мне стварае наш аркестр.

* * *

— Шліберзон, колькі разоў можна казаць: у гэтым такце трэба іграць сі бемоль!

— А я затое не выпіваю, як некаторыя!

## Навагодні соннік

Калі вам прысніцца зялёная елачка і твар амерыканскага прэзідэнта — быць вам у Новым годзе з далярамі.

Калі вам прысніцца, што з коміна з'яўляецца негр з навагоднімі падарункамі, — пара чысціць комін.

Калі вам пастаянна сняцца белыя змеі — самы час ісці на прыём да Сайкова.

Калі вам прысніцца жонка ў выглядзе Снягурачкі — чакайце патрабавання новай футры.

Аб'явы на слупах

Мяняю трохпакаёвую кватэру з суседам-скрыпачом на аднапакаёвую з павышанай гукаізаляцыяй.

У сувязі з пераездам у меншую кватэру — мяняю кантрабас на скрыпку.

## Анекдоты

Пачатак канцэрта. Спазняецца літаўршчык. Дырыжор у роспачы. Ён падбягае да пажарніка і кажа:

— Васіль, стаўлю бутэльку, толькі выручы! Табе трэба будзе ў самым фінале сімфоніі ўдарыць у літаўры. Я пакажу, калі трэба — узмахну дырыжорскай палачкай!

— Міхалыч, будзе зроблена!

Набліжаецца фінал сімфоніі. Дырыжор глядзіць на пажарніка і ўзмахвае палачкай.

– Будзе зроблена, Міхалыч!

Бах!!!

## Не пашанцавала

— Васіль, ну як рыбалка?

— А, брат, і не пытайся. Пакуль ехалі з сябрамі, добра выпілі. Потым — доўга круцілі лункі. Потым прыйшоў нейкі дзед і сказаў, што возера лявей, а тут ён жыта пасеяў. Пайшлі налева. З гора выпілі. А потым — сцямнела. Вярнуліся дамоў.

## КАБ ЧАЛАВЕК РАЗУМЕЎ...

Несумненна, што адным з асноўных крытэрыяў вартасці мастацкага твора (альбо зборніка твораў) з'яўляецца тое, наколькі ён цікавы для чытача, наколькі зможа прывабіць яго ўвагу, выклікаць самым непасрэдным чынам яго суперажыванне.

Знаёмячыся са зборнікам прозы Аляксандра Вашчанкі «Свечка на дажджы», я не-не ды лавіў сябе на ўражанні: цікава! Зборнік даволі разнастайны ў жанравых і тэматычных адносінах. Ён адкрываецца апавяданнем «Мартын і Тэра», якое можа па праву прэтэндаваць на статус шматзначнай, глыбокай па змесце прыпавесці. Ён, зборнік, працягваецца ці не аўтабіяграфічным, прысвечаным роднай маці творам «Звычайны зімовы дзень». Ён утрымлівае своеасаблівае дакументальнае эсэ «Дрэвы помняць». Ён плаўна пераходзіць далей у аповеды — эцюды, аповедызамалёўкі, прысвечаныя гэтай самай дзівоснай краіне, родам з якой мы ўсе, з якой мы ўсе выйшлі, імя якой — Дзяцінства («Коршак», «Грышка», «Смерць сястрычкі», «Летні дзень у краіне дзяцінства»). Другі яго раздзел складаюць жартаўлівыя творы, інакш — гумарэскі, гумарыстычныя мініяцюры («Пасвячэнне ў паляўнічыя», «Ланцэпуп», «Дзедава ласка», «Бедны Пушкін»). Але што б ні ўяўляў сабой, паводле свайго зместу і жанру, той ці іншы твор кнігі, ён, паўтараю, чытаецца з цікавасцю, не пакідае мяне, чытача, абыякавым. У чым тут сакрэт?

Сакрэт, на маю думку, у наступным. Найперш — у назіральнасці й жыццёвай мудрасці аўтара. «Апранацца старому чалавеку складана — акурат як і малому», — чытаем у апавяданні «Звычайны зімовы дзень». Чытаем і ахвотна пагаджаемся: так яно і ёсць сапраўды. Апісваючы надыход летняга ранку, празаік між іншым заўважае: «Нават дзесьці яшчэ цёгкаў салавей, забыўшыся, што ноч ужо прайшла». Заўважана з добразычлівай усмешкай і з чуйнасцю дасведчанага фенолага. Ці нават арнітолага. Альбо яшчэ такое, падобнае на папярэдняе назіранне: «Як прыемна тады перад урокамі пасядзець колькі хвілін на сонейку, слухаючы спеў шпака, які толькі што прыляцеў з далёкіх краёў і, не паспеўшы перайсці на родную мову, спявае па-іншаземнаму».

Як тут не ўсміхнуцца разам з аўтарам, не ацаніць па вартасці такое яго ўспрыняцце веснавой прыроды, спеваў птушкі, што толькі вярнулася з выраю. А вось трапна падмечаная сцэнка з жыцця пажылых вясковых людзей, якія апынуліся ў экстрэмальнай сітуацыі: «Бабулькі плакалі, дзяды пахмурна смалілі самасад, але што зробіш…»

З назіральнасцю, з абвостраным адчуваннем свету прыроды й людскога жыцця звязаная, натуральна, і адметнасць выяўленчых сродкаў А. Вашчанкі, у прыватнасці, параўнанняў, тропаў. У ягоных апавяданнях шыферны дах узлятае над поплавам, «нібы вялізны паветраны змей», «зямля на месцы лужын парэпаная, нібы бабуліны далоні», «дрэвы стаяць задумёныя ў чаканні хуткай зімы»,

а «пчолы са злосным гудам носяцца наўкола, нібы пікіруючыя «Юнкерсы» і г. д.

Пэўна, сэрцавіну збоніка «Свечка на дажджы» складаюць апавяданні, галоўнымі дзейнымі асобамі якіх з'яўляюцца дзеці. І ў дадзеным выпадку назіральнасць арганічна спалучаецца з добрым веданнем псіхалогіі маленькага чалавека, з разуменнем логікі яго паводзін. І яшчэ — з адпаведным маральна-этычным і педагагічным тактам. Што і не дзіўна, бо А. Вашчанка, як я ведаю, па прафесіі настаўнік, выкладчык музыкі ў сярэдняй школе.

Сказанае вышэй тычыцца ў пэўнай ступені й таго раздзела зборніка, які складаецца з гумарэсак, жартаўлівых жыццёвых гісторый. Тут таксама выяўляецца адметная назіральнасць аўтара (на гэты раз сацыяльнага плану), яго здольнасць заўважыць і паказаць сродкамі жывога мастацкага слова характэрныя з'явы нашага сённяшняга грамадскага жыцця, праблемы так званага пераходнага перыяду.

У згаданым напачатку аповедзе-прыпавесці «Мартын і Тэра» аўтар слушна зазначае: «Боль і гора аднолькавыя для любой істоты. І пакуль чалавек гэтага не зразумее, ён не будзе жыць у поўнай гармоніі з прыродай». І я мяркую, што кніга А. Вашчанкі будзе вучыць гэтаму самаму, так неабходнаму нам разуменню, чытача — як, дарэчы, дарослага, так і юнага.

*Анатоль Вярцінскі*

# *Змест*

## *Апаведы*


МАРТЫН І ТЭРА ........................................ 5
ЗВЫЧАЙНЫ ЗІМОВЫ ДЗЕНЬ ................................ 13
КОРШАК ............................................... 28
ТЫСЯЧА ПЕРШЫ СПОСАБ ЛОЎЛІ ШЧУПАКОЎ ..................... 41
ГРЫШКА ............................................... 46
СМЕРЦЬ СЯСТРЫЧКІ ..................................... 53
ЛЕТНІ ДЗЕНЬ У КРАІНЕ ДЗЯЦІНСТВА ...................... 58


## *Эсэ*


ДРЭВЫ ПОМНЯЦЬ ........................................ 64
МАДРЫД ............................................... 68
САД .................................................. 74
КУРГАНЫ .............................................. 82
АБ ЧЫМ ШУМІЦЬ СНЕЖАНЬСКІ ЛЕС? ......................... 82
СТАРЫЯ ХАТЫ .......................................... 86


## *Гумарэскі*


ПАЛЯВАННЕ НА КАЧАК ................................... 90
ПАСВЯЧЭННЕ Ў ПАЛЯЎНІЧЫЯ .............................. 92
КАЛЯДНАЯ ПРЫГОДА ..................................... 95
ПЧАЛЯРСКАЯ НАВУКА .................................... 97
ШТУКАРСТВЫ ДЗЕДА МАРОЗА .............................. 100
ПАДАРУНКІ ДА ЖАНОЧАГА СВЯТА .......................... 104
ЛАНЦЭПУП ............................................. 107
БЕДНЫ ПУШКІН ......................................... 110
АДВУЧЫЎ... ........................................... 112
ДЗЕДАВА ЛАСКА ........................................ 115

ПСІХАЛОГІЯ ПАДВЯЛА ........ 120
ЯК ПАКІНУЦЬ СЛЕД НА ЗЯМЛІ? ........ 126
НЯЎДАЛАЕ СПАТКАННЕ ........ 130
АРХІДЭЯ ........ 136
«ШЧАСЛІВЫ» НЕДАКУРАК ........ 140
ЗМЯІНЫЯ ЗДЗЕКІ ........ 143
НЕШЧАСЛІВАЕ ПРАДКАЗАННЕ ........ 145
МАЛОЧНЫ РУЧАЙ ........ 147
ІНІЦЫЯТЫЎНЫЯ ........ 150

## *Пытанні этыкету*

* * * Ці трэба цалаваць жонку на развітанне... ........ 154
* * * Жанчына страляе спачатку... ........ 154
МУЗЫЧНЫ РАМАН ........ 155
* * * Трамбон з гонарам казаў... ........ 155
ЗАГАДЫ ПА СІМФАНІЧНЫМ АРКЕСТРУ: ........ 155
* * * — Маэстра... ........ 156
* * * — Шліберзон, колькі разоў можна казаць... ........ 157
НАВАГОДНІ СОННІК ........ 157
АНЕКДОТЫ ........ 158
НЕ ПАШАНЦАВАЛА ........ 158
КАБ ЧАЛАВЕК РАЗУМЕЎ ........ 159

## *Пасляслоўе*

Анатоль Вярцінскі
КАБ ЧАЛАВЕК РАЗУМЕЎ...

***Аўтар выказвае ўдзячнасць дырэктару унітарнага прыдпрыемства «Міёры» ВАЗМІЦЕЛЮ Генадзю Гаўрылавічу за дапамогу ў выданні гэтай кнігі.***

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Вашчанка Аляксандр Пятровіч

Свечка на дажджы

Кніга прозы

Адказны за выпуск *А. Аношка*

Рэдактар *А. Масарэнка*
Карэктар *Н. Ражкова*
Кампютэрны набор і вёрстка *Д. Андрэеў*
Вокладка *А. Камоцкі*
Фотаздымкі аўтара